БЕЛАРУСКА

Марта Піньска

SHOUT
SHARE
IT

Annotation

Скандальная і таямнічая аповесьць, якая ўскалыхнула літаратурны і культурны сьвет на пачатаку 2000-х гадоў. Выдадзеная ў перакладзе на беларускую мову ў беластоцкім “Czasopisie” – аповесьць спарадзіла цэлую хвалю крытыкі, мітаў і выклікала бурную дыскусію. Аповесць дзяўчыны, якая патрапіўшы ў Менск, апісвае прыватнае жыцьцё, не хаваючы падрабязнасьцяў за сарамлівым фігавым лістком, але пры гэтым і спрабуе паказаць жыцьцё “багемнага” Менску, без заслоны і купюраў. Хто аўтар аповесьці, ці тая Марта Піньска існуе насамрэч, хто хаваецца пад перакладчыкам “дзядзькам Васілём”, ці аповесьць – “парнаграфічная чарнуха”, ня вартая дайсьці да чытача - на ўсе гэтыя пытаньні спрабавала знайсьці адказ творчая эліта Беларусі пасьля публікацыі.

- Марта Піньска
- I
- II
- III
- IV
- V
- VI
- VII
- VIII
- IX
- X
- XI
- XII
- XIII
- XIV
- XV
- XVI
- XVII
- XVIII
- XIX
- XX
- XXI
- XXII
- XXIII
- XXIV
- XXV
- XXVI

- XXVII
- XXVIII
- XXIX
- XXX
- XXXI
- XXXII
- XXXIII
- XXXIV
- XXXV
- XXXVI
- XXXVII
- XXXVIII
- XXXIX
- XL
- Епілог

Марта Піньска
Беларуска

Пераклаў з польскамоўнага рукапісу Дзядзька Васіль
Графічны праект і выдавецкае афармленне Юрка Хмялеўскі
На вокладцы: Марочкін, Купальскія дзяўчаты, акрыль, акварэль, 151x79 см, 1999 г.

© Copyright by Villa Sokrates
Выдавец: Villa Sokrates Krynki (Польшча)
E-mail: villa.sokrates@free.art.pl
Друк: OFFSET PRINT Беласток

Менск-Кракаў, 2001-2002

I

Люблю заходзіць у гэтую піццэрыю ў цэнтры Менска. «Patio Pizza» - гэта трошкі атмасферы вялікага горада і адчування, што ты пусціў карэнне ў заходні стыль: абед - хуценькая, подбегам, перакуска ў самым цэнтры вірлівага жыцця. Сяджу каля вялікага акна ў памяшканні і разам з тым на праспекце Скарыны сярод людской куламесы, што чакае бітком набітага тралейбуса. Салон піццэрыі ахінае непаўторная атмасфера *тусоўкі.*

Ёмістая неўабхват, высокая афіцыянтка з разложыстымі клубамі калышацца над мною, прымаючы заказ. Яе меланхалічны выгляд яшчэ да нядаўняга даводзіў мяне ледзь не да шалу. Але я ўжо тут цэлы год і цяпер, бадай што, лепей разумею ў яе вачах тутэйшую невымоўную тугу па нечым неакрэсленым. Такі стыль жыцця. Нічога акрамя. Аніякай табе філасофіі.

Каля стойкі бара нейкі фраер пацягвае сок. Такім спосабам прабаўляе цалюткі божы дзень. Гаворыць па сотавіку, а сам абсмаквае мяне павабна-юрлівымі вачыма. Але прыкметны недахоп эрэкцыі ў яго вачах знеахвочвае мяне да далейшай забавы ў рэстаранны флірт. Не магу адгадаць, чым жа ён так пераймаецца. Можа, на службе ў КДБ і цяпер проста фіксуе, што робяць, што гавораць людзі. Па-свойму гэта павінна быць багатая інстытуцыя, калі мае на ўтрыманні такіх віжоў. А, можа, валютчык і праварочвае па тэлефоне вялікія партыі далараў. Аднаго разу нават падумала была, а ці не зладзіў ён тут легальную яўку сваёй агентуры, бо час ад часу да яго клеіліся раздэкальтаваныя паненкі ў кароткіх уабліпку спаднічках. Але будзь яно так, ён мусіў бы не-не ды пастаўляць іх і кліентам. А ён з дзяўчатамі толькі балбоча ды фамільярна агладжвае іх па плечыках і каленцах. Спрабую зноў расшыфраваць асноўны змест заняткаў гэтага шустрыка...

Тут я першы раз убачыла яе. Яна ўвайшла ў піццэрыю, уся ў скуры, проста з матацыкла. Следам невысокенькі італьянчык з цёмным загарэлым тварам. Мне адразу кінулася ў вочы яе спакойная, гарманічная ўсмешка. Што рэдкасць у гэтай краіне. Людзі тут наогул не ўсміхаюцца, а ў дзяўчат ва ўсмешцы хутчэй нешта ад вагінальнай адкрытасці, чым простай зычлівасці да свету.

А ў ёй я адразу змеціла гармонію і шчырасць. Нават не здзівілася, што такое бывае ў гэтым свеце.

Яна прайшла са сваім італьянцам праз увесь доўгі салон і

села ў канцы каля акна, так што я магла бачыць яе твар і гуллівыя вочы. Не ведаю, чым я звярнула на сябе яе ўвагу, але ж некалькі разоў нашыя вочы сустрэліся ў ацэначнай прыглядцы.

Я спрабавала зразумець цягу беларускіх дзяўчат да італьянцаў, у гэтай халоднай краіне, поўнай тугі па яркім і бесшабашным свеце поўдня. Як лёгка даецца назваць усё гэта прагай да грошай і люксу. А тым часам той італьянскі свет, што прыбіваецца да менскага берагу, гэта нейкая маргінальнасць, каб не сказаць - шумавінне вялікага бізнесу. Няма ладу які там такі вялікі свет, а проста дробныя гандляры, адмывальнікі мафіёзных барышоў, распанелыя ў чэраве падстаркі-паклоннікі славянскай красы.

Неяк я прачытала была ў тутэйшай газеце гісторыйку адной маладзенькай дзяўчыны і італьянца з Вероны. Было тое ў часы вайны, і хай сабе кажуць, што фашысты звозілі на тэрыторыю Беларусі італьянскіх вязьняў на прымусовую нявольніцкую працу, сёння я не так ужо і ўпэўненая ў гэтым. У 1943-м ці тое ў 1944-м годзе на абутковай фабрыцы, сёння гэта вядомы «Луч», працавалі італьянцы. Адзін з іх малады веронец Анжэла Ковач надыбаў тут семнаццацігадовую Аду Наркевіч. Злюбіліся. Сустракаліся яны ў мілосным замроенні і, хай не ведалі родных моваў адно аднаго, а от жа целы іхнія паразумеліся дасканала і без слоў.

Некалькі гадоў пасля вайны Ада думала, што Анжэла падзяліў лёс многіх сваіх землякоў, целы якіх паўкідалі ў глыбокія равы ў розных лясах і пералесках Беларусі. І раптам неспадзявана атрымала ліст, якога нікому не паказала і не пераклала, баючыся расшалелай цэнзуры і падазрэнняў ў небяспечных кантактах з Захадам. Праз паўстагоддзя нехта пераклаў ёй тэкст ліста. Яна ўжо была пры смерці, але паспела даведацца, што Анжэла пачуваецца добра, сумуе па ёй, хацеў бы, каб прыехала да яго. Апісвае фірму вопраткі, якая вельмі добра раскручваецца, і ўпраўляе ён ёю разам з бацькам, маці і сястрою. Можа, акурат цяпер Анжэлаў зяць шукае рынкаў збыту ў Маскве і плануе закласці швальню ў Менску, Горадні ці ў Берасці, ведаючы, што ў Беларусі ладныя і працавітыя дзяўчаты, гатовыя шыць кашулі багатым рымлянам і міланцам.

Італьянцы яшчэ і з іншай прычыны сталіся бывальцамі ў гэтым рэгіёне Эўропы. Гэта ж бо іхнія дойліды будавалі тут палацы Радзівілам і Сапегам, іх інжынеры і майстры прымалі запрашэнні на будаўніцтва ці аздабленне шмат якіх касцёлаў. Ну і, вядома, тутэйшыя дзяўчаты - ясныя, вабныя, усмешлівыя, з нейкай інтрыгай славянскай міладушнасці ў сабе. Ці адзін з іх мусіў уцякаць ад раз'юшанай сварлівай жонкі ў спакойныя абдымкі цярпліва-трывалай беларусачкі...

Калі афіцыянтка прыносіць маю піццу, я адрываю вочы ад развіраванага натоўпу каля аўтобуса і гляджу на яе, гэтую цікавую дзяўчыну ў канцы залы, каля якое сядзіць брунет і, жвава размахваючы рукамі, спрабуе ёй нешта давесці. Яна пасміхнулася мне. Я адразу адузаемнілася эычлівым позіркам і праз нейкі момант мне ўжо здавалася, быццм і я і яна з адценнем іроніі паглядаем на выхілясы яе няўрымслівага заляцанца.

II

Нечакана мы спаткаліся зноў у суботу на картынгавым полі, дзе менская моладзь бавіць дапалуднёвы час у спартыўных заездах. Прывёз мяне туды Вова, даўні, яшчэ з савецкіх часоў хіпі, на рахунку якога адсідка ў сярэдзіне васьмідзесятых за дармаедства. Аўтар мяцежніцкіх вершаў, але больш вядомы тут як гаспадар «Harley Davidson'a». Адзін з нямногіх у Беларусі «жалезных братоў», які ў гэтыя цяжкія часіны яшчэ мае сілу разбэшчваць моладзь занадта і залішне, як на саракагадовага, шпаркай і шумнай яздой.

Вова паказвае мне свет менскай залатой моладзі, разбагацелых тарбахватаў і беларускіх нуварышаў. Усім падавай нестандартныя машыны, нестандартную хуткасць, грукат і смурод выхлапных газаў.

За гэтым светам стаіць патрэба волі і вольніцы. Неацуглянай і неабмежаванай.

Нямала мужчын прыходзіць толькі дзеля таго, каб не страціць кантактаў з калегамі. Іншыя - павыстаўляцца з новымі бабамі. А яшчэ - каб папасвіцца сярод дзяўчат, што наведваюцца сюды, а тое і закадрыць каторую. Альбо проста пазнаёміцца з кім-небудзь талковым ды пракінуцца з ім увечары на дыскатэку.

Трапляюцца і такія, што прыходзяць з жонкамі, але, напэўна ж, каб паказаць ім, што іх свет не замыкаецца ў чатырох сценах сужэнскіх мусовасцяў.

Вова расказвае мне, што большасць яго калегаў - тут на картынгу, гэтым своеасаблівым аўкцыёне новых аўтамабіляў, новых цёлак, прыкідаў. Але сам ён гэтым грэбуе. Прыязджаюць, каб сваёй штучнай і пластыкавай душою прыляпіцца да сапраўднага свету.

Махнуў рукою ўбок дзяўчыны каля матора - гэта адна з такіх дзельных баб у гэтым горадзе. Уяві сабе, заснавала з яшчэ некалькімі маетніцамі матацыклаў і скутэраў клуб «жалезных сёстраў». У піку хлопцам надзелі скураныя курткі, пакуплялі матацыклы і з вясны да канца лета аб'язджаюць усёй грамадай цэнтр горада альбо кавалькадай шыбуюць у Горадню, Берасце ці Наваполацак. Там сустракаюцца з намі. Бывае, вітаем і адпраўляем праезджых байкераў на Маскву альбо Парыж. Апошнім часам быў тут у нас Анджэй з Варшавы, валацуга і вырвас, які гадоў наццаць правёў у Штатах і мае на рахунку вялікія жалезныя выправы вакол свету.

Прыгадваю, аднаго разу ўлетку я бачыла кавалькаду

матацыклаў і адчула, як ад іх павеяла свабодай. Але ў Менску кіроўцы растуркатаных машын не прымаюць на сур'ёзе матацыклістаў ці веласіпедыстаў. Тут небяспечна. Можа, рыхтык дзеля таго і ездзяць. Насуперак.

Вова падыходзіць да матацыкласткі, падштурхоўваючы мяне бліжэй, каб я пазнаёмілася з ёю. Яна разгінаецца ад мшыны, паварочваецца, і ў сонечным бляску асфальтавай пляцоўкі ўсю мяне аблівае знаёмая цёплая ўсмешка.

III

Я і не думала, што праз некалькі дзён мы зноў сустрэнемся на канцэрце. Убачыла яе ў тым самым скураным строі, як яна стаяла сярод гітарыстаў нейкага гурту ў антракце і весела размаўляла.

Пасля канцэрта мы пілі кепскае беларускае піва ў буфеце Дома афіцэраў. Дом афіцэраў. Гучыць у тон усім гэтым назвам вуліц: Рэвалюцыйная, Камуністычная, Пралетарская... альбо - па імёнах нейкіх савецкіх герояў, што ні пра што мне не гавораць: Харужая, Мяснікоў, Прытыцкі... Парадокс, бо людзі, ходзячы па вуліцы Камуністычнай не маюць нічога агульнага з камунізмам. Разам з уласнікам дарагой забягалаўкі, які, пэўна, штораніцы ачухваецца ад кашмарных сноў, у якіх у яго адбіраюць усё набытае ім за апошнія некалькі гадоў.

У Доме афіцэраў хлопцы з NRM ці групы «Новае неба» спяваюць пра нягеглага дырэктара калгаса, у якога на стале ў кабінеце стаіць глобус і які ў хвіліны дэпрэсіі пасля праваленай уборачнай, пішучы чарговую просьбу міністру пра датацыю, суцяшаецца, паглядаючы на вялікі Савецкі Саюз, які дазарэзу трэба неадкладна ўваскрэсіць, і тады адразу папруць угору ўраджаі, надоі і палепшыцца жытка.

Кася Камоцкая спявае пра двух польскіх шпіёнаў Болека і Лёлека, а Віктар Шалкевіч пра хамскую ўладу, якая надзела шляхецкі кунтуш, а ў самое з ботаў салома лезе.

Моладзь перад эстрадай бушуе, махаючы нацыянальнымі сцягамі памерам з насоўку альбо запальнічкамі, як тое ў нас гадоў дзесяць таму назад на канцэртах «Пэрфэкту» ці «Рэспублікі». Пры гэтым падымаюць пальцы ў форме літары V і ягляць «Жыве Беларусь!».

Рэспубліка Мары ў беларускім выданні гэта - Народная Рэспубліка Мроя (NRM) - даслоўна. Але калі я гляджу на хлопцаў, якія па завязкі ўпіваюцца ў буфеце, - не пакідае мяне аптымізм.

Некалькі месяцаў таму назад знаёмыя падарылі мне білеты на канцэрт расейскай групы «Машина времени». Паў-Менска збеглася паслухаць «дыназаўраў». Не натхніла мяне тое ані. Расейскі блюз з тэкстамі, як у песеньках Анджэя і Элізы ці групы «Pod budą». Вечна нейкі пункцік і паэтычны вобраз краю поўны залішне меланхалічнага спакою. Мае знаёмыя патлумачылі мне, што гэтая музыка на пераломе сямідзесятых-васьмідзесятых была глыткам свежага паветра. Ну, так - трохі ў гэтым Боба Дылана, прызнаю. Але каб аж заходзіцца ад захаплення... Не спрамаглася пераканаць сябе. Толькі адно абудзіла ўва мне сімпатыю, - што

сціжма моладзі пад сцэнай паводзіцца чыста, як у нас.

Іншая рэч, што ніякай у тым палітыкі. Хоць... усё-такі нейкая там дэманстрацыя антысавецкай поп-культуры.

Тут, калі граюць беларускія капэлы, няшмат моладзі, але затое больш дынамікі і маніфестацыйнасці.

Пасля канцэрта я стала непадалёк ад яе ў бары і, калі б не музыка групы, якая ахвяравала нам дзве касэты, можа, ніколі не дайшло б да гутаркі. Завялася яна сама. Нібыта мы ўжо знаёмыя каторы там месяц. Яна адразу адгадала, што я з Польшчы. Расказала мне пра NRM як пра бунт маладзейшага пакалення Беларусі супроць расейскай поп-культуры, супроць бальшавіцкіх схемаў у будным жыцці, супроць недалужнасці. У іхніх песеньках на канцэрце я не магла ўлавіць і зразумець паасобных слоў, бо гвалт стаяў неверагодны. І ад музыкаў, і ад публікі. Таму я рашыла купіць касэту і спакойна праслухаць усё дома. Мы развіталіся, і я пабегла да знаёмых. На хвіліну яна знікла ў тлумішчы каля выхаду. Але тут жа вынырнула зноў і падскочыла, трымаючы адной рукой на калене вялікую скураную сумку, другою нешта спехам напісала. Мы падалі адна адной руку, прадставіліся па імёнах. Яна сунула мне на маленькай жоўтай картачцы свой нумар тэлефона. Трэба будзе неяк сустрэцца ды пагаманіць.

IV

Я патэлефанавала праз некалькі дзён. Размова як з даўняй знаёмай. Яна папрасіла зайсці да яе на кватэру ў цэнтры. Падала дакладны адрас і код да дзвярэй у пад'ездзе. Гэта як выдача сакрэту ці доказ даверу. Дамафоны ж у гэтым горадзе кепска альбо ўвогуле не працуюць.

Я прыйшла таго самага вечара, прыхапіўшы ў прэзент бутэльку чырвонага віна і некалькі дыскаў з джазам, крыху польскага, крыху амерыканскага.

Слухаючы Колтрэна, пацягвалі віно. Я ўпершыню слухала Томаша Станьку, і мне падабалася бачыць на яе твары ўхвалу і замілаванасць. Пасля на кухні зрабілі сабе нешта на перакуску. І неяк само сабою гамана і гамана...

І ўжо з першых хвілін я пацэліла ў самую нутробу яе настрою. Ёй трэба было з кім-небудзь падзяліцца сваім. І мусова каб з кімсьці звонку. Не цяжка было вычытаць з яе твару, што далягаў ёй нейкі клопат. Праз гадзіну мы ўжо пачуваліся даволі блізка. Як наладжаныя на прыём унутраных вібрацый апараты. Я пачала падкідаць ёй кампліменты пра яе здатнасць, глыбокі і радасны позірк, пра славянскую душу, пра смутак, прыхаваны за гэтай знешняй маскай, якая не вельмі шчытна прыкрывае настальгію і адчуванне няпэўнасці ў сваім лёсе. Я папрасіла, каб яна дазволіла мне дакрануца да яе валасоў. Яна не зрабіла ніякага жэсту нязгоды, але цэлы той час трымала ў сабе вялікі зарад недаверу да мяне, што спрычыніла ўва мне пачуццё няпоўнай раскаванасці. Я пасмяялася, што, бач, спрабую завесці яе, а яна вось вельмі ж чуллівая што да камплімента ў і недаверлівая. Калі хтосьці табе ўточыць камплімента, значыцца, - пачынае гульню, хочучы змусціць альбо падкупіць.

Прыглядваліся мы адна да адной доўга. І тады яна пачала мне спавядацца. Да гэтага часу ў жыцці яна, бадай што, не спаткала яшчэ чалавека, які разумеў бы яе і прымаў з усёй авантурнасцю яе натуры, неспакойнай і поўнай вар'яцкіх паваротаў і заскокаў. У асяродку ўсяго гэтага яна часта разбівае сабе галаву, спрабуючы вырвацца з рамак і прынятых тут шаблонаў.

Яна даводзіла, што ў адносінах паміж людзьмі найбольшая праблема - няшчырасць з сабой, што спараджае хлусню, выкруткі, ашуканства.

Яе папярэдні муж, якому пасля трох гадоў шлюбу і апошняй бурнай начы ў ложку яна паказала на дзверы, не здолеў унаравіць

яе фантазіям і жаданням. Найбольш дакучала ягоная рэўнасць да ўяўных, а зрэшты, і рэальных раманаў. Але пры гэтым ён перастаў цікавіцца ёю і адстаўляў яе ўбок як рэч, якая сталася ягонай уласнасцю і не вымагала адмысловай штодзённай увагі.

Расказала, як аднаго разу ўвечары пасля году шлюбу ён прынізіў яе, з паблажлівай літасцю заглядваючы ў яе пажадлівыя вочы, пасля чаго груба раздзеў яе і холадна, іранічна пазіраючы ў твар, растрахаў яе без ніякае асалоды. Выліў з сябе сперму і адкінуўся ў крэсла з той самай пакеплівай ухмылкай. Нешта ў ёй прарвалася, зламалася. Адчула, што гэта якраз той момант, калі ведаеш, дзе канчаецца цярплівасць і пачынаецца адчужэнне альбо нават нянавісць. Можа, гэта была і трапная нагода, каб драматычна пакласці крэс жыццю ў клетцы, якое называецца шлюбам. Яна спакойна надзела сваю самую лепшую сукенку, зрабіла кідкі макіяж, уступіла ў туфлі на высокіх абцасах і, заняўшыся добрай парфумай, змеціла ў люстры прыходжай яго ўражаны твар. Гэта была першая частка яе сатысфакцыі. Другая настала, калі вярнулася пад раніцу і ўбачыла, як ён шалее ад злосці. Спачатку стрымліваўся, а тады выліў з сябе цэлы цэбар брудных і ліпкіх слоў. Яна не сказала яму, што правяла ноч, задаўшы гвалту сваёй натуры, з першым лепшым добра ўбраным госцем, якога падчапіла ў італьянскім бары на Нямізе. Пазней яны пайшлі ў гатэль і пілі да поўначы, забаўляючыся непрыстойнымі размовамі. Спачатку госць думаў, што мае справу з прастытуткай. А калі зарыентаваўся, што тут не заходзілася пра заробак, узяў яе ў саўну і, салідна ўпіўшыся, не ўпораўся засмычыць яе. Яна пакінула яго спаць на кушэтцы ў нейкі салоніку, знятым за некалькі сотняў даляраў, і вярнулася дамоў першым ранішнім аўтобусам, атрасаючы з сябе гідлівыя позіркі менскага пралетарыяту, які паслухмяна вырупіўся на першую змену.

Яна адчула сябе чыстай курвай-адорвай, і рыхтык гэта пацвердзіў муж, шкумутаючы і раскідаючы яе вопратку. Дзякуючы створанай сабою ж сітуацыі, яна са спакойным сэрцам пачала вызваляцца ад абрыдлівага ўсведамлення: прадмет - уласнік.

Сужэнства гэта пакута
як кожная іншая
дзе ад слодычы і цяпла
вібруе ў зубах метафізічны страх
Прыгледзьмася да сябе
на ростані дарог
здзіўленыя кпінамі лёсу
у здзеклівасці дакрананняў і рук
адвярнуўшыся сыходзім упрочкі

Сужэнства гэта пакута
у трыбуху Левіяфана
шукаем суцяшэння
хоць трохі нязмушанай радасці
разнапружання
не трэба затурзвацца думкай
што труціць нас жахлівы магут
Сужэнства гэта пакута
ў біблійнай арцы
калышамся на бязмежных акіянах
безнадзейна чакаем ацалення
спазматычны лямант розуму
адрываецца
заносіць
высока
Наіўна мы думаем
што гэта птушка ляціць

V

Спрабую разабрацца ў подлым пачуцці, што агарнула мяне, калі я зноў убачыла яе ў піццэрыі з тым самым італьянцам. Спачатку, як пацыент пасля горкага дыягназу, я не хацела пагадзіцца з фактам, што гэтае пачуццё трэба называць раўнівай зайздрасцю. Нейкая млосць недзе ў грудной клетцы, напятасць, як фізіялагічныя праявы пры месячных, раптоўны наплыў асамотненасці і барацьба з мітуснёю думак. Спроба ўпарадкаваць пачуцці і ўлавіць у гэтым сумбуры хоць бы якую там рацыянальную прычыну раздражнення. Яна глядзіць на мяне ўсмешліва і здзіўлена. Як бы разумеючы мой унутраны стан. Падыходзіць. Вітаецца, цалуе ў шчочку. Просіць, каб я ўвечары патэлефанавала, і хуценька ўцякае да свайго залётніка. Мяне захліствае хваля незычлівасці да яе і нават пагарды. Гэта як бы другое аблічча зайздрасці, таго пачуцця, з якім я павінна даць сабе рады і сама ж на яго ўправу знайсці.

Такое са мною ўжо колькі бо разоў бывала. Памятаю свайго першанькага ў Кракаве, з якім мы ўзаемна адкрывалі сабе рэакцыю нашых целаў на электрызуючыя дотыкі і цалункі. Не ведаю, ці было тое першым каханнем, але калі аднаго разу я ўбачыла яго з іншай дзяўчынай, адчула востры боль. Як бы нешта ў мяне адабралі ці ўкралі.

Я шмат разоў аналізавала гэты стан, які называюць хто зайздрасцю, хто рэўнасцю, і кожнага разу трапляла ў тую самую скрынку, у якой схавана старадаўняя таямніца чалавецтва, то бок, суадносіны ўласнасці. Аж тры пункты дэкалогу прысвечаны гэтаму непасрэдна, астатняя рэшта ў пэўным сэнсе таксама. Ці ж бо гэта не таямніца? У маіх пазнейшых закаханасцях ці мала калі здараліся сітуацыі, што адносіны з каханым пераходзілі ў стан прыўлашчання. Зрэшты, апошнім часам з Маркам, хлопцам, з якім ужо больш года я цацкаюся тут у Менску, перажыла нешта падобнае. Аднаго разу ён уброіў мне авантуру, што, бач, цягаюся начамі па дыскатэках. Гэта была яго апошняя напамінка ў такім стылі. І хоць у мяне была вялікая хэнць на яго ў той вечар, я бразнула дзвярмі і сышла ад яго на добры тыдзень. Потым была сур'ёзная размова за вялікім півам. Ён зразумеў тое, што я ў сваім жыцці ўзяла сабе за галоўны прынцып, - не будзе, хто б ты ні будзь, абмяжоўваць маю свабоду. Я не ўласнасць дзяржавы, я нічыя не ўласнасць. І канец.

Якраз тады я і пачула ад яго ладны маналог пра рэўнасць. Як

бы яму рассланіліся хмары над галавой. Сказаў, што рэўнасць мае выгляд і рысы, якіх яму акурат і бракуе. Рэўнасць - гэта высокі шатэн са спартовай фігурай, ездзіць на дужа добрым аўто, мае залатую Visa-карту, вядзе рассупоненае жыццё, што дае яму перавагу ў кожнай гутарцы і дыскусіі.

Я прызнала за ім рацыю, калі аналізавала сваю рэўнасць. Трапнае апісанне. Зайздрасць, рэўнасць мае статныя ногі, доўгія падвітыя валасы, большыя грудзі, меншы нос, ведае больш моваў, прачытала больш кніг і, вядома ж, разумнейшая.

Рэўнасць трэба апісваць як іншую асобу, якая здаецца лепшай, разумнейшай, багацейшай, прыгажэйшай...

VI

З камянямі - тое была яе ідэя. Як бы са стыхійнага парыву, што я найбольш цаню і што мяне ў ёй найбольш вабіць.

Акруглыя, пляскатыя, зручныя, каляровыя марскія камяні з лета ляжалі на паліцы з кнігамі. Яна прывезла іх з Ніды, дзе правяла цудоўны тыдзень на летувіскім узбярэжжы з групай сяброў з некалькіх менскіх газет. Камяні гэтыя, кажа, збірала з мэтай, што паслужацца ёй для масажу цела. Я недзе чула пра такую методу. Нагрэтыя ў гарачай вадзе пасля масажу кладуцца на спіну. Цяпло камянёў суймае боль, супакойвае, мацуе і дае адчуванне гарту.

Але яна ўзбагаціла гэтую ідэю пасля таго, як тады на пляжы ў Нідзе Насця паклала тры разагрэтыя на сонцы камяні ёй на жывот. І яна адчула нязвыклую цеплыню, і якраз тады падумалася, што ў камянях заключана вялікая эратычная моц. Асабліва ў гэтых марскіх, тысячагоддзямі лашчаных вадой, шліфаваных водарасцямі і марскімі істотамі.

Калі я першы раз прыйшла да яе на кватэру, камяні падаліся мне звычайнымі мяшчанскімі кічовымі цацанкамі. Як фарфоравыя фігуркі лялек і зверанят. А тым часам яна выбрала адзін з іх - крапчаты, ржава-чырвоны. Глыбока затуліла яго ў далоні і трымала так некалькі хвілін, гледзячы мне ў самыя вочы, нібы хацела ажывіць успаміны гэтага кавалка матэрыі, апелюючы да маёй памяці.

Я ўзгадала верш Ганны Каменскай і ўголас прачытала яго па-польску, робячы акцэнт на кожным слове. Яна ўсё разумела. Так, як бы гэтая паэзія была таксама часткай яе памяці, і каменя, і майго позірку, і нашых целаў.

У канцы мы самі маем права адчуваць сябе такімі ж цвёрдымі камянямі, якія, абцёртыя ў людскім тлуме, сярод здарэнняў і лёсаў гартуюць сваю сутнасць і глыбока ўсярэдзіну хаваюць цяпло і складаную структуру перажывання свайго ўласнага кавалачка вечнасці.

Цёплы ад яе разгарачанай далоні камень яна прытуліла мне да шчакі, вуснаў, носа. Правяла ім па шыі і ніжэй. Пацалавала мяне і сказала, што гэта і ёсць размова з каменем. Пасля ўсунула яго мне ў далонь і сказала прынесці праз некалькі тыдняў, калі, добра разагрэты маім целам, ён будзе трымаць для яе запіс стуку майго сэрца, паху цела, гуку словаў і сілы пагляду.

Некалькі ночаў я трымала камень у сваім ложку. Калі

кахаліся з Маркам, камень быў сведкам нашых спазмаў і енкаў. Марк таксама браў яго ў далоні і гладзіў ім мае сцёгны, плечы, ступакі.

Праз некалькі тыдняў, калі я аддавала ёй камень, мы ўжо выдатна разумелі адна адну. Яна ўзяла ў мяне гэты ржава-чырвоны і паклала на далонь іншы, халодны, з шэра-срабрыстай павалокай. Сказала толькі, што хоча дакрананнем, поўнай далоняй абняць цвёрдае змесціва і выдабыць з яго тое, што я ўклала поўнай сілай маіх найлепшых пачуццяў. Халодны камень назваць прыладай кахання...

VII

Я люблю яе кватэру ў цэнтры Менска. І гэта пачуццё супярэчыць маім мяшчанскім кракаўскім прызвычайкам. Праўда, лесвіца няшмат розніцца ад той, якую я з такім задавальненнем пакінула ў Страдоме некалькі гадоў таму назад. Задуха, кухонныя пахі, смурод мачы бамжоў і валацужных п'янчугаў з навакольля. І тыя кракаўскія кашэчыя сцулі, да смуроду якіх так лёгка прывыкаеш, калі любіш жывёлаў. Але ў Кракаве кожная кватэра мела хоць крышку мяшчанскага цяпла. Такога неабходнага эўрапейцу, звыкламу пагарджаць перад сябрамі слабінамі стэпавага воўка.

Масіўныя дзверы кватэры паспяхова адсланяюць яе ад знешняга свету. Пасля некалькіх начных выпадкаў, калі ў дзверы ламаліся п'яныя іншаземцы, памыліўшыся дзвярмі з суседняй вышэй паверхам інтымнай установай, яна пастанавіла сабе забяспечыцца салідымі і моцнымі замкамі, жалезнай засаўкай і мяккай абіўкай, якая глушыла ўсе вонкавыя шумы.

І тым не меней ноччу з лесвічнай пляцоўкі далятае рэзкі стукат высокіх абцасаў альбо п'яныя крыкі неспатоленых кліентаў.

У калідоры яе кватэры старая мэбля пакрытая цёмнай палітурай, такой моднай у канцы шасцідзесятых, прыгнятае сваёй безгустоўнасцю. Але ўжо пакой, у якім яна праводзіць большую частку жыцця, дае мне адчуванне пэўнасці. Хоць, халодны і поўны пагардлівай, задзірыстай няўкладнасці, ён мае некалькі прадметаў хатняга ўжытку і кніг, моцна абжытых у такой самай эстэтыцы, якую калісьці ў Польшчы апісаў нейкі малады сацыёлаг, высмейваючы хіпі ў доўгіх пацёртых світарах, з акулярамі на носе і прышпіленым на грудзях рэастатам. Што нас яшчэ лучыць, дык гэта яе вялікі альпінісцкі заплечнік у куце за шафай і заквэцаныя боты. У Беларусі цяжка з гарамі, а ейную любоў да вылазак у Судэты і Татры пацвярджаюць шматлікія здымкі, хаатычна развешаныя над сталом і кніжнай паліцай.

Калекцыя кампактдыскаў дае ўяўленне як пра добрую музычную адукацыю, так і пра малады ўзрост. Ад Баха, Скарлацці праз Равэля, Стравінскага, Шапэна аж да найноўшых дыскатэкавых хітоў. Іншая рэч, што даступнасцю гэтай моднай прадукцыі можна заўдзячваць пірацкаму бізнесу і нізкім цэнам. Заўсёды, як я прыязджаю ў Кракаў, усе мае знаёмыя карыстаюцца маімі запасамі навінак CD без якіх-колечы азнакаў пачуцця віны.

Калі я гляджу ў высокія старыя вокны, поўныя духу

сталінскага класіцызму, як і ў большасці гэтых камяніц у цэнтры Менска, мяне забірае ўражанне, нібыта я пабывала ў Новай Гуце. З аднаго боку адчуванне чужароднасці, нават варожасці, з другога - усведамленне, што навокал напэўна ж бо жыве шмат цікавых людзей і яны трактуюць гэтую архітэктуру не як божае дапушчэнне, а як месца адыходу ад навыкаў нянавісці і непрыхільнасці да непрыязнай прасторы.

Нехта сказаў мне, што ўвесь цэнтр Менска будавалі ваеннапалонныя вермахту пасля прайгранай вайны. Напэўна ж яны адшкадавалі сабе страчаныя месяцы лагернай бяздзейнасці і галодных пайкоў працай у сваіх прафесіях. З прускай рамесніцкай стараннасцю яны выконвалі заданні савецкіх недавучаных дойлідаў.

З яе вокнаў я цяпер азіраю гэты «навагутны» Менск. Найбольш люблю глядзець на тусоўкі каля Макдональда. Тут найбольш праяўляецца значэнне гэтага слова. Тусоўка - гэта спроба наладзіць грамадскія сувязі з апораю на бачанне і павярхоўны дыялог. Нешта як калода картаў, тасаваная спрытнай рукою абавязковай моды. Дзяўчаты какетнічаюць, хлопцы ж тут дужа крутыя.

Тусоўка пад Макдональдам, бадай што, найважнейшае месца ў цэнтры, дзе можна ўмовіцца пра спатканне, выпіць альбо зайсці ў падземны пераход і там пад гукі разладжанай гітары і хрыпатых песенек Чыжа купіць газету, каб даведацца, як там бацька - ці не прыдумаў якога дэкрэту супроць тусовак.

Неяк бацька ўжо быў папракнуў, што на адкрыццё «закусачнага бара», гэтага сімвалу амерыканскага імперыялізму, прыйшло зашмат моладзі, занаджанай таннымі гамбургерамі. Але я зразумела гэта неадольнае жаданне мець кавалачак Амерыкі дома, калі пачула расказ, як на пачатку дзевяностых менскія дзяўчаты ездзілі начным цягніком у Маскву, каб прывезці адтуль пластмасавы ці папяровы кубачак, упакоўку з-пад бігмаку ці яшчэ якое падобнае смецце.

Прыгадаліся і ўспаміны аднаго асістэнта ў нашым інстытуце, як за пару джынсаў ён колісь прывозіў з Масквы залатыя абручыкі і масіўныя пярсцёнкі з жахліва дарагімі камянямі. Амерыканскі міф у цане золата.

З нядаўняга часу пад менскім Макдональдам выгульваецца патруль АМАПу. Кантралююць паводзіны моладзі, зганяюць з гранітнай балюстрады, забараняюць пляваць на тратуар, правяраюць дакуманты. Бацька чувае як Старэйшы Брат.

З другога боку яе кватэры адкрываецца панарама не надта маляўнічага царства КДБ, пракуратуры, МУС і чагосьці там яшчэ. Вокны гэтых ўстановаў палохаюць тупымі і бяздушнымі

правалінамі як і распасвеныя квадратныя храпы іх гаспадароў, перакананых у сваёй усемагутнасці і моцы.

Пад вокнамі бліжэй да яе кватэры ў невялікім будынку маса ахоўнікаў ці пажарнікаў, якія выдаюць пасведчанні пра адпаведнасць забеспячэння бяспекі абавязковым цыркулярам.

Невялікае святло на вежы самага высокага будынка-дамінанты КДБ нагадвае стары савецкі анекдот пра тое, як адзін тутэйшынец хацеў упэўніцца, ці сапраўды гэтая фірма чувае, і са смехам назвоньваў туды сярод ночы, пытаючы ў дзяжурнага, чаму яго, грамадзяніна, яшчэ не павязалі. Пасля трэцяга званка ён адчуў на сваім плячы лёгкае паляпванне далоняй і, збялеўшы ад перапуду, убачыў некалькі суворых мужчын у скураных плашчах.

Цяпер скураныя плашчы замянілі скуранымі курткамі, «скуранкамі», як тут кажуць, часцей за ўсё са стамбульскіх рынкаў. Адтуль павёўся турэцкі ўклад у развіццё сіл бяспекі Беларусі. Калі а шостай людзі выходзяць з працы альбо ўдзень на абедзены перапынак, увесь цэнтр і наваколле яго стракаціць панурымі абліччамі ўсякіх тыпаў у скуранках.

Мы стаім каля акна. Я спрабую вытлумачыць ёй свой стан. Страх і ўсё большая і большая хваля рашучасці, гатоўнасці змагацца з гэтым брутальным і ліхім светам. Здалёку мы бачым, як тамтэйшы муэдзін на сваёй вежы круціцца каля пісьмовага стала, скупа асветленага агеньчыкам лампадкі. Святло падае амаль на нашыя твары, хоць адлегласць даволі вялікая. Яна абняла мяне. Я адчуваю прыемны пах яе скуры. Валасы асыпаюць мой твар.

Нечакана яна кажа, што, пачакай хвілінку, яна пераапранецца ў нейкі адмысловы прыкід. Знікае ў калідоры, і я чую, як яна дастае з шафы ўбранне. Падыходжу бліжэй - яна перад люстрам здымае блузку і спадніцу. Які цудоўны бюст. Я кажу ёй камплімент, а яна крывіцца, - ай, кінь! - гэта ёй, бач, не да густу. Надзявае бардовую блузку, спадніцу, абувае туфлі на высокіх абцасах. Становіцца перад мною. Такая прыгожая, страшна прыгожая. У вачах чарцяняты, сіне-шэрыя. Матухны, колькі ж бо ў ёй сексуальнасці! Падыходжу яшчэ бліжэй, пагладжваю яе валасы, рукі, сцёгны, і неспадзявана мы ныраем у вірлівую прастору, дзе адкрываецца нешта такое, што ў нас наймацнейшае і не дае зважаць ні на якія рэляцыі і справаздачы, быццам мы былі часткай гэтага грамадства, гэтага горада, часу, зацятасці і граных у ёй роляў. З той самай сілай адначасова з нас абедзьвюх вызваляецца нейкая энергія, якая пазбаўляе нас усякай улады. Яна кідае нас на канапу, на ложак. Прымушае дакранацца да цела ў найбольш інтымных месцах. Яна праводзіць далоняй пяшчотную лінію па ўсіх самых далікатных стацях, на стыку цела і псіхікі, душы і

фізічнасці. Мы качаемся па падлозе, ахопленыя хваляй дзікай жарсці. Пацалункі, уздыхі і стогны. Валасы сплятаюцца, рассыпаныя недзе паміж шыяй, далонямі, адзеннем і бялізнай. Мы абедзве ўзрушаныя гэтай сітуацыяй і штохвіліны са здзіўленнем прыпыняемся, каб паглядзець адна адной у вочы. Як бы з пытаннем, ці гэта праўда, ці такое магчыма. Але целы далей, нібы незалежна і без нашага ўдзелу граюць сваю ўласную мелодыю, паводле толькі ім вядомага рытму. Не ведаю, колькі гэта доўжыцца. Можа, некалькі хвілін, можа, гадзіну. Вяртаемся і зноў кідаемся ў тыя самыя рытмы, якія ўзмацняюць і без таго вялікі ўздым. Яна раптам выбухае мне ў твар стогнам асалоды і радасці. Я адчуваю гарачую хвалю яе энергіі, якая выліваецца на мяне і даводзіць да знясільнага аргазму. Мы цалуемся гэтак сама палка, цалуем твар, грудзі і гарачую скуру на ўсім целе. Потым хвіліну ляжым без руху, без духу, каб пасля перабрацца на тапчан. Я зноў гляджу на акно ў бок святла з суседняга дома. Там наш кат за кадэбэшным сталом спрабуе прывесці нас у нармальны стан. Допыт працягваецца. А мы хаваем свае целы пад коўдрай, накрываючы ёю свой перапалох альбо пагарду і бяссіласць супроцуь гэтага мужчынскага свету.

VIII

Неспадзявана пасля нашай працяглай начной размовы яна дала мне сшытак з запісамі. З таямнічай усмешкай паведаміла, што гэта дазволіць мне крыху лепей зразумець яе ўнутраны лад.

Я ўзялася чытаць з пэўным подзівам. Крыху ў гэтым успамінаў, вершаў, малітваў, паэтычнай прозы, выпісак з іншых кніг - яе любімага чытва. Ёсць таксама фрагменты нейкіх яе артыкулаў, ці эскізаў і чарнавікоў. Яна згадзілася, каб частку тых тэкстаў я пераклала.

Калі я пачынаю разважаць пра свабоду, я думаю пра абмежаванні, якія не дазваляюць мне адчуваць сябе свабоднай. І тады я задаю сабе пытанне - калі ж я свабодная. Чаму апынулася тут і цяпер, у гэтым часе і прасторы. Разваліўся Савецкі Саюз. Для маіх бацькоў гэта быў сур'ёзны дыскамфорт. Маці камуністка, бацька разважлівы патрыёт, які па начах слухаў «Радыё Свабода». Абое рашылі прыняць гэту новую рэчаіснасць і ўступілі ў нейкі кааператыў, які даваў хуткія і неблагія грошы. Адчулі свабоду і дастатак. Але адначасова і няўпэўненасць - ці ўдасца так далей утрымацца. Бо ў перспектыве ўсё ж пенсія і невядомы лёс. Маці пачала даваць збоі ўжо ў 1994 годзе перад выбарамі прэзідэнта. Нават угоньвалася з улёткамі, каб людзі ў нашым доме галасавалі за Лукашэнку. То былі класічныя ўцёкі ад свабоды. Бацька пасля паражкі БНФ адышоў ад палітыкі. Яго свабода таксама зазнала плягі.

А для мяне, нягледзячы ні на што, быў гэта свет знешні, з нічым я сябе не атаясамлівала. Ніякай палітыкі, ніякіх поглядаў. Айчынная вайна яшчэ пэўная святыня, бо ў дзяцінстве ў мяне быў любімы дзядуля, які ўвёў у мяне тую вялікую легенду пра вайну з фашыстамі, вайну за вялікую святую справу. У сярэдняй школе ўсё гэта адбілася ўва мне патрыятычным парывам. Мне было шаснаццаць, калі я звярнулася ў ваенную камендатуру, каб мяне ўзялі ў Афганістан на вайну санітаркай. Калі сёння я чагосьці саромеюся, дык не так высакароднага парыву, як таго невуцтва, якога ніхто з самых блізкіх не мог альбо не хацеў паправіць. Бо пазней і зусім ненаўмысны міф пра высакародную вайну аказаўся містыфікацыяй, а дзядуля сапраўды быў партызанам, але як скінуты з парашутам камісар НКВД. І зусім не ваяваў з фашыстамі. Пасля вайны невядома чаму некалькі гадоў служыў у адным з лагераў на Калыме. У кожным разе не як ахвяра. Усё гэта не было схавана ад мяне, бо ў размовах з бабуляй я завялася

занадта моцна цікавіцца падрабязнасцямі.

Але ўсе мы, мусіць, былі такім суровым, высакародным матэрыялам, з якога спаквaля і сістэматычна пяклі нейкі хлеб, прасавалі ідэалагічныя пляцкі з малых несвядомых кавалкаў, казурак, пазбаўленых абарончых механізмаў.

Адна мая знаёмая з мястэчка Беразіно сваім часам была добрай, пачцівай і гарачай камуністкай. Верыла ва ўсе гэтыя глупствы. Мела добрую адукацыю, заслужаную пасаду ў раёне. Уладкаваны свет. Калі ў 1990 годзе ляснуўся яе даражэнькі Савецкі Саюз, лопнула ўся структура, яна месца сабе не знаходзіла. Паўгода хадзіла сама не свая. Страціла працу ў райкаме, з ёю перасталі лічыцца. Аднаго вечара яна кінулася ў плыні ракі з самага высокага ў горадзе маста. Выцягнулі яе ў апошні момант. Ляжала ў бальніцы, лячылася больш года, і тады ў ёй нешта прарвалася. Узялася за паро, панадзілася пісаць вершы. Праз суседку запазналася з каталіцкім ксяндзом. Заўчашчала ў касцёл. Ажыла. Зноў знайшла сваё месца.

Калі я гляджу на такі лёс і думаю пра свабоду, адчуваю нейкі фальш і няпраўду ў кожнай навязанай структуры. А я ж тым самым часам ведаю, што свабода - гэта часцяком нейкі выбар акрэсленай праўды, структуры, схемы, што дае сілу быць унутрана моцнай і добрай для іншых.

Я ўсё яшчэ захавала ў сабе ўпэўненасць, што ўжо цяпер ніхто мяне больш не ашукае, як мільёны гэтых бедных савецкіх грамадзян, кормленых ідэалогіяй, надзеяй, хлуснёй і страхам. Няма мне месца ні ў якой структуры. Адусюль, дзе толькі прыкмячаю хоць бы які след складзенай кімсьці рэчаіснасці, я выкоўзваюся, уцякаю і шалею як у прыступе клаўстрафобіі. Замкнутая, усю сваю энергію трачу на планаванне ўцёкаў і ўжо калі вырываюся, першы глыток свежага паветра мне больш вартасны і жывасны, чым увесь той спакой і ўнармаваная існасць, да якой мяне дапасавалі.

IX

Яна расказала мне пра сваю апошнюю мару. Было, як у цёплым сне, ты яшчэ ўся ў імгненні абуджэння, яшчэ кволішся ў мроіве, а ўжо святло, якое падае ў пакой, уступіла з табою ў блізкі кантакт.

Ёй сніўся прыгожы сон з падстрыжаным газонам і дагледжаным кветнікам. На вуліцы перад пад'ездам вялікі аўтамабіль, амерыканскі *van* з бліскучымі буферамі і ёмістым нутром. На ветравой шыбе прыліплыя бярозавыя лісткі. За ноч стаяння на металічны лак асела раса. Усё гэта разам як вобраз упэўненасці, стабільнасці, заможнасці, пражываных у сямейным коле. Я аж сама дзіву далася, што так кінулася ў мары. Туга па сямейным цяпле, апецы чалавекам, які штодзень надзявае чыстую кашулю і прыносіць у дом гібель колькі даляраў.

Сапраўды я здзівілася, бо лічыла яе цвёрдай дзяўчынай, якая, навучаная савецкім вопытам, ведае, што няварта так лёгка аддавацца ілюзіям і марам, бо сутыкненне з брутальнай рэчаіснасцю бывае непрапарцыянальна балючае. Стараюся падтрымліваць яе, каб апорысцей стаяла на зямлі.

А яна тады расклеілася і завялася ў румзы.

Кажа, што гэтак сама адчула сябе калісьці, вярнуўшыся з Чэхіі. Упадала ў істэрыю праз таго чэскага бізнесоўца, з якім запазналася ў Менску на кірмашы. Стары казёл звёў яе абяцанкамі, запрасіў у Судэты на лыжы, спыняўся ў дарагіх гатэлях, даваў вячэры ва ўтульных кнайпах. Меўся забяспечыць ёй сталы побыт, дазвол на працу, кватэру ў Празе. А пасля раптам знік, пакінуўшы яе каля польскай граніцы. На шчасце аплаціў рахункі, і яна мела пры сабе колькі там даляраў, каб вярнуцца праз Уроцлаў начным цягніком у Берасце.

Кажа, што Багуміл спалохаўся яе тэмпераменту ў ложку. Яму ўжо было пад пяцьдзесят за плячыма, а яна мела дужа разгарачаны смак на жыццё, фізіялогію, якая вымагала сістэматычнага пешчання і трэнінгу. Я толькі не магла паверыць, што яна так проста і хутка далася загнаць сябе ў пастку ўласных мараў.

Я разважала з ёю скрупулёзна крок за крокам, як яна ўяўляла сабе жыццё ў Чэхіі - сціплай журналісткі з Беларусі, выстаўленай на пажыранне з прычыны гарманічнай славянскай прыгажосці, што адразу кідалася ў вочы, - як безабаронны хутаранін у лесе, поўным ваўкоў, рысяў і драпежных адзінцоў. Дзяўчаты з Менска выязджаюць у Прагу наогул на вуліцу, і толькі некаторым

перападае добрая халява ў начным кабарэ, дзе яны растрэсенымі сцёгнамі даводзяць да эрэкцыі поўныя партфелі тлустых і слінявых пенсіянераў з Германіі, Аўстрыі і адкуль бы там яшчэ тое ні было.

Яна марыла вырвацца адтуль, з бруднай і бяздоннай ямы, дзе адзіныя сапраўдныя хахалі - гэта злачынцы ў люксусовых аўтамабілях з прэзідэнцкай ці іншай мафіі. Яна доўга спасылалася на нейкіх знаёмых з радыё «Свабода», у беларускай рэдакцыі. Калі б Багуміл дапамог ёй зачапіцца на першых паўгода, яна напэўна знайшла б працу ў якой-небудзь культурніцкай праграме радыё і пісала б карэспандэнцыі пра артыстычную актыўнасць землякоў за граніцай.

З першага падарожжа ў Прагу яна і прывезла масу цікавых фотаздымкаў. З усіх веяла яе нерацыянальнай тугой па мяшчанскім уладжаным жыцці. Да знуджэння талдоніла мне, што даўно думала застацца там, бо ў Чэхіі, бадай што, найпрасцей знайсці самую сябе - мова блізкая, краіна славянская, культура заходняя. Прачытала недзе ў менскай газеце, што там адносна лёгка дастаць карту на сталае жыхарства. Вацлаў, з якім тады пазнаёмілася ў начным бары, падрадзіўся паспрыяць. Але калі ён пад'юрыўся да яе ў саўне мала што не праз гадзіну пасля знаёмства, яна скеміла, што павінна змяніць альбо прафесію, альбо тактыку.

Калі яна мне ўсё гэта расказала, я адчула крыху нясмаку і нават гідлівасці да яе. Так лёгка знізіла лёт амбіцый з прычыны фатальнай паласы ў жыцці. Вядома, няўдачы змушаюць да карэкцыі планаў, але з яе здольнасцямі гэта не праблема. Яна дасканалая журналістка, паэтка, цудоўна разбіраецца ў музыцы, сама грае на фартэпіяна, па-майстэрску фатаграфуе, мае спартыўнае захапленне і добрыя ўмовы, каб шмат гадоў трымаць сваё цела ў выдатнай кандыцыі і прыгожай форме, без лішняй траты сілы, без адмысловага самаахвяравання. Веданне некалькіх моваў і класнае ўмельства збліжацца з людзьмі, а таксама журналісцкі нюх на ўсялякія актуальнасці.

Пазнаёміўшыся з ёю, я сама не магла адысці ад здзіўлення, - чаму я так раптам проста з моста захапілася гэтай самастойнай, упарцістай дзяўчынай, якая з французскай інтэлектуальнай лёгкасцю, нямецкай паслядоўнасцю ў працы і італьянскім тэмпераментам заваявала Менск.

А цяпер як звычайная няўдаліца падбівае мяне выехаць з ёю куды-небудзь з гэтай юдолі роспачы і адчаю. Яна імпэтна загараецца новымі ідэямі і, з бліскучымі вачыма, падкурчыўшы ногі на тапчане, уголас чытае фрагменты тэкстаў з газет пра тое,

што замежныя інвестары ў Чэхіі могуць і не мець спецыяльных грошай, дастаткова зацікавіць фірму, каб закупіць нерухомасць і дастаць права на жыхарства...

Толькі як нядаўна, апошняй зімою, з'ездзіла туды - у чэшскія Судэты - яе першая зачараванасць добрай арганізацыяй кожнай дэталі жыцця перарадзілася ў скепсіс, калі ёй далі зразумець, што яна там такая ж чужая, як цыган альбо хтось такі іншы. Яна пазычала лыжы на цэлы тыдзень, і ніхто яе спецыяльна не чапаў, калі аддавала на дзень-другі пазней. З усмешкай запрашалі прыйсці наступным разам. Жыла ў вялікім гатэлі, з вокан якога былі відны падсвечаныя горы. Праз некалькі дзён нейкі трыбухаты чэх, які ўвесь час ейнага пражывання ўважліва пасвіў яе вокам, намякнуў, што ён там гаспадар і чакае аддзякі за такія прыемныя хвіліны. Можа, не было б у тым нічога брыдкага, але калі ён прапанаваў падмацаваць ужо дадзеныя авансы канкрэтнай платай, яна адчула гідлівасць. Бадай, хутчэй да самой сябе, чым да таго разапселага парвеню. Ён жа аказаўся звычайнай свіннёй, бо за адхіленыя авансы паквітаўся і данёс іміграцыйным уладам, што яна прастытутка. І яна з адміністрацыйнай візай мусіла пакінуць Чэхію на працягу дваццаці чатырох гадзін. Магу сабе ўявіць, колькі сораму і ганьбы ператрывала. Ну, і год перапынку, балючага расстання з квяцістай рэчаіснасцю, да якой паспела ўжо душой прыкіпець.

X

З таго часу седнем засела ў Менску і заўзята піша справаздачы з выставаў, якія наведала ў Празе. Ніхто не хоча публікаваць, дык расчараванасць паглыбляецца.

А Марк прыходзіць да яе на кватэру і, убачыўшы нас абедзвюх, прытухлых і нябогіх, прапануе выехаць у Рыгу. Пазней я гутарыла з Маркам, які заўсёды ахвочы да новых выклікаў лёсу і перамен. Не вельмі яму гэта абыходзіць, не дужа далягае. Кантракт з немцамі ўжо канчаецца, а прапановы працы ў гандлёвай канторы пасольства даволі цьмяныя. Але і Марк, які заўсёды цвёрда ходзіць па зямлі, высмеяў такую перспектыву. Хоць ён і не паляк, але раіў ёй, што лепш было б зачапіцца ў Польшчы.

Марк са сваім латышскім грамадзянствам і банкаўскай прафесіяй можа не турбавацца. Адзіная праблема, якою ён дастаў мяне, гэта - што мы павінны былі б пабрацца і такім чынам урэгуляваць нашыя адносіны. А ў мяне на тое жаднай ахвоты. Дык вось калі ён прыходзіць да яе і бачыць нас абедзвюх, як мы сядзім блізка адна каля аднае на кухні над чайнікам гарбаты, ён упадае ў ятру і спаганяе на ёй усё сваё раздражненне.

Тады яна дэманструе мне мужчынскую салідарнасць і падбівае мяне пагаварыць з ім больш сур'ёна, чым дагэтуль. Зрэшты я трактую гэта як правакацыю ці яе жарт. А Марк недаверліва глядзіць на нас і ўсё гэта прымае за вытанчана далікатную гульню дзвюх кабет супроць адзінага тут вартаснага мужчыны.

Часта паўтараю ёй, што такі постсавецкі госць шануе цябе, пакуль ты незалежная. Пайсці на ягоныя хлябы і транты - гэта прыкладна тое самае, як дацца замкнуць сябе ў камеры турмы на Валадарскага, якую ці не кожны дзень я сузіраю са свайго акна.

А сёння ён салодзенькі і любенькі, хоць ты цалуйся з ім. І такога яго люблю, але іду ў заклад, што праз дзень па шлюбе ён меў бы мяне глыбока ў срацы. Так і бачу іх абаіх перад тэлевізарам, як яны мастурбуюцца, да позняй ночы праглядаючы парнаграфічныя фільмы, пакідаючы ялавым такое ладнае цела на тапчане. А мне з ім добра, але я хачу незалежнасці і права выбару.

Апошнім часам яна загаварыла пра выезд у Новую Зеландыю. Я бяссільная і з такой самай бяссілай мінай выслухоўваю яе новыя намыслы. Кідаецца з ілюзіі ў ілюзію. Я, вядома, нічога не

выключаю. Яна ведае мяне настолькі, што ўмее развярэдзіць маю фантазію. Нездарма ж мы паслалі ўнёскі на візавую латарэю ў Штаты.

Кантракт з Міністэрствам адукацыі канчаецца ў мяне ў чэрвені. Пасля двух гадоў працы выкладчыцай польскай мовы ў тутэйшых вучэльнях я думаю, што буду вымушана зрабіць сабе перапынак. Выязджаю ў Менск. Вяртаюся ў Кракаў.

XI

Так было ў мяне з адной маёй паездкай у Вільню. Я купіла білет, села ў цягнік і за няпоўныя чатыры гадзіны была ўжо там і рассякала старую Вільню. Разглядваючы сябе ў вітрынах крамаў, слухаючы цвіркатанне летувіскай мовы, заглыбляючыся ў змрочныя сутарэнні касцёлаў, я ўвесь час мела высокі ўзровень адрэналіну, які дазваляў мне амаль навобмацак адчуваць сапраўдную свабоду.

А свабода ж можа мець форму мужчыны. Хай сабе і не заўсёды і не надоўга. Я засела на Замкавай за столік у кавярні, замовіла сок і канапку. Як лёгка звярнуць на сябе ўвагу - самотная дзяўчына, усмешлівая, нікуды не спяшаецца.

Суседні столік. Пажылы мужчына. Я адказала ўсмешкай на зачэпны ківок галавой, які, мусіць, павінен быў азначаць «смачнога». З другога суседняга століка падсунулася смешная сітуацыя. Муж, жонка, дзіця. Ён бачыць пад сталом мае адкрытыя калені і не зводзіць з іх вачэй. Няўжо мужчыны больш палігамныя? Я не ўпэўненая, бо, бадай што і хутчэй за ўсё, палігамныя мы, жанчыны. Калі, маючы ўсялякія вартасці і целы і асобавасці, мы можам выбіраць спасярод залётнікаў, шанавальнікаў, сярод арды самцоў, якія дужаюцца за доступ да ўлады, маёмасці і нашых целаў, што таксама ёсць атрыбут улады і маёмасці. Сярод гэтых інстынктаў толькі тое, што робім мы, ёсць сапраўдная палігамія. Быць са мною можа толькі той, каго захачу я. На хвіліну, на адзін раз, альбо на цэлае жыццё. І то ж большасць жанчын не ўсведамляюць гэтай сваёй незвычайнай улады. І паддаюцца мужчынам. Падпарадкоўваюцца, дзелячы ўладу і маёмасць свайго Гаспадара і ўладцы. На яе сплывае частка атрыбутаў улады. Прызвычаеныя выхаваннем матуляў і бабуляў трываюць у гэтым стане, даючы выйсце толькі бясплённым мроям.

Насупраць селі два хлопцы. Маюць сотавік, які сюд-туд і назвоньвае. Балабоняць па-летувіску, уладжваюць нейкія гешэфты. П'юць каву. Праз колькі там хвілін у іхніх клопатах яўна настае нейкі пералом. Пасля аднаго такога званка радуюцца, паляпваюць па плечах, пляскаюць у далоні, як пасля гола ў баскетболе. Абодва летувісы рослыя, светлавалосыя, у джынсах і спартовых кашулях. Уладзіўшы нейкую важную справу, адмаўляюцца ад кавы і заказваюць чатыры вялікія куфлі піва. Расслабіўшыся, пачынаюць заўважаць мяне. Сваім звычаем я какетліва апускаю вочкі і сціпленька ўсміхаюся.

Калі даядаю канапку і ўжо меруся плаціць, адзін з іх устае ад

століка і пытаецца па-летувіску. Нічога не разумею. Пытаецца парасейску, ці нельга ім падсуседзіцца. Усміхаюся. Яны бяруць сваё піва, падсаджваюцца. Аднаго завуць Арвідас, другога Ёнас. Абодва з Коўні. Прыехалі купіць нейкую вялікую партыю электратавараў у расейца з Калінінграда. Дамоўленую цану ім удалося збіць і вось радыя, бо ў Клайпедзе тавару ўжо чакае вялікая крама.

У такім радасным настроі яны коратка расказалі пра ўдалы дзень, памысныя інтэрасы і перспектывы сваёй фірмы. Як на летувісаў хлопцы даволі гаваркія і адкрытыя. Выпіўшы піва, заплацілі, і мы пайлі на шпацыр па горадзе, бо, даведаўшыся, што я з Менска, от мусова зарупіла ім узяць мяне ў Коўню. Арвідас адразу саступіў месца ля мяне Ёнасу. Можа, загадзя ўмовіліся, альбо ж не хапала ім эратычнага ўяўлення. Шпацыр з кожнай хвілінай набываў усё гусцейшы характар як у тэмах гутаркі так ва ўсё часцейшых дакрананнях. Хлопцы, відаць, не ўяўлялі сабе, што я магла згадзіцца пайсці з імі абодвума, што хапае мне на тое адвагі, рашучасці і сексуальнай фантазіі. Мае намёкі не даходзілі да Арвідаса, толькі злавалі Ёнаса. У парадку. Я дала сабе спакою што да далейшых правакацый, не зацягвала іх больш на няпэўны грунт. Зрэшты, дзеля таго ж я і прыехала ў Вільню, каб пражыць штосьці моцнае.

Арвідас нарэшце праз дзве гадзіны зліняў. Мы з Ёнасам сядзелі ў кнайпе на Дамініканскай. Пачаў прыступаць да справы. Сапраўды спяшаецца ў Коўню, куды запрашае і мяне, але, зрэшты, маглі б праехацца на машыне куды-небудзь за горад. Я адразу згаджаюся, бо пасля добрага пасілку варта і прагуляцца. Выязджаем у бок Неманчына. Дзесяцігадовы чорны «Мэрсэдэс» цудоўны, як новенькі. Добрая музыка. Збочваем у лес. Я пытаюся ў Ёнаса, ці мае прэзерватывы. Пасаромлены, ківае галавою, што не. Вяртаемся на бліжэйшую запраўку. Купляе. Вяртаемся ў лес. Ёнас заглыбляе машыну ў гушчобу. Выходжу. Ён кідаецца на мяне, распалены. Супакойваю яго. Маем час, куды нам спяшацца - паспеем у ягады схадзіць. Прапануе пакласці мяне на нагрэтым чахле машыны. Дастае з багажніка коўдру. Я здымаю майткі. Падцягваю спадніцу. Ёнас ледзь дыхае. Не разлічваў на такія тэмпы. Надзяваю яму прэзерватыў. Няблага. Але ўжо праз хвіліну ён канчаецца ўва мне. Поўны прэзерватыў спермы, Гладжу яго, але відаць, як хутка ападае ў ім ахвота да далейшых пяшчотаў. Дрэнь. Шмат цела, мала мазгоў у чэрапе. Я расчараваная. Ён не траціць фасону. Робіць выгляд, што было о'кей. Нацягвае мне майткі, азіраецца навокал - крыху небяспечна. Не пярэчу. Пакуемся і - у машыну. Адчыняю бляшанку з півам. Ёнас крыху сумеўся. Спрабуе дамовіцца на наступнае спатканне. Аддае мне рэшту прэзерватываў, каб захавала да наступнага разу. Во,

нахаба. Спяшаецца. Добра, разумею. Але каб так дэманстрацыйна.

Завёз мяне ў горад. Развіталіся даволі холадна. Ён быў крыху агаломшаны маім тэмпераментам і, відаць, адчуваў сорам, што я прынізіла яго, навязаўшы свой рэжым. Але не зразумеў, што ў гэтым магло, зрэшты, заходзіцца пра нешта цалкам іншае. Калі б ён не аддаў мне тых прэзерватываў і не злез з мяне з такім спрытам, ледзь не падганяючы мяне адзявацца, я ацаніла б яго зусім інакш. А я адчула сябе рэччу. Ён мог бы, вядома, у той момант сказаць, што я сама так хацела, бо лёгка на ўсё згадзілася. Гэта толькі пачатак. Гэта толькі нагода прачыніць самыя патаемныя заканаркі душы. Чым больш у сексе дзікага эгаізму, тым хутчэй трэба з ім канчаць. Секс адчыняе дзверы каханню. А ён, здаецца, таго не разумее. Цяжка, хоць гэта і мая страта.

Я зноў на Замкавай. У запасе больш за дзве гадзіны да цягніка. У Менску буду каля адзінаццатай. Уваходжу ў касцёл св. Ганны. Як я люблю гэты касцёл. Ён адчыняе ўва мне ўсю маю генетычнную памяць. Я быццам заглыблялася ў ім ва ўсе закуткі гісторыі, перажытага, трагедый і радасцяў. Нібы я была сама гісторыяй гэтай зямлі, часткаю людскіх лёсаў, якія накладваюцца на маё марнае, нікчэмнае жыццё. Малюся, уткнуўшыся тварам у далоні. На далонях яшчэ пах прэзерватыва. Не ведаю, смяяцца ці плакаць. Мяшаецца ўва мне дзікасць маёй натуры з разбуджанай настальгіяй па ўпарадкаваным жыцці. (Якога nota bene не выношу). І як тут зразумець сябе самую.

Выходжу з касцёла. Каля помніка Міцкевічу дзве дзяўчыны за мальбертамі пэцкаюць палатно, надаючы вобразнасць гарадскім краявідам.

Рашыла выпіць добрай кавы. Падымаю ацяжэлае цела на гару завулкамі з боку Зарэчча да касцёла айцоў Аўгусцінцаў. Заварочваю на вуліцу Бокшта, уздоўж тоўстага цаглянага мура - направа і вяртаюся св. Казімірам у стары горад. Мінаю пажылога мужчыну. Відаць, замежнік, які з дзіцячай радасцю спрабуе схапіць у аб'ектыў свайго апарата выдатна асветленую залацістую званіцу касцёла св. Казіміра. А ў мужыка чэпкае вока! Сапраўды, выгляд цудоўны. Архітэктура, якая дае адчуванне велічы як яе творцаў так і тых, што хоць бы на хвіліну спрабуюць затрываліць яе ў памяці.

З вуліцы св. Казіміра я выйшла на пляцык перад філармоніяй. У ашклёнай кавяраньцы, прылепленай да сцяны старой камяніцы, знаходжу выдатны відок на ўваход да Вострабрамскай, арка з вуліцай уздоўж будынка філармоніі, выхад на вуліцу Вялікую (Дыджоі) з уваходам у браму ў камяніцы, на падворку якое зацішны гатэлік «Grybas». Заказваю каву, заходжу на хвіліну ў сутарэнне ў туалет. Калі вяртаюся, за маім століку сядзіць той

самы пажылы мужчына, якога спаткала, калі ён фатаграфаваў капулу св. Казіміра. Мая сумка вісіць на крэсле, дык я падыходжу зняць яе і перасесці.

Мужчына ўстае і па-ангельску перапрашаецца, што заняў маё месца. Сам перасядзе. Мы стаім так з хвіліну якую ў перапросінах і раптам выбухаем смехам, рашаем сесці і хай будзе, як ёсць. Мужчына прадстаўляецца. Імя - Марцін. Амерыканскі жыд. Яго радня паходзіць з Вільні. Многія з радні загінулі ў час вайны ў недалёкіх Панарах. Але ён не спынецца на падрабязнасцях. Бегла тлумачыць, што мае тут крыху інтэрасу. Прадстаўляе як юрыст некалькі амерыканскіх фірмаў у Вільні і ў Рызе. Мае даручаную працу і час ад часу прылятае сюды з Амерыкі. Жыве ў гатэлі насупраць, у «Грыбасе». Стары жыдоўскі дом купца Фейгельзона мае добрую аўру.

Выпіваем каву. Я крыху расказваю яму пра сябе. Пра свае журналісцкія страсці і пра пошукі свабоды, да якой з Менска так блізка, а яна тым часам як бы і недаступная. І таму даводзіцца нам, беларусам, наязджаць сюды, каб падобна Фаме-недавярку дакрануцца і ўпэўніцца, што так яно і ёсць напраўду. Скарачаю размову, дапіваючы каву і паглядаючы на гадзіннік. Тлумачу, што праз сорак хвілін мой цягнік. Марцін заахвочвае мяне яшчэ, каб я заглянула з ім у браму дома насупраць. Згаджаюся. Ён паказвае мне чорную гранітную дошку з надпісам па-расейску і па-жыдоўску. Дом купца Фейгельзона. Выходзім на вуліцу ў бок Вострай Брамы. Ён пытаецца, ці можна яму правесці мяне да вакзала. Я ўсміхаюся, дазваляючы. Ён вельмі сімпатычны. Я прыглядваюся да ягонага твару ў прамянях надвячорнага сонца. Бадай што, яму гадоў пад шэсцьдзесят. Але не адчуваецца. Невысокі, хударлявы, дагледжаны. Мабыць, у Амерыцы гэта стандарт, у нас у Менску мужчына ў такім веку абуджае сама большае спачуванне. А ён ужо пачынае мне да спадобы прыпадаць. Адчуўшы недасканаласць маёй ангельскай, стараецца гаварыць павольна, падбіраючы зразумелыя мне словы. Мы праходзім пад вострабрамскай капліцай, і ён, далікатна беручы мяне за далонь, пытаецца, ці каталічка я. Расказваю яму, як у семнаццаць гадоў я ўцякла з дому, каб з'ездзіць у Нясвіж і ахрысціцца. Сама так рашыла. Цяпер не ведаю да канца, якога роду быў той выбар. Ці рэлігіі, ці нацыі, ці проста свабоды ад таго замкнутага савецкага свету, у якім мне шораз рабілася ўсё больш задушліва.

Яму гэта спадабалася. Ён расказаў мне, як адышоў ад рэлігійных традыцый сваіх бацькоў. Выхоўваўся на рабіна ў Нью-Йорку. Адкінуў рэлігію, традыцыі. І ніколі не шкадаваў за свой выбар. Стаўся спраўным юрыстам. І яму добра вядзецца. Ён

заможны, мае цудоўных дзяцей, нават адну ўнучку. Сапраўдны жыдоўскі кайф ад спраўджанага лёсу і жыцця. Але толькі калі прыехаў у Вільню першага разу восем гадоў таму назад, адчуў, як глыбока засела ў ім усё жыдоўскае і як цяжка забыцца на продкавую спадчыну. Не, ніколі не адчуваў ніякай віны. Ён задаволены сваім жыццёвым выбарам. І Пан Бог ніколі не абыходзіў яго сваімі даброцямі, даючы здароўе, дзве жонкі, маёмасць, поспех і дастатак. Толькі прыехаўшы ў Вільню, адчуў нейкія павевы свабоды. Дзіўная гэта свабода, вецер якое вее з магілаў продкаў, ад старых камяніц, барваў і пахаў горада, які называлі Паўночным Ерусалімам.

Расказваючы, Марцін вельмі глыбока глядзеў мне ў вочы, як бы правяраючы, ці паспяваю я за ім. Не так за мовай і сказанымі словамі, як за думкай, за бегам перажыванняў, пачуццяў і тых хваляў эмоцыяў, якія яго так шчасна і гарманічна парываюць. Мая сімпатыя да яго расла з хвіліны на хвіліну.

Мы загаварыліся, а цягнік ужо меўся ад'ехаць. Я махнула рукою з удаванай пакорай - а, паеду начным. Буду ў Менску пад раніцу. Няма праблем. Марцін быў рады з такога павароту справы. Мы рашылі пайсці ўбок сінагогі. Ён паказаў мне будынак, нібы гэта была бацькава камяніца. Не, ягоны бацька не меў тут ніякай камяніцы. Проста хадзіў сюды маліцца. Хоць Марцін і не ўпэўнены ў гэтым. Бацька асіраціў яго, калі Марціну споўнілася семнаццаць. Пахаванне бацькі было акурат у дзень яго народзінаў. Памяць пра Вільню бацька, аднак, здолеў яму прышчапіць настолькі моцна, што, прыехаўшы сюды першы раз, адчуў, што нібыта ведаў усе гэтыя вулачкі. Вільня - гэта атмасфера горада, дзякуючы якой людзі робяцца яго часцінай, як бы дадаткам да краявіду. Ягоныя сустрэчы з сучаснымі жыдамі пацьвярджаюць у ім горкую рэфлексію, што многія спрабуюць дапісацца да гісторыі, бачачы ў гэтым неблагі бізнес. Жыд - гэта не нацыянальнасць, гэта прафесія. Жартуе, тут жа дадаючы, што гэтак сама ж, мабыць, і з іншымі нацыямі. Сяго-таго я сказала б і пра немцаў з Казахстана ці палякаў у нас у Беларусі. Без аніякіх на тое заслугаў і паняверак прыпісваюць сабе іншы лёс. Ставяць у лесе манекены ці статыстаў на прадстаўленне старцам, спрагненым вяртання сваёй маладосці. Ён прызнаў маю рацыю і тут жа давай тлумачыць, што сам сюды наязджае з рэальнымі інтарэсамі, што ён ніякі не магільны партрэт сваіх продкаў. Я перапрасілася за занадта моцнае параўнанне. Пасля чаго ён у мяне перапрасіўся, і мы, можна сказаць, пачалі выдурнівацца ўзаемным какецтвам, калі Марцін запрасіў схадзіць на неблагое піва ў джаз-клуб непадалёк ад дамініканскага сабора. Павяло на сутонне. Ён узяў маю сумку. Я не пярэчыла. Узяў маю далонь. Не

пратэставала. Было ў ім столькі цяпла, што я не мела сілы ставіць якую б там ні было заслону, якая магла б мяне абараніць ад неспадзяванай атакі невядомых мне жывёлаў з боку чужога пажылога мужчыны. Я адчувала, што гэта не я, а ён мае перавагу ў нашай гульні. Я згаджалася на ўсё, інтуітыўна не прымаючы ніякай небяспекі.

У клубе мы пасядзелі тры-чатыры гадзіны. Выпілі мора піва. Выкурылі масу папяросаў, і я нагаманілася, часам перакрыкваючы настырны саксафон маладога летувіскага музыкі, які высільваўся перакласці амерыканскія стандарты на мяккую, свістучую мову летувіскіх балтаў.

Калі я зарыентавалася, што падпірае час, мы заспяшаліся праз горад ў бок вакзала, не хацелася браць таксі. Дамчаліся да вуліцы Нямецкай, і тут мне прыспічыла - далося-такі тое піва. Дзе тут забягач? У кавярню. Туды, дзе пазнаёміліся. Позна. Жвавым подбегам шыбуем у бок Вострабрамскай. Кавярня ўжо зачынена. Марцін прапануе заскочыць да яго ў гатэлік. Іншага выйцся няма. Ідзём да яго. І ўжо седзячы на ўнітазе, поўная свабоднай палёгкі, пачынаю ўпадаць у шчаснасны морак сваіх жаданняў. У ваннай пах ягонай касметыкі. Добрая марачная касметыка. Абапал клазетнай ракавіны параскіданы «Wall Street Journal». На падлозе - бялізна. Прыемнае бязладдзе пахне стабільнасцю і заможнасцю. Апускаюся ў змрочную і вільготную памяць самых прыемных хвілінаў з мужчынамі, якіх мела. Сяджу на ракавіне і не карціць мне выходзіць. Марцін ветлівенька стукаецца ў дзверы і пытаецца, а ці добра я пачуваюся, а ці нічога мне не далягае.

Калі я выйшла, ён наліў чарговую шклянку піва і запрасіў уладжвацца ў фатэлі каля вялікай лямпы на падлозе. Абое заўважылі ў сабе агонь, які знерухоміў нас і паволі растапіў.

Я не пратэставала, калі ён пацалаваў мне ў далоню. Спярша далікатна, вакол запясця, пасля адкрытую. Закалыханая цёплымі дакрананнямі ягоных губоў, я глыбей апускалася ў фатэль. Беглі хвіліны, мінуты, я гладзіла яго лысаватую галаву, твар, шыю. Ён вадзіў языком па маёй далоні, вільготна пранікаючы паміж пальцы. Нарастаючая прыемнасць падказала мне ўстаць. Мы пачалі цалавацца. Моцна, жарасна, пры вірлівай лямпе на стале, абапіраючыся на дзверы, сцяну, натыкаючыся на канапу, падаючы на ложак. Слабеючы і калышучыся ў абдымках, папераменна ляжалі, кранаючыся целамі. Ён не рашаўся раздзяваць мяне. А я пасля столькага піва раптам адчула санлівасць, дабраць. Запала ў кароткую дрымоту. Колькі гэта магло доўжыцца. Пяць хвілін, паўгадзіны. Падняла галаву, адзетая лежачы на ложку. Ува мне

было і цяпер узбуджэнне, але разляніўленае, соннае. Марцін сядзеў каля стала. Далікатнае, жоўтае святло лямпы выцінала ў пакоі кавалак замкнёнай прасторы, у якой я бачыла толькі яго галаву, далоні, кнігу і нататнік. Ён штохвілі адрываўся ад чытання, хапаўся за пяро і запісваў нешта ў нататніку.

Паглядзеў на мяне, правяраючы, ці сплю я. Я ўсміхнулася. Ён устаў, падышоў да ложка, падсеў, беручы маю далонь. Мне падабалася яго далікатнасць. Калі мы зноў пацалаваліся, я ўжо была гатовая на большае, чым да таго. Расшпіліла яму кашулю і, лежачы на засланым ложку, гладзіла яго валасатыя грудзі. Ён падвёў далонь мне пад блузку, расшпіліў станік і дабраўся да напятых саскоў. Далей ужо пайшло хутчэй. Раптам, самі здзіўленыя развіццём падзеяў, мы ўбачылі свае голыя целы. Я працягнула руку да сумкі па прэзерватывы. Дастала ўпакоўку і, калі пачала адкрываць яе, гледзячы на ягоны ўзбуджаны чэлес, раптам абое выбухнулі смехам. У маёй далоні замест прэзерватыва была вялікая круглая таблетка аспірыну.

Смех ужо не пакідаў нас да канца. Пацешнае здарэнне змяніла сур'ёзнасць сітуацыі, надаўшы ёй дадатковага шарму. Гэта не быў секс. Гэта не былі зносіны мужчыны і жанчыны. Гэта была сустрэча даўніх прыяцеляў, якія сваімі целамі апавядаюць пра ўсе матэрыяльныя і духоўныя лёсы, якія раздзяляюць прастору і час.

Вярнулася ў Менск другога дня з пачуццём споўненасці. Чаканая прыгода з'явілася сама насуперак маім планам і калькуляцыям, а яе памеры далі мне яшчэ больш сілы і павагі да таго роду свабоды, якой немагчыма запланаваць і прадугледзець.

XII

Не ведаю, калі, але я сапраўды закахалася ў яе. І ані блізка не ад сексуальнай пацягі. Секс быў калі не дадаткам, дык усё-такі недзе на ўзбоччы. Імпанавала мне яе незалежнасць, упэўненасць у сабе. Выбірала я ў ёй асобу цвёрдую, хоць і бачыла яе няўпэўненасць, комплексы і слабасці. Апроч таго яна духоўным гартам і як бы з разбегу - галавою наперад - не траціла ў гэтым брутальным свеце ніякіх рысаў далікатнай і ўражлівай істоты. Яе прыгажосць была пацверджаннем гэтай змяшанасці рэчаў і з'яў. Дробны смуглы твар, далікатная скура, лагодныя рысы вуснаў, носа і абрысы вачэй. У вачах цеплыня, аптымізм, радасць і зычлівасць да свету навокал.

Прыглядваючыся да яе вачэй, я быццам падала ў студню, у глыбіню яе неакілзанай натурыстасці. Як ахінутая чыстай крыніцай, поўнай жыўнаснай сілы і неабмежаванай свабоды. Брала мяне такое пачуццё, якое даецца кожнаму закаханаму, калі ён уздольніцца гадзінамі ўзірацца ў твар і ў вочы каханага.

XIII

каханне
вывяраю яго
як падкіданне крышталёвага шарыка
каб не схапіць лішне моцна
і не раздушыць
ад мяне да цябе
ашаламляльна поўны пералёт
ад мяне да цябе
а ў тым пералёце спасцігаеш раптам
буфер паветра
подых космасу
як жа цудоўна мякка
вяртаецца шар
убіваючыся
у клуб майго цела
гэта як распусканне
у прасторы і паветры
у космасе тваёй душы
без страху
вяртанне шара як нараджэнне
можна сябе загубіць
у поўным нутры
вільготнай бяспекі
чарговы подзьмух ужо без кахання
і пакуты
толькі ў зачараванасць і радасць
вяртаемся так да сябе падкідаючы крышталёвы шарык
з мяне з табою ад цябе да мяне
бясконцае перапаўненне каханнем
нацягненыя паміж двума полюсамі космасу
адчуваем поўніцу ў хвілі пералёту
крышталёвага шара
полюсы таго самага космасу

XIV

Яе вобраз я нярэдка параўноўваю з беларускім краявідам. Такі спакойны, монахраматычны пейзаж з карцін Бялыніцкага-Бірулі. Калі-нікалі смех разбірае, - як гэта беларусы, выйшаўшы з багнаў і займаючыся асушэннем тэрыторыі пад будучыя гаспадаркі, не падбалі пра структуру свайго грамадства. І яшчэ не-не ды выдурніваюцца ў досціпах, расказваючы, як Пан Бог, стварыўшы прыгожы беларускі ландшафт і рахманых, памяркоўных людзей, прыйшоў да высновы, што ўсё гэта ці не занадта шыкоўна. І даў ім прэзідэнта, які псуе, што толькі ў рукі возьме. Апошнім часам баюць таксама, як іхні Лукашэнка спадобіўся гонару разам з Клінтанам і Ельцыным паўстаць перад абліччам Бога і даведацца, што праз месяц грымне канец свету. Ельцын і Клінтан вярнуліся ў свае сталіцы і абвясцілі народам, што блізіцца канец свету. А Лукашэнка найперш пахваліўся, што быў прыняты самім Панам Богам, пасля сказаў: «Буду правіць вамі да канца свету».

Але па сутнасці гэтая краіна - пануры закутак віславухага, вільготны і журботлівы.

Яна заўсёды дадае, што, без гор, няшмат чым адрозніваецца ад расчараванай Ірландыі. Дарэчы дадам, што ірландцы дапялі ўсё-такі да вясёлых пабаў з выдатным півам.

Тады яна зацягвае мяне ў «Ракаўскі бровар».

Там, схіліўшыся над куфлямі, услухоўваемся ў шматмоўны гоман - то польскі, то расейскі. Ламанай ангельскай нейкі палітык даводзіць заходнім дыпламатам, што нешта тут можна-такі зрабіць. А яны, слухаючы, недаверліва хітаюць галавою.

Калі ж я хацела вярнуцца да апісання беларускай флегматычнасці, яна фыркнула, што не дужа я ў такіх рэчах разбіраюся. За іх спакойнай натурай - камуфляж. Кожны селянін, не мусова беларускі, гэта чалавек, які хавае свае эмоцыі, нават калі шчыруе, дык знехаця. А між тым за гэтым бушуюць бурныя буры і жарсці.

Заўважыўшы цень іроніі ў куточку маіх вуснаў, яна сарвалася з лаўкі, грукнула аб стол пустым куфлем і запрасіла мяне зараз жа з'ездзіць да аднаго мастака.

Мы выйшлі з рэстарана, азіраючыся, каб злавіць якое аўто. Яна стала на краі тратуара і, махаючы рукою, спрабавала спыніць машыну. Мяне больш не здзіўляе, што лавіць з тратуара прыватную машыну - гэта тут як бы звычайнае скарыстанне паслугі. Нават калі гэта дзяўчына ў кароткай спадніцы, якая

познім вечарам вяртаецца дамоў, вадзіцель не падумае пра яе як пра прастытутку. Проста спыніцца, падсадзіць, давязе да дома, возьме з яе колькі там «зайцаў» і будзе мець у салоне на некалькі хвілін моцны пах дзявочай касметыкі. Вядома, не выключаны і іншыя варыянты, але ж такое можа стацца ўсюды.

Тым разам на вуліцы не было задужа людна. Стаім і нічога. Тры цёмныя мерсэдэсы з пярэднімі коламі на тратуары з нявыключанымі рухавікамі. За прыцемненымі шыбамі ледзь можна разгледзець маладыя мужчынскія голеныя твары. Усімі сваімі паводзінамі і выглядам яны будзяць падазрэнне. Зрэшты, можа тут такі стыль, але я стараюся не садзіцца ў такія машыны.

Мы пайшлі ўніз убок Нямігі. Яшчэ цішэй.

Яна прапанавала мне перайсці на другі бок вуліцы і спусціцца ў метро. Мінулага года ў гэтай падземцы загінула паўсотні маладых людзей, затаптаных у панічным ціску пасля майскага канцэрта пад адкрытым небам. На сценах парасклейваныя картачкі з іх прозвішчамі, закапцелыя ад свечак гранітныя халодныя пліты, на якіх задушаныя і спляжаныя твары маладых дзяўчат упісалі свой апошні крык альбо ўздых роспачы.

Калі мы праходзілі міма гэтага трагічнага месца, яна расказала мне, што гісторыя горада пачынаецца з вялікай бітвы на Нямізе. Славянскія войскі сцяліся ў бойцы са славянскімі. Полацак, Кіеў... Няміга са спакойнай рэчкі ператварылася ў крывавы паток. Гісторыя горада пачынаецца з крыві. Цяпер тут няма ракі, засталася толькі назва. Дзесьці пад вуліцамі бягуць каналізацыйныя трубы з брудным струмянём, які ўпадае ў Свіслач.

XV

Праехалі некалькі станцый метро. Я не ведала, куды яна мяне вядзе. Да нейкага мастака, пажылога чалавека - як мне сказала - з вялікім творчым набыткам і майстэрняй, запоўненай рознафарматнымі палотнамі.

Мы ўвайшлі ў лесвічную клетку. Дом пабудаваны выключна для творчай інтэлігенцыі, у сямідзесятых гадах. Заслужаныя майстры СССР атрымлівалі тут студыі, спраектаваныя заслужанымі архітэктарамі і пабудаваныя заслужанымі будаўнікамі. Як добра было ў тым камунзіме... Адабралі ў іх ужо складзены і ясны свет прывілеяў, раздаваных шчодрай рукою партыі.

Натыкаючыся на розныя рэчы, падыходзім да ліфта. З яго ў чарговы цёмны калідор, неміласэрна застаўлены закурэлымі рэчамі рознай велічыні, пра прызначэнне якіх цяжка сказаць нешта пэўнае. Можа, гэта з рамонтнага рыштунку, можа, незакончаныя скульптуры.

За ашклёнымі дзвярыма прыцьмёнае святло лямпаў. Позні вечар і майстар ужо не працуе. Стаім перад дзвярмі, хвіля засяроджанасці перш чым націскаем клямку. Ён глядзіць на мяне, румянашчокі, - пазнаю Цябе ў сапраўдным мастацтве, закамуфляваным шырмай савецкага выхавання і сарамяжлівых нормаў. Насцеж дзверы. Уваходзім.

Дзмітрый падымаецца з-за вялікага стала. Здымае акуляры і з шчырай прыемнасцю вітаецца з ёю, пасля са мною. Яму каля 75 гадоў. Але не адчуваецца ў ім старасці. Нешта маладое праменіцца з яго цела. Выцірае рукі на жываце аб расцягнены ваўняны світар. Цалуецца з ёю, як бы падкрэсліваючы радасць ад сустрэчы. Даўно не бачыліся. Дакарае, што забылася на яго. Яна апраўдваецца і ветліва і банальна адначасова. Прадстаўляе мяне, як прыклад замежнай цікаўнасці да беларускага мастацтва і як вынік сваёй рэкламнай актыўнасці. Я хуценька перасцерагаю, што не гатовая што-колечы купіць, а інтрыгуе мяне творчасць менскай школы жывапісу ў пасляваенныя гады.

Пачынаем спрэчку - колькі ў гэтым усім расейскай другаснасці, а колькі ўласных дасягненняў. Ён згаджаецца, што Бялыніцкі-Біруля не быў расейцам, а пасля вайны ўскосна

ўспасобіўся выхаваць тут некалькі вартасных паслядоўнікаў. На нейкі момант голас яго завісае, і ён уважлівей прыглядваецца да мяне. Угадвае, што я полька. Але я адразу папярэджваю, што не збіраюся тузацца за Бялыніцкага-Бірулю. Ён мог адчуваць сябе як беларусам, так і палякам. Пагаджаемся, што не быў расейцам. Але я не ўпэўненая, што, калі б мела нагоду спытацца пра тое ў яго самога, ці не сказаў бы ён, што адчувае сябе акурат расейцам.

Дзмітрый тупае ў кут майстэрні па вялікае палатно. На шэра-зелянкавым фоне раскінуўся сонны пляскаты пейзаж са звілістай рэчкай, узлессем, скраўкамі пабурэлых восеньскіх лугоў і бульбянішчаў. Чорнае птаства недзе з-за далягляду нясе ў дзюбах грай беларускіх лясоў і палёў.

Я ўсміхнулася ёй, бо мастак як бы пацвердзіў мае папярэднія высновы пра багністых людзей з Палесся, пра спакойны і прыгашаны характар беларусаў, якія маюць выключныя здольнасці да медытатыўнага сузірання настальгічныў краявідаў і з'явішчаў.

Раптам на вочы мне трапляе рэч зусім экзатычная. Рысавыя палі? Што гэта, пытаюся ў яго з недаверам. Бамбукавыя краявіды, тут?

Ён тлумачыць мне, што ў сямідзесятых гадах у часы савецкага росквіту навукоўцы, мастакі, інжынеры выязджалі ў краіны трэцяга свету следам за ваеннымі «дарадцамі» - у Анголу, на Кубу, у В'етнам. Асабіста ён тры гады ў рамках вялікай вылучанасці, як на тыя часы, сядзеў у Ханоі, дзе вучыў в'етнамскую моладзь асновам рысунку ў тамтэйшай мастацкай школе. Прывёз адтуль крыху працаў, крыху больш грошай і агіду да палітычнага нашэсця, паплаціўшыся за тое няласкай партыі. Маляваў залішне крытычна і некаторыя з ягоных працаў былі скептычна ацэненыя ў Маскве нейкімі прапагандыстамі. Уся справа, як мяркуе, загрузла ў інтрыгах, бо на такія паездкі многія мелі апетыт.

Дзмітрый хваліўся апошнімі працамі. Не ўсе яны мне нешта гаварылі. Шмат расейскай манеры. Відаць, проста зарабляе, запаўняючы палотны добра аплачванымі цэркаўкамі, коннымі запрэжкамі на зімовых пейзажах.

Я паглядзела на яе спадылба, нібы хацела сказаць - а ці не казала я табе? Яна толькі ўсміхнулася загадкава - «пачакай, гэта яшчэ не канец».

Натуральна, знаходжу тут і рэчы, маляваныя з унутранай патрэбы. Выцягваю з абапертых да сцяны палотнаў невялікую карціну. Майстэрня, у якой мастак - ці не сам Дзмітрый -

партратуе раздзетую жанчыну. Памяшканне цёмнае, панурае, каб не сказаць камера ў вязьніцы. З карціны відаць патрэба выйсця панад стан матэрыяльнага ўбоства праз кантакт не так з самім мастацтвам, як з атмасферай, у якой мастацтва паўстае.

Тады яна з гордым тварам дастае з-за плячэй павернутае тылам палатно. Ставіць яго перад мною на камодзе. Запальвае дадаткова яшчэ адну лямпу, каб я лепей прыгледзелася да твора.

Сапраўды, нешта неверагоднае ў сваёй нечаканасці. На першы погляд прымітыўны, а, можа нават, і вульгарны акт. Дароднае дамскае цела, ляніва выцягнутае на накрытай белай прастынёю сафе. У калырыстыцы дамінуе чырвоны фон сцяны. Вульгарна? У мяне змяшаныя пачуцці. Карціна, вядома, выклікае эмоцыі. Гэта шокавае сутыкненне славянскай шчырадушнасці і спакою з жахліва разбуханым ў сваёй чырвані фонам навакольнага свету.

Яна мела рацыю. Гэтая карціна не дае прайсці міма. Адразу вярнула мяне да кнігі Ерафеева «Русская красавица», напісанай у канцы васьмідзесятых. Папулярная на захадзе як экзэмпліфікацыя маральна-побытовых пераменаў альбо выварочванне ўжо існуючай каляровасці грамадскага жыцця, насуперак прынятаму альбо афіцыйнаму перакананню, што «у нас секса нет».

XVI

твой зрок
гэта не толькі вочы затоенага звера
гэта ўсё цела
адзетае ў кармазын
альбо на крывава-чырвоным фоне
адцятым ад белізны сцяны
тваё цела
гэта не толькі пажадлівасць занураная ў звярыным упіванні
незразумелы нам агонь
што паліць і нішчыць
надзіць і баліць
ёсць з намі блізка як скура
і дае радасць дотыку
твае клубы
у кармазынавай тканіне
якую скідаю прагнучы хутчэй цяпла
чысціні і асалоды
спакойна
лежачы на сафе глядзіш
і бачу як звяргаеш тыранію
тлуміш бунты
альбо пачынаеш рэвалюцыі
вызваляеш новыя гукі
падбіраеш паэтам словы
усе глядзяць з подзівам
на цуд які за тваім дакрананнем
перамяніць кавалак звычайнай матэрыі
у цяжарнасць і новае жыццё
гэта адзін позірк
у кармазынавым свячэнні
ад якога кожны шалее
увесь час цябе адкрываем
у месяцавай поўні
у хціва ўцягненым дыме папяросы
у ашаламленні вясною
у краявідзе гор пасля дажджу
увесь час адкрываем
пульсуючую кармазынавую

XVII

Я вярталася дамоў. Было ўжо досыць позна. Галава поўная сённяшніх уражанняў і вобразаў - суцэльная галата. І гэта не абавязкова цялесная, эратычная. Адкрылася нешта такое, што падказвае мне інакш глянуць на эратычныя матывы ў жывапісе. Голасць, якую чалавек бачыць перад сабою, калі яго закранае самота і неабсяг матэрыяльнага свету. Вобраз жанчыны, намаляванай Дзмітрыем, увёў у мяне адчуванне важкасці смутку і скрухі ў гэтых людзях. Ад прымітыўнай прывязанасці да іншаземца з Італіі, што лічыцца прастытуцыяй, аж да складанай гульні з асяроддзем, якая палягае на прывычным стэрэатыпе прызвычаек. Вырафінаваная гульня ўяўнасці, якая прыводзіць да ўтойвання пачуццяў, эмоцый, да ўдавання... У кітайскай і японскай культурах гэта даведзена да дасканаласці. Усмешка там - ніякая не ўсмешка. За паклонам не канечне павінна быць пашана. А тут у постсавецкай краіне на ўскраіне заходняй цывілізацыі гэта толькі нязначна датычыцца чагосьці, што ляжыць на памежжы Азіі і Эўропы. Парафраз, матыў, далёкае пазвякванне азіяцкіх эталонаў. Акты Джыота ці Рубенса абапіраюцца на геній адкрыцця, агалення. Яны - акт захаплення прыгажосцю і гармоніяй прыроды. У сучасным мастацтве цела і эротыка - гэта форма апісання. Але ж таксама і агалення. Мастацтва малявання цела ці выяўлення эратычных перажыванняў у заходняй культуры - гэта, аднак жа, адкрыванне чалавека, рэфлексія над ягонай душой. Тут, убачыўшы акт, я мела ўражанне, што Дзмітрый пазасланяў усё. Закрыў. І толькі дасведчаныя, уведзеныя ў таямніцу, такія, як Яна, умеюць паразумецца ў вузкім коле знаўцаў. Як у секце, тайным таварыстве ці ложы. Абое яны прадставілі мне сёння фрагмент гэтага закрытага свету. Але толькі дзеля таго, каб я з пыхай не ставілася да іх плыткай і прымітыўнай эстэтыкі. Каб не заносілася, не задавалася, каб не фігуравалася сваёй вышэйшасцю. Паказалі мне рубчык таямніцы толькі дзеля таго, каб я ўсвядоміла патрэбу ці хоць бы магчымасць гаварыць гэтай мовай, навучылася распазнаваць яе гучанне, адрозніваць граматыку і лад. Каб я ведала, што ёсць фразеалогія, якая грунтуецца на іншай логіцы, дзе дэсыгнат, тое, што азначаецца, закрывае знак, а знак адкрывае толькі ўмоўную частку пазначанага.

Месяц у тую ноч глядзеўся, як пабляклы, надгрызены альбо пагамтаны лімон.

Праходжу паўз платы аднасямейных дамоў. Старыя драўляныя халупы. Даваенная вясковая рэчаіснасць, праглынутая молахам ненажэрна прагнага камунізму.

Марк з восені ў адным такім дамку зняў два пакоі. Я адмовілася ад сваёй кватэры ў цэнтры. Часам шкадую, але гэтая вёска вялікага горада тасама мае сваю панаду. Ранішняе кудахтанне курэй, сковыт кундаляў, мітуслівыя кабеты, па якіх пазнаеш, што гэта не вёска-музей у цэнтры Менска, а яшчэ жывы куточак архаічнай мінуўшчыны і зышласці старасвецця.

Ужо каторы дзень, позна вяртаючыся дамоў, бачу прыгорбленага мужчыну ў куфайцы, які, седзячы пад ліхтаром, перабірае нешта пальцамі на дошцы ці на блясе, пакладзенай на зэдлік. Схаваная ў зелянкавай бруднай куфайцы галава не падымаецца, калі я праходжу. Я і не чапаю яго. Ён заняты, выграбае золата - можа, выбірае чарвякоў, альбо кавалкі слюды з камяністага жвіру. Я не заглядваю на той ягоны стол, хоць сам занятак прыцягвае ўвагу, як таямнічая містэрыя. У той самы час, кожны дзень, у той самай пазіцыі. Прыгорблены, панылы беларускі талерант, які ў шэрай беспрасветнасці месячнай ночы вычароўвае нейкія кавалачкі дастатку.

Уваходжу ў дом, дзе Марк шчыруе на кухні. Ён цалуе мяне, лёгенька кранае за азадак і даверліва пагладжвае, знуджаны па маім целе. П'ем гарбату. Пасля ў ваннай аддаёмся сваім пажадам. Ён ліжа мне і лашчыць, поўны палкай жарсці. Я нахіляюся над краем ванны і бяру яго жылісты чэлес глыбока ў рот. Пасля ён моцна выгінаецца назад, абапіраючыся рукамі на другі край ванны і сцяну. Краем вока бачу ў люстры асалоду на ягоным твары. Мне хочацца па-малому. Марк прапануе мне, каб я змачыла яму твар і галаву. Я ўстаю над ім, і бледнажоўты струмень залівае яму лоб, валасы, заплюшчаныя вочы і злёгку растуленыя вусны. Калі я канчаю, ён падымаецца і языком казыча маё ўзбуджанае, набрынялае і мокрае лона. Я пускаю ваду з душа, і тады ён моцным струмянём жоўтай мачы апырсквае мне лона. Расхіляю пальцамі сорам і адчуваю прыемныя дрыжыкі, калі неаслабны напор яго мачы дражніць клітар. Спрабую ўвесці яго чэлес, але струмень перапыняецца. Моцна цалуемся, крыху тэатральна, драматычна, нібы гэта працягвалася размова пра перажытыя за дзень здарэнні і спатканні, быццам мы рэпетыравалі пасля спектакля ўсе сцэны, жэсты і словы, якія прайшлі праз нас на працягу апошняга дзесятка гадзін.

Мыемся. Ён старанна намыльвае маё цела і спалосквае, адначасова павольна абмацваючы другою рукою кожны

сантыметр маёй скуры. Мые валасы і, калі я, схіленая з галавой пад струмянём вады, змываю ўсю пену, ён уваходзіць у мяне ззаду і асцярожна папіхае маё цела так, што раскалыханыя грудзі канцамі саскоў лашчаць кран і халодны край ванны.

Абое ўпадаем у хвілю манатоннага спазму, які набліжае нас да вяршыні асалоды. Паварочваюся, зноў бяру яго чэлес і кончыкам языка даводжу яго да эякуляцыі. Перша моцны ўдар спермы прымаю ў вусны. Пасля рэзка вымаю, і чарговыя кроплі белай плазмы ападаюць мне на губы, нос, лоб і валасы. Тулю яго мужчынскасць да твару, нібы хочучы прыхіліцца да нутра асалоды і ўвайсці ў рытм спаду ўзбуджэння.

Яшчэ хвіліну мыемся, спалоскваючы сляды раскошы і рэшткі мыла. Марк выцірае мяне свежым ручніком. Выходзіць, калі я яшчэ ўбіраюся і расчэсваю валасы.

Пазней я стаю ў дзвярах пакоя, поўная прамяністай разрадкі. Ён ставіць нактурны Шапэна. Кладзёмся поруч, і толькі тады пачынаю расказваць яму пра ўражанні з майстэрні Дзмітрыя.

Ён усміхаецца з маіх бабскіх фліртаў, а я пераконваю яго, што тое, што сёння дзякуючы Ёй я пабачыла, адкрыла мне вочы на сілу эмоцый, у якіх раней зусім не разбіралася.

Відаць, пад канец гэта яго зацікавіла. Нейкая блізкасць паміж выклікам, парнаграфіяй і адкрываннем найменш вядомых закуткаў чалавечай псіхікі.

Пасля, ужо засынаючы, напаў на думку, каб мы купілі тую карціну. Я падклала руку пад ягонае плячо і, тулячыся да раскалыханых валасатых грудзей, апусцілася ў глыбокі сон.

XVIII

Яна патэлефанавала мне з самага рана, у самы непрыстойны час. Працiраю вочы. Палова восьмай. Але ж і здароўе ў цябе, дзеўка. І хуценька пахвалiлася, што звоніць, уласна, з басейна па тэлефоне калегі. Яны выбіраюцца ў Ракаў. Калегу завуць Віктар, месяц таму назад ён атрымаў грант у Польшчы на пераклад адной з кніг Сэргіюша Пясэцкага.

Памятаю захапленне калегаў па вучобе «Запіскамі афіцэра Чырвонай Арміі», калі я рашыла замахнуцца на «Багам ночы роўныя» і на «Каханка Вялікай Мядзведзіцы». Кніжкі не зрабілі ня мяне грамавога ўражання. Прачытаўшы некалькі самых цікавых раздзелаў, адклала на паліцу. І ўжо толькі калі выбіралася ў Менск, пастанавіла сабе паўтарыць чытанне з пачуцця абавязку перад тым светам, які даўно адышоў і запрапаў. Альбо ж перабраўся на накалькі сот кіламетраў на захад. На іншую граніцу, па іншыя тавары, на іншую кантрабанду і іншыя легенды, ярка расказваныя за багата застаўленымі сталамі.

Я адзелася. Зашпіляючы спадніцу, пацягнулася, сонна адкінуўшыся безуладным целам на ложак, дзе загорнуты ў коўдру прыгнечана енчыў Марк. Пацалаваліся. Пасля чаго я павалаклася на кухню рабіць каву.

Я некалькі разоў праязджала міма Ракава, але ніколі неяк не знагодзілася завінуць туды. Мне заўсёды было цікава, як жа выглядае гэта авантурнае і рамантычнае мястэчка, якое ў трыццатыя гады віравала кантрабандным жыццём.

Гатуючы каву, я спрабавала пераказаць Марку змест буйнага жыццёрыса Пясэцкага, але ён глядзеў на мяне заспанымі вачыма і з недаверам на твары. Думаю, што ў іх у Латвіі цяжка з верай у рамантычныя гісторыі - зладзейскія і разбойніцкія.

Я ўкінула ў свой скураны заплечнік тэрмас з кавай, бутэльку мінералкі, печыва і некалькі яблыкаў.

Глянула ў акно. Пад'ехаў мясцовы «Suzuki», з якога мне энергічна махалі рукамі.

Дарога недалёкая. Пазнаёмілася з двума яе калегамі. Зусім нічым не падобныя. Віктар - вытанчаны літаратар, інтэлектуал і майстар шліфоўкі слова. Андрэй - панурый тып ахоўніка, багаты маетнік добрай машыны і мабільніка. У чорнай скуранцы выглядае як член тыповай «расейскай банды» ці чагосьці, што ў Польшчы з нядомыслу называюць мафіяй.

Андрэй і Віктар - два шчырыя сябры яшчэ са школы, яны трымаюцца лаяльнасці і шануюць розныя вартасці сістэмы.

Яна коратка расказвае, як Віктару прапанавалі пераклад з Пясэцкага, калі ён апублікаваў артыкул у «Фрагмэнтах» пра жыццё малых гарадоў на польска-савецкім памежжы ў трыццатыя гады. Атрымаў на працу салідны грант і поўны захаплення «Каханкам Вялікай Мядзведзіцы» бярэцца за працу. Пачаў са шматразовага наведвання Ракава. Сёння, дарэчы, гэта яшчэ адна спроба пагутарыць з некалькімі старажыламі гарадка. Спроба сягнуць у час, з якім хоча пазнаёміць усіх нас.

Едзем шырокай двухпалоснай дарогай. Віктар паказвае, дзе праходзіла польска-савецкая граніца. Да сёння людзі з Менска, едучы на рыбалку ці ў лес у гэтыя мясціны, з'едліва альбо са смуткам кажуць, што едуць у Польшчу.

Мы з'язджаем з гасцінца на Горадню і Вільню. Лясны пясчаны прасёлак даводзіць да могілак. Віктар просіць Андрэя спыніцца. Выходзім з машыны. Белая капліца і свежа высечаныя дзікія дрэвы і кустоўе. Тлумачыць нам, паказваючы навакол рукою, што толькі цяпер у хвойніку бачыцца рука гаспадара, які як бы вярнуўся сюды праз прорву гадоў. Шмат магіл сярод выносных соснаў пазападала. Чытаю польскія прозвішчы на старых замшэлых камянях.

Віктар праводзіць мяне за капліцу, дзе да сцяны прымацавана пад канец мінулага альбо на пачатку гэтага стагоддзя салідная металічная табліца. Польскія надпісы, польскія прозвішчы. Мне ўспамінаецца падарожжа ў Ніжні Слёнск, дзе я недаўмёна адкрывала сабе чужы, але разам з тым і блізкі свет, які ўжо адышоў, але і пакінуў па сабе шматлікія сведчанні ў гатычных надпісах.

З могілак асфальтавай дарогай кіруем у бок касцёла, куды, як піша Пясэцкі, на нядзельную мшу кантрабандысты наогул не хадзілі перапрашацца ў Пана Бога за многія грахі, хадзілі ж бо, каб проста пафарсіць у новым гарнітуры і прыгледзецца да маладых дзяўчатак, з якімі ўжо папалудні выгульваліся вакол мястэчка.

Раптам з летуценніцкага замроення мяне вырваў нечаканы відок. І толькі Яна адразу змеціла бляск у маіх вачах. Папарадзе нас шыбаваў чорны лімузін - «Масквіч» трыццатых гадоў. На фоне драўляных даваенных дамоў гэта глядзелася як сцэнарый фільма тых часоў. Мы ўсміхнуліся самі сабе, а яна памахала камусьці знаёмаму за кіроўцай. Усё зрэжысеравана? Я жартую, што гэты яе

досціп меў дужа чаго каштаваць. Віктар, відаць, найбольш задаволены, бо нечакана ўсе мы разам апынуліся ў сітуацыі, якое самі хацелі. Чацвёра нас, нібы статыстаў, сталіся часткай краявіду ўжо нежывога пісьменніка. Так, нібы сам Пясэцкі пакпіў з нас, падкраўшыся, як шпіён і кантрабандыст, і нябачна спыніўся за намі. У ягоным стылі.

Потым едзем да Янушкевіча ў саўну. Найперш старамодныя перагуды з Язэпам і яго братам Феліксам, у якога рот не закрываецца і які хваліцца новымі набыткамі з нейкіх раскопаў. Скудзельны посуд, кафлі, фігуркі міфічных звераняў з неіснуючых ужо халуп жыдоўскіх купцоў і рамеснікаў. Потым папіваем самагонку з мясцовых лясоў. Слізка п'ецца ды хутка развозіць. Калі браты Янушкевічы ад'язджаюць, мы застаемся адны ў гасподзе. Даржнік - падворак з зялёным травяністым дзядзінцам замкнуты будынкамі з усіх бакоў. У куце ўжо дыміцца расейская «баня».

Раздзяваемся і ўскокваем усярэдзіну. У гарачай атмасферы поўнай пары і алкагольнага чаду прыгадваем сабе балады і кантрабандысцкія гісторыі. Віктару ў гэтым супернікаў няма.

Крадком паглядаю то на Яе, то на хлопцаў, якія весела ўгоньваюцца вакол стала. Драўляная вялікая расейская лазня ўжо набрала жару, ля сцен велізарныя бочкі з ледзяной вадой з ракі. Настрой і гамонкі неяк успасобілі нас абедзьвюх усё больш і больш збліжацца, нібыта праз дакрананні мы маглі знайсці ўзаемную халодную бяспеку нашым целам. Пазіраю на яе з адценнем фіглярнага запыту, яна на мяне глядзіць замглёнымі вачыма з распаленымі губамі. Бачым сябе ў ролі вясковых дзевак, якіх багатыя спадары кантрабандысты запрасілі на оргію, каб расслабіць стурзаныя нервы і не думаць, што, можа, ужо заўтра, мо, праз тыдзень каторы з іх загнецца ў засадзе на савецкім баку альбо жыўцом гніцьме ў суровай вязьніцы. Яны запрасілі нас, каб мы дакрануліся да іх цяжкай долі і сваімі целамі ўступілі ў садружнасць вялікага грэху.

Яе разгарачаныя вочы патрабуюць, каб я проста задала пытанне - ці была б ты гатовая. Яна згодна ківае галавой. Глядзім на хлопцаў, на іх абвіслыя паміж ног прычындалы. Так. Трэба прыцьміць святло і схавацца ад нечаканых цікаўных раззяваў...

XIX

Сёння першы дзень траўня. «Жалезныя браты» адкрываюць сезон. Палова мірскай моладзі будзе з зайздрасцю назіраць за кавалькадай бліскучых «Harley», «Honda», «Yamaha», што праедуць праз горад.

Я дамовілася, што чакацьму пад Макдональдам а дзесятай, а пасля паедзем у метро да Колі ў далёкі пасёлак.

У бляшаным гаражы Коля разам са сваімі прыяцелямі ўжо шыкуюць машыны на старт. Яна кінула ў мой бок шлем, і я ўжо не ведаю, калі я апынулася на заднім высокім сядзенні аднаго з байкераў. Такіх пасажыраў называюць нажопнікамі.

Шалёная дарога, поўная зласлівых і зайздрослівых вачэй забапал. Дабраліся да Раўбічаў. Алімпійскі цэнтр, прыстасаваны да скачкоў з трампліна з лыжнымі трасамі. Яшчэ дзе-а-дзе на пагорыстай зямлі пляміцца снег. Крыху як у гарах. Хоць ва ўсім гэтым рашуча больш штучнага блізіру.

Калі разміналіся на маторах, я бачыла яе светлыя развеяныя валасы пад шлемам. Усміхалася мне, махаючы рукою і паказваючы нешта вакол сябе.

На ўзгор'і ў Раўбічах Коля спыніў матацыкл каля старога касцёла. Яна сышла з суседняга матацыкла, павярнулася абветраным на травеньскім сонцы тварам да касцельных вежаў. Зрэшты, гэта ўжо не былі касцельныя вежы. На франтонах металічныя дзіды, аздобленыя нейкім савецкім арнаментам. Дабудаваная частка касцёла ўяўляла сабою ўваход у музей.

Яна падала мне руку, каб падцягнуць вышэй угору. З другога боку касцёла цвінтар. Стары каталіцкі цвінтар з беспаралкавым мноствам новых магіл. Праваслаўе ўперамешку з каталіцызмам. Як у прозвішчах, так і выніках пераменаў часу. Касцёл, як відаць з помнікаў, зрабіўся царквою недзе ў другой палове дзевятнаццатага стагоддзя. І апошні праваслаўны святар быў пахаваны ў 1914 годзе. Яго наступнік напэўна не мае ўжо ўласнай магілы.

Ходзячы сярод камлёў і кустоў, знаходзім старыя валуны, уціснутыя сілай часу і забыцця ў цвінтарны грунт. Польскія, расейскія, беларускія прозвішчы. Радца, менскі адвакат, купец, царскі афіцэр...

Ніжэй перад намі цвінтарная дарога ўніз, якою даўно таму назад штотыдня з'язджаліся на набажэнствы навакольныя вёскі.

Мы прыглядваемся адно да аднаго ў гэтым халодным вясновым краявідзе. Зрэдзь часу - да твараў, з якіх так і

прамяніцца неабыякая ахвота да пацалункаў. У такія моманты я лаўлю сябе на глыбока прыхаваным ува мне пытанні, ці Яна напэўна тая асоба, за якую я яе маю. Спрабую тым часам хуценька апісаць тое, што ведаю, каб аддзяліць сутнае ад ілюзій. Поўная жыцця, актыўная, піша, матацыклістка, без комплексаў у справах сексу, чытае Генры Мілера і Біблію з роўным захапленнем, спявае харалы на нядзельнай мшы і балады хрыпатых беларускіх бардаў на дымных і п'яных тусоўках. Што ў ёй наймацней ўражвае, гэта нечаканая рэальнасць гэтага спосабу жыцця і адначасова непрыставанасць да постсавецкага краявіду, поўнага пустой папяровай поп-культуры. Абаяльнасць - гэта яшчэ напэўна ж не каханне. Таму я разбіраюся са сваёй дваістасцю - патрафіць сабе любоўю з Маркам і дацца ўладзе жарсці ў стасунках з ёю. Зусім не з прычыны эратычнай натуры ці оргіястычных інстынктаў. Гэта, можа, бліжэй да зносінаў з *«fascinans»,* як сон дзіцяці, поўны нерэальнай матэрыяльнасці, калі яно, атрымаўшы вельмі жаданы гасцінец, засынаючы ў абдымках, гладзіць, туліцца. Гэта як бы спраўляць містэрыю прыўлашчвання свету і па сваёй волі дзяліцца ім - у яго матэрыяльным вымярэнні.

Я трымаю цяпер яе за руку і не ведаю, ці было б тое праўдаю, калі б прызналася ёй у каханні. Напэўна, мы выбухнулі б смехам, бо гэта толькі частка праўды. Бо ля вытокаў нашай дружбы ёсць адкрыццё чароўных светаў, іх блізкасць і спосаб прыёму матэрыі, адчування, дыхання, сузірання.

Я гляджу на яе распраменены ў халодным красавіцкім сонцы твар. Прымружваем вочы. Шчасце наша, што ўдаецца схавацца ад банальнасці жыцця і што ёсць яшчэ ў нас дастаткова гарту, адвагі і рашучасці, каб дапасоўваць вакольны свет да факту нашага існавання.

XX

Яна запрасіла некалькі асобаў да сябе на хату. Я падыходжу да дзвярэй і чую ўжо гоман усярэдзіне. Гарачая гаворка, павышаныя дзявочыя галасы, фамільярна- грубаваты мужчынскі смех. Званю. У дзвярах адна з яе прыяцелек - Света. Вітаемся, і яна ўцягвае мяне ў самую сярэдзіну забавы. Коля расказвае анекдоты пра новых расейцаў. На тапчане раскошна расклалася, як котка, Аня. У яе ў нагах у пазіцыі лотаса задуменны Віктар. Некалькі дзяўчат, якіх яшчэ не ведаю.

У тытунёвым тумане точыцца музыка Майлса Дэвіса. Хлопцы пацягваюць гарэлку, запіваючы бярозавікам з пяцілітровага слоіка. У дзяўчат у руках шклянкі з чырвоным віном.

Каця распавядае гісторыю сваёй сяброўкі. Яна юрыстка, якой трэба прайсці пераатэстацыю ў пракуратуры. Некалькі месяцаў яна вяла зацяты бой з шэфам раённай пракуратуры, які, як пляткарыць цэлы Менск, мае звычай усіх жанчын, службова яму падначаленых, прапускаць праз свой ложак, у каморцы кабінета альбо на службовым стале. Як дзяўчына прывабная, маладая юрыстка адразу трапіла ў поле яго цікавасці. Спачатку намёкі былі толькі назойлівыя. Пасля зрабіліся агрэсіўнымі і перайшлі ў адкрытую правакацыю і брыдкія славесныя прапановы. Яна адчувала сябе то заклапочанай, то няўпэўненай, а пазней толькі зацкаванай. І тут з яе жаночага цела раптам вынырнула мужчынская прырода драпежніка і чалавека вайны. Яна рашылася на цвёрдую канфрантацыю. Адмова сужыцця - дэманстрацыйная і адназначная - вызваліла ў шэфе агрэсію. Ён на кожным кроку даводзіў ёй, што яна бяздарная няўмека, няздара, і пасада пасля стажыроўкі ёй не свеціць ніякая. З яго сувязямі і магчымасцямі ў Менску такое было верагодна. Але яна рашыла бараніцца. Збудавала цэлую сістэму хітрых барыкадаў і завалаў. Працавала інтэнсіўней, чым яе калегі. Шмат працы забірала дамоў. Сядзела начамі. Некалькі разоў публічна даказала большую абазнанасць у правілах і прадпісаннях, чым сам шэф. Рамкі іх супрацьстаяння, уся арэна бітвы сталася відавочнай усім супрацоўнікам. За яе «балелі» ў гэтым няроўным паядынку, і праз некалькі месяцаў перманентнага стрэсу яна выйграла. Атрымала лепшую пасаду ў больш высокай інстанцыі, а прапановы працы ўжо сягалі па-за магчымасці супрацьдзеяння начальніка. Разышліся як у тыповым амерыканскім фільме. У апошні дзень яна надзела найбольш сексуальна прынадную спаднічку, якую толькі мела, зрабіла кідкі макіяж, надушылася добрай парфумай, якая ўзмацніла яе

правакацыйную ўпэўненасць у сабе. Выходзячы з яго кабінета, яна зведала, бадай, ці не найбольшую ў жыцці эратычную сатысфакцыю. Адчувала на сваіх стацях яго ліпкія і галодныя вочы. Як моцна павінен быў ён высільваць сваю прытупленую лёгкімі здабычамі фантазію, каб усвядоміць, як бы яно тое магло быць, калі б мацаў яе пальцамі.

Аня глядзіць на Кацю, на мяне, на Свету і, размашыста жэстыкулюючы, даводзіць апавядальніцы, што Святлана Алексіевіч, аўтарка «Чарнобыльскай малітвы», якраз піша кніжку пра любоўныя афёры і скандалы ў Менску - ёй мусова трэба прадаць такую пікантную гісторыю.

Яна адчувае, нібыта гэтая аповесць мела быць чарговай крэпасцю альбо помнікам неахаванай цноты большасці ўпакораных і затурканых дзяўчат, якія з наіўнай прастадушнасцю хутка аддаюць сваё цела многім мужчынам, не зважаючы на тое, што шмат каго з іх ад самай хвіліны спаткання і першага цалунка точыць чарвяк знуджэння, борзда паглынаючы найбольш высакародныя парыванні і мары пра сапраўднае каханне.

Аня прывыкла гаварыць нам, што секс - гэта яшчэ не повад для знаёмства. Аднаго разу яна так адрэзала аднаму байкеру, з якім толькі што пазнаёмілася і якому дазарэзу зарупела паўтарыць казачную ноч.

Света перабіла Аню і адказала гісторыяй, як яна не магла адчапіцца ад настырнага хахаля. Яму мала было таго, што яна не прыходзіла на прызначаныя спатканні, што ў канцы сказала яму, быццам спіць з іншым. Ён быў паслядоўны і цвёрда руляваў да мэты. Нарэшце ёй прыйшло ў галаву, і яна патлумачыла яму, што не можа быць з ім далей, бо ўступіла ў рэлігійную секту, якая вымагае ад яе цноты. Падзейнічала. Хлопец уважліва агледзеў яе прамяністыя, радасныя вочы неафіткі і адчаліў.

Гаспадыня кватэры заняла зручнае месца каля Дзімы - менскага барда, які паглынаў мора гарэлкі і спяваў па-беларуску балады ў стылі Высоцкага. Пашарпаны, ахрыплы Дзімаў голас патрапляе ўвесці нязвыклы настрой на любой імпрэзе. Цяпер, зацягваючся дымам танных цыгарэт, ён самазабыўна ёй нешта тлумачыць, для большай пераканаўчасці трымаючы яе за далонь. Нібы хацеў у доказ праўдзівасці сваіх слоў паказаць свае стыгматы на згіне запясця ці на пажоўклых ад тытуню нязграбных пальцах. Я адчула балючы прыступ зайздрасці. Зноў вярнулася да мяне тая хвіля з піццэрыі, калі я старалася ўразумець, у чым прычына такой рэўнасці. Мая рупнасць дала незвычайны плён. Праз нейкі момант, калі яны ў разгары цікавай балбатні трымаліся за рукі, у мяне мільганула подумка, што мне якраз не

хапае менавіта той грубасці, якая яе прыцягвае ў хлопцах. Шмат дзяўчат паддаецца зачараванню, калі яны бачаць дыспрапорцыю паміж духам, інтэлектам чалавека і яго нязграбным, брыдкім целам. Далікатная бабская натура цягнецца да гэтага, як дасведчаны розум да сферы *profanum.* Гэта траха як з павабнасцю сілы каня, калі натуральны пах поту, стайні, дотык грывы і паралізуючая велічыня спрычыньваюць нявысветлены выкід адрэналіну ў арганізме.

Я бачу, як у запале размовы Дзіма прыціснуў яе да сябе і абое выбухнулі гарэзлівым смехам. Я спрабую сіламоц рацыяналізаваць сваю рэўнасць, але марна. Не вытрымліваю і ўстаю, іду на кухню. Выцягваю Віктара на адмысловую размову, каб прыглушыць знерваванасць, якая пачала нарастаць ува мне. Баюся гэтай успышкі ўнутранага разладу, бо часам яна ўвасабляецца ў форму асавелай дзяўчынкі-падлетка, узбунтаванай, але напружана прыціхлай. А ў такім стане я не люблю сябе яшчэ больш.

Віктар, мабыць, зразумеў мой узважаны гумар, але з размовы я зрабіла сабе выснову, што ён думае, быццам гэта я хацела быць з Дзімам і мая ўдаваная задаволенасць - толькі эфект звыклай гульні дзвюх дзяўчын на хлопца. Такая здагадка развесяліла мяне. Я дазволіла Віктару пацешыцца, калі ён пачаў знеахвочваць мяне да Дзімы, нядбала махаючы рукою, даказваючы, што гэта стары балбатун, круцель-муцель і прыброд без роду і племя. Сапраўдны расейскі бомж, валацуга і алкаш, якога немагчыма не любіць, але з якім трэба трымацца пэўнай дыстанцыі. Дзіма сам з Новарасійска, бацька яго быў вайсковец, прысланы ў Баранавічы на службу. Тут Дзіма скончыў школу, паступіў вучыцца ў Менск і на хвалі нацыянальнага адраджэння перайшоў на беларушчыну. Паслядоўна патрыятычны беларускі расеец. Гэта гучыць ідыятычна, але я з ім згаджаюся, што сама па сабе з'ява нагадвае сіроцтва, пры якім больш заходзіцца пра патрэбу асталявацца ў прасторы, якую мы самі сабе выбіраем. Віктар расказвае яшчэ падобны прыклад - у БНФ ён ведае аднаго такога зацятага патрыятычнага беларускага армяніна, які на ўсіх дэманстрацыях ідзе ў першых шэрагах з беларускім сцягам.

Я закурыла цыгарэту, што здараецца ў мяне досыць рэдка. Віктар з запалам расказваў яшчэ пра калатню ў Саюзе пісьменнікаў. Праз хвіліну мы вярнуліся ў пакой, дзе ўсе ў падагрэтай атмасферы і ў змроку ўгаворвалі Дзіму паспяваць. Той пацягнуўся па гітару і ўсіх раскалыхаў моцнымі, гучнымі баладамі пра свае беларускія сцежкі і сяброўствы.

Я бачыла ў яе вачах зачараванасць Дзімам. Можа, мне было

прыкра не з зайздрасці, а хутчэй з той прычыны, што я зразумела, - гэты неахайны бард не варты яе дружбы і пакланення.

Калі пад поўнач імпрэза прыгасла, я патэлефанавала і заказала таксі. Прыехала дамоў, дапіла на кухні са шклянкі рэшту піва. Доўга сядзела ў ванне, збіраючы думкі пра Яе. Не магу сабе вытлумачыць, адкуль выцякае крыніца майго захаплення Ёю. Накінула на разагрэтае і мокрае цела фланелевую начную кашулю. Увайшла ў цёмны пакой, дзе ў цёплым ложку знайшла разаспанае, сонннае цела Марка.

XXI

На другі дзень я ішла міма каталіцкай катэдры ў Менску. І нечакана ўявіліся мне розныя вобразы з яе і майго жыцця, якія акурат у той момант спляліся на аснове асацыяцый, што паўставалі з паху, формы, святла... Была свежая, здаровая раніца, каля французскай амбасады чарга людзей па візы. Распускаецца зелень, чыноўнікі спяшаюцца да сваёй офіснай гультайшчыны.

Валакуцца па магазінах бабы, з яркімі ранцамі за плячыма падскокваюць дзеці. На краі тратуара ловяць мжаку распырскванай палівачкай вады і льснянай нізка над асфальтам вясёлкі. Цыгаюць цераз струмяні і мокрыя з гуллівым галёканнем высокваюць на свежа адпрасаваныя штаны кадэбістаў, якія спяшаюцца на працу, ці на пракураўраў з нэсэсэрамі.

Вясновы гумор вярнуў мяне ў час, калі я здавала экзамены, і цяпер, праходзячы міма катэдры, я ўспомніла, як колісь перад школай забягала ў касцёл.

Я павярнула і зайшла ў халодны бабінец катэдры. Перажагналася і рашыла з хвіліну памедытаваць, выклікаўшы з глыбіні душы добра знаёмыя прыемныя асацыяцыі, якія ў ліцэйскія гады акрылялі і давалі надзею на скарэнне свету. Чаму касцёл так моцна асацыіруецца намі з занядбаннем цела і ўсёй яго змрочнасці?

Калі ў адзін снежаньскі вечар я зацягнула яе ў катэдру на канцэрт латышскага хору, яна расказала мне гісторыю свайго ўпадабання да каталіцызму.

Я здзівілася, што яна не ўхваляла сваіх праваслаўных каранёў. А можа, гэта не толькі выбар, можа, нейкае вяртанне. Да той традыцыі ў сям'і, якую паспяхова шмат гадоў з яе выціскалі. Яна прызналася мне тады, што, хоць мала моліцца і рэдка заходзіць у касцёл, але тут у каталіцкай катэдры пачуваецца лепей, чым у царкве. Калі хадзіла ў апошні клас сярэдняй школы, з класам паехалі на экскурсію ў Нясвіж. Там настаўнік неафіцыйна і па-за праграмай завёў іх у мясцовы касцёл. У старадаўнім памяшканні яна першы раз убачыла ксяндза ў сутане, старэйшага пробашча. Яны агледзелі крыпт з трунамі і парэшткамі Радзівілаў. Гэта быў для яе сапраўдны цывілізацыйны шок. Дакранулася да свету, які сядзеў у ёй недзе глыбока падыспадам, як сум па стагоддзях і вяках, як вернутая памяць, як працяг забытай легенды. Нягледзячы на страчаную здольнасць некалькіх тутэйшых пакаленняў да камунікацый з продкамі і іхняй гісторыяй, нешта немінушчае, вечнае нагадвае, што

незалежна ад знешняй часовасці і праху мінулых шчэнтаў, замкнутых у цынкавых дамавінах, нехта і далей пануе і ёсць прысутны. Гэта не толькі княскія радзіны, але і намацлівае адчуванне сапраўднай гісторыі прывяло яе да рэлігіі.

Яна рашыла праз некалькі тыдняў вярнуцца ў Нясвіж адной, каб мець час на нешта, для чаго яна не знайшла таго разу ніякага наймення. Прыехала на пачатку вакацый і спатканаму раней на школьнай экскурсіі старому ксяндзу без лішняга роздуму прызналася, што хоча ахрысціцца. Ксёндз даў ёй катэхізм, сказаў навучыцца ісцінаў веры і прыехаць праз два месяцы. Яна старанна вывучала ўсё падчас вакацый, нарабіўшы сенсацыі на ўвесь дом. Маці з праваслаўнай сям'і і няверная камуністка напачатку незадаволена крывілася. Затое бацька, якому раптам успомніліся з дзяцінства бабуліны каталіцкія малітвы, глядзеў на яе самастойны выбар з кепска прыхаваным подзівам.

Хрост адбыўся 15 жніўня, і вярнулася яна пасля яго шчаслівая і акрыленая, нібы нарадзіўшыся для новага жыцця. Аднак пазней захопленасць прытухла, калі яна аднаму ксяндзу наіўна адказала на пытанне пра кантрацэпцыі і адносіны з жанатым мужчынам. Ён прагнаў яе са спавядальні, і яна на некалькі гадоў паспяхова забылася пра свае рэлігійныя патрэбы.

У той снежаньскі вечар яна прызналася мне, што ў яе жыцці з'явілася нешта накшталт тугі, перамяшанай са страхам нерад Нічым. Назойлівая думка пра недахоп асноваў у жыцці схіліла яе да размовы з ксяндзом, які выйшаў за рамкі літургічных фармулёвак і мала што не прымусіў яе да споведзі, якая закончылася адпустам грахоў. Калі яна расказвала мне пра гэта, мы якраз ляжалі ў ложку, і я недаверліва спыталася, ці не расказвала яна ксяндзу таксама і пра наш грахоўны цялесны саюз. Яна пырснула смехам і сказала, што я дробязная.

Так, яна мае рацыю, але не ведае, як у нас у Польшчы ксяндзы ўмеюць утаптаць інтымнасць у сямы сяродак споведзі. Мая прыяцелька аднаго разу выбралася ў Чанстахову і расказала, як ксёндз задыханым голасам выпытваў у яе ў канфесіянальнай будцы пра ўсе падрабязнасці анатамічных зносінаў. Калі настырнымі пытаннямі ён дачлапаў да самага аргазму, яна выліла яму шчырую праўду, што любіць глытаць сперму. Ён там за краткамі бурчаў і не верыў, але калі яна ўжо з іроніяй і як бы на злосць закінула пра анальныя фігурацыі, ён бязрадна ўздыхнуў і замоўк. Яна падумала аж, ці не самлеў небарака. Заглянула да яго ў канфесіянал, каб пераканацца, што яшчэ жывы. Ён толькі

міладушна ўсміхаўся і тэатральным шэптам папрасіў, каб выйшла з касцёла. Пры гэтым бездапаможна махаў рукамі, як купец на рынку, паказваючы, што ўжо аніяк больш не можа нічым паступіцца ў цане.

Яна тым часам тут у Менску сустракае талеранцыю, якая заходзіць так далёка. Аж мне верыць не хочацца. Мусіць, нафантазіравала на агульнасцях і недамоўках. Рыхтык, бы ў царкве.

XXII

Пасля я сустрэлася з Віктарам, які запрасіў мяне ў кавярню. Сядзім, забаўляемся рознымі пагудкамі, аж тут Віктар успомніў, што яго запрасілі на літаратурную канферэнцыю. Прапанаваў мне пайсці з ім у «Цэнтр Францішка Скарыны». Гэта непадалёк.

Заходзім у стары паўразвалены дом бліз цэнтра, усярэдзіне пах гнілізны і плесні. Дошка ў калідоры горда азнаямляе, што гэта сусветны цэнтр беларусістаў. Але сусветнае ўражанне робіць на мяне толькі прафесар Мальдзіс. Нізкі, сівы мужчына з квадратным тварам, дасканала дапасаваным да прафесарскіх акуляраў. Гаворыць, шапялявячы, але бярэ слухачоў сваёй добрай беларускай і тым, пра што гаворыць. Я пад вялікім уражаннем ад гэтага чалавека. Ягоны выступ завяршае канферэнцыю. Праз хвіліну ў гармідары цыцастая Люба, гаспадыня гэтага храма навукі, згортвае са сталоў паперы і камандуе, дзе паставіць талеркі з не дужа эстэтычна пакроенай садавінай, хлебам і каўбасой.

Выпілі па кілішку, і атмасфера перастае быць напятай і навуковай. Я слухаю Мальдзіса і ягоныя ўспамінкі пра Караткевіча, славутага беларускага пісьменніка, з якім Мальдзіс некалькі разоў пабываў у маім родным Кракаве. Некаторыя параўноўваюць Караткевіча з Крашэўскім, з той розніцай, што беларускія старажытнасці сягаюць часоў выбарных каралёў, ад Батуры да Панятоўскага, павязаных рамкамі гісторыі Горадні. Кракаў па-ранейшаму застаецца для іх месцам традыцый, нейкай мерай, сімвалам, кропкай адліку. Таму яны з такой ахвотай ездзілі туды ў семідзесятых гадах на розныя літаратурныя ды філалагічна-гістарычныя канферэнцыі. Потым, напэўна ж асобна, пісалі даўжэзныя справаздачы ў КДБ. Кожны асобна і ўпотайкі ад другога. Можа, у пэўнай ступені менавіта таму Караткевіч і дапіўся да смерці. А цяпер, калі я гляджу на Мальдзіса, як ён спрытна куляе чарговы кілішак прыгатаваных налівак, дык бачу, што так яно і мае быць. Беларуская меланхолія ўкідае чалавека ў абдымкі запалу, які вызваляе ад жалю, смутку і манатоннасці.

Мальдзіс расказвае, як аднаго разу Караткевіч канечне хацеў правесці ноч на вежы Марыяцкага касцёла. Узяў туды з сабою некалькі пляшак беларускай гарэлкі і цэлую ноч бяседаваў з сігнальшчкам-гэйналістам, забаўляючы таго гістарычнымі расказамі. Абодва, здаецца, пад раніцу заснулі на падлозе. Як сцвярджае Мальдзіс, першы раз у гісторыі гэйнала на другі дзень раніцай у Кракаве не гучаў сігнал славутай трубы. Прафесар,

аднак, не мог сказаць, ці звольнілі таго гэйналіста з працы, як сянкевічаўскага лятарніка.

Расказаў ён таксама гісторыю, як на Караткевіча напусцілі цыганку, каб яна яму наваражыла, што ён будзе вялікім пісьменнікам. Колькі ж бо грошай марна ўбухаў тады шакіраваны Караткевіч? Альбо як ён уцягнуў у забаву выпадкова сустрэтую расейку ў бібліятэцы Чартарыйскіх. Падбухторылі яе, каб падышла да Караткевіча, які чакаў пад помнікам Міцкевічу і голасам агенткі з Масквы папыталася, што ён тут вырабляе, навошта, каго чакае і каб заўтра ж явіўся ў савецкае консульства для дачы дадатковых тлумачэнняў. Мальдзіс назіраў за ўсім гэтым з кавярні ў Сукенніцах і выскаляўся, а будучы беларускі прарок зелянеў і чырванеў ад прыкрасці і страху.

Апошнюю гісторыю прафесар, пасёрбваючы налівачку, акрасіў доўгім уступам, як тое яны ў гатэлі «Cracovia» сядзелі разам з Караткевічам, побач сюд-туд лётала ладная афіцыянтка, кідаючы ў іх бок пагардлівыя позіркі. Ацэньваючы іх па сціплай вопратцы, яна больш гарнулася да заходніх турыстаў, амерыканскіх палякаў альбо блішчастых ад ПНРаўскай мішуры мясцовых увішных шалахвостаў. Яны пастанавілі адмысловым спосабам адпомсціць ёй. Наступнага дня раніцай сам Мальдзіс каля століка заказаў у той самай маладзенькай і павабнай афіцыянткі каву і як бы між іншым даверліва завёў, што, бач, мае пэўную праблему. Бо вось праз некалькі гадзін прылятае з Амерыкі яго стрыечны брат, які атрымаў у спадчыну вялікае ранча ў Тэхасе. А ён яму абяцаў знайсці жонку і будучую гаспадыню на тую спадчыну, але вось нічога ніяк не клеіцца. Афіцыянтка ўлёт скеміла, што можа надарыца не абы якая аказія, і калі абодва з элегантна апранутым і гладка паголеным Караткевічам увайшлі падвечар у кавярню, яна не спускала з іх вачэй. Ветліва і вельмі міла абслугоўвала. Усміхалася, ліслівіла і падавала знакі, што ахвотна пагутарыла б з госцем сам-насам. І ўсё павялося б добра, калі б Караткевіч не забыўся, што павінен гаварыць не з расейскім, а з амерыканскім акцэнтам. Асабліва, калі пасля некалькіх кілішкаў вылушчыўся і сыпануў па-беларуску паэмамі - сваімі і класікаў. Нягледзячы на тое, што афіцыянтка страціла цікавасць і ўжо не вельмі разбіралася, пра што там ішлося, Мальдзіс стаяў на сваім, што забава атрымалася класная.

А на мяне адразу насунулася подумка, што нават калі гэта гісторыя праўдзівая, дык напэўна прыадкрывае толькі тыповыя комплексы. Калі мы з Віктарам выйшлі з Цэнтра, я падзялілася з ім сваімі меркаваннямі. Ён часткова прызнаў маю рацыю. Так, ёсць нешта ў вас, паляках, пыхлівае і адпіхлівае. Пагардлівасць, фанабэрыя і ігнарванне «расейцаў», асабліва, калі

дэманстрацыйна не разрозніваюцца нацыянальнасці ў велізарным савецкім мяху. Але ці вашая ў тым віна, ці нашыя комплексы? Цяжка разважыць. Тут Віктар, аднак, успомніў адну гісторыю, якая пацвярджае маю думку. Ён быў сведкам, як прафесар Мальдзіс некалькі разоў дапасоўваў свае расказы да кампаніі, у якой быў. Аднаго разу на адкрыцці выстаўкі жыдоўскай кнігі ён пачуў Мальдзіса, які кроіў зграбную легенду пра беларуска-жыдоўскую кааліцыю супроць варожых ляхаў. Сцвярджаў, што Францішак Скарына за грошы беларускіх жыдоў выдаў у Празе Біблію, перакладзеную на сваю родную мову, наперакор палякам. Колькі ў тым праўды, а колькі інтэрпрэтацыі, цяжка сказаць, але легенда зграбная.

Я ўжо й не ведаю, што ён расказваў сваім польскім знаёмым на тых канферэнцыях у Кракаве. Як праўдзівы гаварун ён мае шмат розных версій розных гісторый...

У сваю чаргу, у такіх сітуацыях мне пастаянна прыходзіць у галаву акрэсленне ўласцівага псіха-нацыянальнага сіндрому - краіна-партызанка. Нішчаныя і плюндраныя рознымі акупантамі беларусы навучыліся вельмі глыбока хаваць свае погляды, у тым ліку розныя комплексы і сантыменты. Ніколі не можаш быць пэўны, ці за знешняй адкрытасцю і шчырасцю пры бутэльцы гарэлкі не стаіць чарговая маска, уцёкі ўглыб. У недаступныя заканаркі, балоцістыя лясы, нетры, тарфянішчы, у замглёныя лугі і пушчы Беларусі.

Віктар слухаў мае словацечывы, моўчкі ідучы поплеч. Я расказала яму пра сваё ўражанне ад спаткання з Дзмітрыем і яго партрэтам голай жанчыны. Цела на белай прастыні, на фоне чырвонай сцяны. Нібыта ясна і выразна. Нібыта шчыра і адкрыта. Але гэта толькі мімікрыя, уражанне. Замаскаваны і глыбока схаваны свет, які немагчыма лёгка і проста апісаць і спазнаць.

XXIII

Калісьці выпадкова я дасталася ў самае нутро яе змрочнай натуры, прорву, поўную выбуялай эротыкі, жаданняў і двухсэнсавасці. Сярод кніг я натыкнулася на аматарскі здымак голага мужчыны. Паклала яго на пісьмовы стол, не падазраючы, што гэта яе ўласнасць. Яна, заўважыўшы маю цікаўнасць і, можа, нейкае пытанне ў вачах, усміхнулася. Ні пра што не пыталася, але, відаць, мой позірк быў поўны загадкавай натугі, калі ўжо яна загаварыла сама.

Калі яна яшчэ была за сваім мужам, здарылася непрыемная гісторыя з лістом, які яна атрымала ад аднаго калегі журналіста, што выехаў у Францыю і слаў поўныя жалю і настальгіі эпісталы. Відаць, даймаў яго брак жанчыны, таму ў пісьмах было шмат розных эратычных алюзій і нейкіх успамінаў з іх разам праведзеных на Чорным моры вакацый пасля сярэдняй школы.

Адно пісьмо прачытаў яе муж. Гэта быў якраз час яго найбольш пільнага кантролю. Для яе чым далей, тым больш невыноснага. Але яна не магла вырвацца з заклятага кола мужавай радні, сваіх бацькоў, цеснай кватэры ў бетонный пустыні з выглядам на пад'ёмныя краны і спляжаны ландшафт. І яна прыйшла да думкі неяк схавацца ў якой-небудзь выключнай прыватнасці, куды ніхто не меў бы права без спросу соваць цікаўны нос. Яна заказала сабе персанальную паштовую скрынку. У галоўным будынку менскага паштамта яна магла непрыкметна схавацца на некалькі хвілін, забраць карэспандэнцыю і пажыць у сваім таямнічым свеце, поўным мрояў, няспраўджаных разбушаваных летуценняў. Са студэнцкай газеты яна выбрала некалькі адрасоў і пачала перапіску. З дзяўчынай з Фінляндыі, хлопцам з-пад Братыслявы, а пазней з маладым італьянцам Джульянам. Гэты апошні інтрыгаваў найбольш. Ліставанне развівалася з неразгаданай двузначнасці ў бок канкрэтнай эротыкі. Высыланыя канікулярныя здымкі прыватных сустрэч перастаўлі ўжо быць вычарпальнымі. Прыйшлі да згоды абменьвацца давяральнымі здымкамі з фотаклішэ актаў. Спачатку яны былі няякасныя, бо не было добрага апарата. Пазней на ашчаджаныя грошы яна рашылася купіць паўпрафесійную «Алімпію». І яшчэ толькі існавала праблема з праяўленнем тых здымкаў, як бы тое не ўчворыць сенсацыі ў фотаатэлье. Яна пазнаёмілася з дзяўчынай адтуль, і яны разам разглядвалі праяўленыя Джульянавыя здымкі.

Яна апісала мне свае фотаграфічныя інтымы ў ваннай альбо ў

кватэры ў адсутнасці хатніх. На здымках яна прыціскала бюст альбо азадак да аконнай шыбы на балконе, садзілася на фалічныя бутэлькі, спрабуючы языком дастаць да смочак. Стаяла і сядзела ў розных паставах на падваконніку. Ад Джульяна таксама атрымлівала ананістычныя аўтавыявы. Парнаграфія развівалася. З калатнёю сэрца раз на тыдзень бегла на паштамт па новую перасылку. Пазней і таго стала мала. Пастанавілі спаткацца і паспрабаваць свае сілы ў натуральных вымярэннях, дакрананнях і спазмах асалоды. Месцам спаткання абралі Братыславу. Яна скарыстала нейкую экскурсію ў горы, каб апраўдаць сваю адлучку на некалькі дзён.

Яны замкнуліся з Джульянам на тры дні ў невялікім занюханым гатэліку, аддаючыся парнаграфіі ў натуры, рэалізуючы з шалёным сткатам сэрца і задыхлівым імпэтам змрочныя мары, вільготныя і ліпкія думкі. Супакоеная вярталася ў Менск з гарачым рашэннем навучыцца італьянскай мовы, бо слабой ангельскай выстарчала ім абаім толькі на прымітыўную камунікацыю. Распальную і цікавую толькі на некалькі першых гадзін, а пасля пакутлівую і ў пэўнай меры абразлівую. Джульян бо плаціў за ўсё і быў клапатлівы, але ўсё гэта разам рабіла на яе ўражанне гандлёжнай прыгоды.

XXIV

Яна прызналася, што аднаго разу, вярнуўшыся ў Менск з другой паездкі ў Братыславу, села ў скверы сярод латкоў з карцінамі, матрошкамі і іншымі такога роду шадэўрамі мастацтва. Піла піва з бутэлькі, бяздумна ўглядваючыся ў прастору перад сабою. Было позняе папалудне. Адчула на сабе доўгі ліпкі позірк мужчыны, які сядзеў на лаўцы з дзяўчынай. У дзяўчыны кідкі макіяж, яна прамянілася прадажным сексам, была ў кароткай спаднічцы і спакушала выстаўленымі на публічны агляд зграбнымі нагамі.

Мужчына запаліў папяросу, не спускаючы драпежна-прагнага позірку. Спачатку яна падумала была, што гэта звычайная цікаўнасць. Пасля змеціла той двухсэнсоўны сальны лоск на твары, якім мужчына надзіць і заахвочвае да скоку ў невядомае.

Далей яна расказала, што мінула больш дзесяці хвілін і мужчына падышоў да яе, загаворваючы пра ўсё, пра што можна загаварыць у скверы сярод карцін, пахаджалых турыстаў і запыленай зеляніны. Па хвіліннай размове яна ўжо адчула сябе як у памяшканні з замкнутымі дзвярмі. Паспрабавала выбрацца, хоць з цяжка хаванай абыякавасцю кідала фразы на тэму сваіх выдуманых штодзённых заняткаў. Нібы хацела спадабацца мужчыну сваёй бескампраміснай пазіцыяй. Праз паўгадзіны да іх падышла вышмінкаваная паненка на высокіх абцасах і з нудою на твары. Толькі тады яна дацяла сваю наіўнасць і што на ўме таму тыпажу. Адразу ўбарохталася ў правакацыю, якую спачатку трактавала, як пацешную забаву. Прапанова працы па тэлефоне. Ён абсыпаў яе камплімэнтамі і бажыўся, што выбіраць сабе кліентаў яна будзе сама. Яна настолькі ладная і прывабная, што не абавязана кідацца на любую прынаду. Грошы тут жывыя, халяўныя, а за апеку ён бярэ толькі палавіну. Яно зусім нязгорш як на менскія расцэнкі, калі сутэнёры здзіраюць з дзяўчат большую долю ўтаргоўкі.

Пасля гэтай размовы яна нават не адчувала абрыдлівасці да сябе. У галаве шумела выпітая бутэлька піва. Узяла нумар яго мабільніка і, удаючы свой поўны спакой, пайшла ўбок бліжэйшай станцыі метро. Дома адразу нырнула ў сямейны спакой перад тэлевізарам і ў пустыя размовы пра нішто.

Менавіта тады яна і наважылася напісаць цыкл нарысаў, у якіх менскія дзяўчаты спавядаюцца ў тонкасцях сваёй вулічнай працы (і не толькі). Артыкулы прынеслі ёй розгалас, некаторыя

газеты давалі даволі добрыя, як на Менск, сумы за большыя тэксты ў суботне-нядзельныя выпускі.

Муж быў вельмі незадаволены гэтым. Кпіў, што з такой журналістыкай адкрытая дарога ў бульварныя рубрыкі. Пасля адной такой вострай размовы яна ўзяла купленыя незадоўга да таго ролікавыя канькі і, заплёўшы валасы ў дзве школьныя касіцы, выскачыла з кватэры і правяла рэшту дня ў размашыстым раз'язджанні па навакольнай асфальтавай арэне, як істая наццатка.

XXV

Заінтрыгаваная яе расказам пра адпад у сваю змрочнасць і адначасова ў адкрытасць свету розуму з такой самай сілай, як бы тое заходзілася пра агульнапрынятае спазнанне хараства прыроды, я пачала распытвацца, як яна спраўляецца са страхам перад светам, які так брутальна адлучае нас ад нашых жаданняў, называючы іх злом і грэхам. Тады яна зацытавала мне фрагменты з кніг Генры Мілера. Сутыкнулася яна з імі некалькі гадоў таму назад у добрым расейскім перакладзе. І тады ёй раптам здалося, што цярпенні гэтага чалавека падсумавалі ўсе ранейшыя змаганні чалавецтва з двузначнасцю душы. Больш за тое, ўсё, што датуль здавалася хвалюючым і правакацыйным неспаўненнем, раптам абярнулася простай праўдай, дзіцячай забаўкай, казкай ці байкай на дабранач.

Яна пазбылася страху. Набралася ўпэўненасці ў сябе. Дзіўна. Але, бадай, магчыма, бо такі яна не павінна была ашукваць мяне, прыкідвацца і напускаць на сябе. Я па-ранейшаму білася са сваімі мяшчанскімі звычкамі да ўдаванага сораму альбо страху.

Аднаго вечара мы сядзелі ў яе ў кватэры, і яна зноў вярнулася да пытання, як пісала артыкулы пра менскіх прастытутак. Тады яна прапанавала мне прайсціся па горадзе.

Мы выйшлі з цёмнай брамы яе дома. Скіраваліся ў бок праспекта Машэрава, дзе на шырачэзным тратуары сярод кветнікаў падсветленыя рэкламы прэзерватываў асцерагаюць пра небяспеку СНІД'у і венерычных хваробаў. Было ўжо добра па дзесятай, і на тратуары сям-там кучкаваліся дзяўчаты, прабаўляючы час ціхімі размовамі і цыгарэтамі. Штохвіліны пад'язджалі машыны, з якіх высоўваліся мужчынскія галовы, дамаўляючыся і абгаворваючы ўмовы і стаўкі. Дзяўчаты нетаропка, спакойна, ва ўстаноўленым, відаць, паміж сабою парадку знікалі ў машынах і раз'язджаліся па невядомых аб'ектах.

Гэта страшна небяспечна. Яна, запабягаючы маё пытанне, пачала расказваць, што дзяўчаты найбольш баяцца сітуацый, калі за адным альбо двума аматарамі платнага сексу ў памяшканні з'яўляецца цэлая шобла, якую трэба ўсю, па чарзе, абслужыць. Найбольш жорсткія і крутыя прыбыльцы з поўдня, розныя там чачэнцы ці іншыя мусульмане. Шкодай вялікай, можа, і не пакрыўдзяць, але за такі харавы секс плацяць толькі адну голую стаўку - наогул, гэта 20-50 даляраў.

Пад'язджае міліцэйскі патруль. Дзяўчаты ў такім выпадку хаваюцца ў кавярні альбо стаяць каля ўваходу ў кінатэатр. На

ўсялякі раз мы таксама праходзім далей. Тады адна з іх пазнае маю таварышку. Прадстаўляецца. Завуць яе Света, яна вывучае журналістыку ў тутэйшым універсітэце. Успамінае іх папярэднюю леташнюю сустрэчу і загаворвае. Артыкул ёй спадабаўся, але крыху завостры. Яна пачынае бараніцца, што, бач, яна не сацыяльная работніца, што ёй да дупы, якога выбару трымаюцца дзяўчаты. Кожны мае права на тое, што яму пасуе і не шкодзіць іншым. Света дастае пачак цыгарэт і частуе нас. Пачынае наракаць, што калі б не даўгі, дык бы і не заводзілася, не цацкалася б з усім гэтым. Сама яна з-пад Магілева і не хоча вяртацца ў нэндзу сваіх бацькоў. Не мае ніякай талані на крутую кар'еру, не хапае блату, і таму яна рашыла крыху пасобіць сама свайму лёсу. І ўвесь час дэманстрацыйна гаворыць па-беларуску. Калі я пытаюся ў яе, ці мае час на вучобу пасля такой жылавымотлівай начной працы, яна з усмешкай адказвае, што ніколі не мела ніякага клопату з навукай. Веды прыходзяць ёй спора, апрача таго сама папісвае і шмат чытае. Як бы ў доказ таго пачынае чытаць свой новы верш - па-беларуску. Пасля расчаравана разважае пра няўдачлівасць мужчынскай палітычнай эліты. Прапускаючы палітыкаў, даходзіць да высновы, што ў ложку самыя лепшыя - іншаземцы, мабыць, хацела зрабіць мне прыемнае, здагадаўшыся, што я полька, і расказала пра некалькіх палякаў, якія мала што добра плацяць, кормяць і пояць, дык яшчэ пад канец патрафляюць і ў ручку збусяць. Ніколі не таргуюцца, заўсёды дадуць які-небудзь прэзент і завязуць дамоў. Крышку шакіруе, што занадта педантычныя. Адзін, напрыклад, кожнага разу надзявае два прэзерватывы. А яна ж рэгулярна наведвае гінеколагаў і не дазволіла б сабе пайсці з кліентам, калі б што-небудзь падчапіла.

Вяртаемся дамоў. На цёмнай лесвічнай пляцоўцы таўкуцца госці інтымнага агенцтва.

Увайшоўшы ў пакой, яна прапануе мне гарбаты. Здымаю боты. Сядаю, падкурчыўшы ногі, на тапчан і бяру з палічкі адзін з нашых агульных камянёў. Гладжу пальцамі шорсткую і халодную паверхню.

XXVI

Тое ж бо яе захапленне Генры Мілерам... Нават тэкст, здавалася б яе ўласны, - бачу, што паявіўся пасля чытання шмат якіх мілераўскіх фантазій і душаразладных споведзяў.

Цяпер хочаш па-просту апраўдаць гэту любоў, надаць ёй хоць бы цень сэнсу і, вядома ж, падпарадкаваць яе сваёй волі. У Тваім унармаваным свеце - планаў, мараў, прадугледжаных і непрадбачаных спатканняў - тая любоў з'яўляецца так неспакойна і застае Цябе знянацку. І ты мусіш, альбо папросту лічыш, што мусіш, яе цугляць. А тым часам яна вырываецца. Бо прыйшла без Тваёй волі. Жыве і цешыцца жыццём. Сама ў сабе. У Тваім целе і душы і робіць з Табою, што хоча. Як дэман з малітвы заклінача д'ябла. На самым пачатку Ты бавілася ёю - было цікава і цікаўна, але што паробіш з ёю цяпер, калі яна будзе развівацца далей? Сваім бездакорным заходнім розумам задаеш пытанні. І сама ўпадаеш у нерат розуму, які вышэй за Цябе. Ці ўтрымаеш яе пры жыцці? Што за неадпаведнасць. Ты ж бо яе не корміш, яна жыве і даводзіць Табе, што так яно й след. Насуперак той д'ябальскай і людской логіцы. Баішся і ведаеш, што калі яна разальецца, будзе Табе вой як блага, выглядацьмеш чыстай ідыёткай, подлай... Таму якраз у глыбіні душы ты і маеш надзею, што неяк усё абыдзецца, і любоў твая мінецца.

Застаешся з ёю вызваленая і застаюцца з Табою прызнанні, жалі, прэтэнзіі, скугла, просьбы пра спачуванне і мальбоны за дапамогу.

Мой спеў у гэтую хвіліну шэлега не варты. Які б ён ні быў той верш, тая песня, якая б ні была музыка і патэтычная псальма. На нішто ўсе мае намогі. Мала таго, навокал іншыя сваімі песнямі, сваімі вершамі памнажаюць багацці вопыту. І бачу, як нямы глядач: у скрусе перад Усявышнім і ўсведамляючы, што ў сваёй слабасці не патрапляю дараўнацца хоць бы з найменшай страфой Ягонага прарока, запісанай у псальмах. Узбагачаць іншых, чытаючы ўсю эпоху, змешчаную ў змаганнях з ворагамі нейкага караля ці князя з пракаветнай гісторыі Ізраіля.

Узношу хвалу Ўсемагутнага,
і ты ўратуешся!
Ліся, песня мая!
Спявай, майстар-будаўнік!
Спявай, шчаслівы творца!..

... Хто можа падкапаць, знішчыць веру? Хто можа абваліць радасць? Многія спрабавалі зрабіць гэта ў розны час, але нічога ў іх з таго не выйшла. Радасць і вера - гэта іманентныя рысы Сусвету. Хоць у працэсе ўзрастання заўсёды спадарожнічаюць боль і барацьба. Спаўненне - гэта радасць і поўніца шчасця. У канцы - супакаенне. Паміж палосамі і сферамі быту, паміж зямным і незямным існуюць краты і прыступкі. Хто ўспаўзае па іх угору, той спявае. Упадае ў п'яны транс, стан даброці і даходзіць да захаплення перад расхінутымі перад ім даляглядамі. Падымаецца, не думаючы, што з ім зробіцца, калі пакаўзнецца і ўпадзе; думае пра тое, што ўсё перад ім! Думае пра тое, што ўсё перад ім! Дарога ў бясконцасць - а чым далей памкнешся, тым даўжэйшай робіцца. Балоты, багны, дрыгвянішчы, віры, прорвы і пасткі - усё перад табою. Памятай пра іх, яны чакаюць, яны цябе паглынуць у тую самую хвіліну, як толькі ты на момант прыпынішся. Свет ілюзій - гэта яшчэ не да канца ўпакораны свет. Гэта заўсёды свет прыйшласці, будучы свет, а не таго, што сышло ў нівеч. Ісці наперад, абапіраючыся на мінулае - гэта валачы на нагах цяжкія нявольніцкія гіры. А хто прыкаваны да мінуўшчыны, той змушае сябе пражыць яе наноў. Прашу Цябе, не бойся. Пан Бог дасць Табе сілу, каб ацугляць Тваю слабасць. Тваё цела, дадзенае толькі на момант, ён жа зрабіў яго прыладай спаўнення ў гісторыі любові. Ён, укрываючыся ў рэчах і з'явах, гаворыць нам, пераконваючы, што так сапраўды няма ЯГО! Ёсць толькі любоў. Благая і добрая. Любоў чалавека да чалавека. Сярод багнішчаў, тоняў, пахмурных і непамысных прастораў.

Усе мы вінаватыя, усе мы злачынцы, вінаватыя ў вялікім злачынстве. Пражываем жыццё без жадання жыць, але патэнцыйна мы ўсе свабодныя і можам перастаць мысліць пра тое, што ў нас не атрымалася. І таму ўсё ў нас выйдзе, усё нам удасца, на што мы здольныя, што патрафім. Ніхто не можа ўявіць сабе, якія гэта сілы ў нашых руках. Не можам уявіць сабе, што яны бязмежныя. Уяўленне - гэта пакліканне, якое нам робяць, і мы ўспасобімся стаць перад ім наўпрост насуперак агульнаму перакнанню, што нам не ўдасца. Калі ёсць нешта боскае ў Богу, дык гэта менавіта такое пакліканне і здольнасць стаць перад ім наўпрост.

Калі я гавару мовамі чалавечымі і анёльскімі,
а любові ня маю,

XXVII

Гартаючы старонкі часопіса «ARCHE», я знайшла апавяданне Адама Глобуса. Дзіўнае стварэнне гэты Глобус. Пераспаў з дзяўчынай. Вядомай, зрэшты, журналісткай, і тут жа распінаецца пра свае досведы.

Патэлефанавала Ёй, поўная ўскіпелага ўва мне абурэння, і мы сцяліся ў спрэчцы пра межы інтымнасці ў літаратуры. Несумненна, мы перш за ўсё пішам пра тое, што з намі здарылася. Дзелімся сваім светам, але ж ёсць крэсы прыстойнасці. Пісьменнік, нават найбольш нявінны і дурны, альбо той, які толькі што пачынае змагацца з сабою і сваёй дарослаcцю, не павінен апускацца да ўзроўню рэпарцёрскіх прыёмаў бульварнай газеткі. Віжаванне, вядома ж, мае сваю неадольную панаду, але тут нешта горшае за анахранічна зразуметую здраду. Гэта так, як калі ў школе хлопчыкі-падлеткі дзеля забавы задзіраюць дзяўчаткам спадніцу, лапаюць іх у цёмным калідоры альбо дзеля смеху натыкаюцца на дзяўчат, якія праходзяць міма.

Ён не павінен у такіх дэталях і з такой дакладнасцю паказваць пальцам, што пераспаў з гэтай во дзяўчынай, і ацэньваць альбо заахвочваць да ацэнкі чытача.

Яна ж згаджаецца са мною толькі ў адным. Што не павінен апісваць аж так дэталёва. Бо то ж ці мала каторама з нас наўме ў сваім расхрыстаным эратычным жыцці мець многіх. З часам, каб падкрэсліць сваю вагу, мы даём вокам знак усім навокал, што сапраўды і мы з тым таксама, так, пераспалі. І робім гэта толькі дзеля таго, каб падвысіць цікаўнасць да сваёй асобы.

Яна сказала мне таксама, што нядаўна бачылася з Уладам, які з прыкрасцю зазначыў, што смеху варта не тое, што Адам Глобус апісаў у «ARCHE» сваю сувязь з вядомай журналісткай так падрабязна. Смешна тое, што на месцы Глобуса гэтай дзяўчыне ён, Улад, не прысвяціў бы і палавіны сказа ў газеце. Глобус папросту зрэагаваў на сваё паражэнне і не так папомсціўся журналістцы, як пацвердзіў толькі факт пераспання з ёю. Нібы такі быў фармальны эксперымент. А яна проста нікудышняя. Улад успомніў, як яны кахаліся пасля аднаго вечаровага прыёму ў яе на кватэры. Не прайшло і дзесяці мінут, як дзяўчыне ўжо было досыць. Улад з грымасай на вуснах, як сказаў з церпкім успамінам, яшчэ толькі-толькі раскручваўся. А яна тым часам ужо кінула яму ў твар - ах, ты такі ненасытны. Якая прымітыўнасць! - абураўся Ўлад. Халодная і недаразвітая. Некалькі мінут сексу. І гэта мне называецца інтэлігенцыя?!

Так, я магла б і згадзіцца з ёю, калі б не ведала Ўлада...

І тут я пачала з ёю выкаблучвацца. Ведаю, што той яе літаратурны кандыдат выхваляецца і зайздросціць Адаму Глобусу, што не ён першы ўздольніўся на такі эксперымент. Не, што ты! Крый Божа! З Уладам я не спала і ніколі, нават пасля некалькіх бутэлек на такое не пайшла б. Ён міфаман і пляткар! Адам Глобус, праўда, зрабіў шкадліва, але і з Уладам я пагадзіцца не рызыкну.

Зрэшты, кінем вокам на яго літаратурныя здабыткі. Яго комплексы сягаюць глыбей. Напісаў кніжку пра Лукашэнку - нейкая фантастычная байка, пра якую ведаюць ужо ўсе ў Менску і ў Варшаве. А з таго, што ён гаворыць сам, слава пра яго кнігу дабегла нават за акіян (Атлантычны, прынамсі!). Праблема, што ніхто той яго кніжэнцыі не чытаў, усе пра яе ведаюць толькі з дэкларацый самога аўтара падчас розных імпрэзаў і сустрэчаў. Вось яно, мастацтва і майстэрства занятку віртуальным сексам. Сапраўдная вытанчанасць.

Тады яна лямантуе мне ў слухаўку, што перажываны секс і секс апісваны - не адно і тое самае. Можа, Адам Глобус проста выдумаў цэлую тую гісторыю, каб нешта там справакаваць. І яму ўдалося. Яна нагадала мне анекдот пра аднаго афіцэра, які за бяседным сталом у афіцэрскім казіно пачуў меркаванне на прадмет задніцы сваёй жонкі. Гэта была яўная правакацыя, але закончылася яна трагічна. Афіцэр вярнуўся дамоў. Гонар і абраза загадвалі яму застрэліць жонку і адразу пасля самога сябе. Ах, гэтая сіла грамадскага этыкету. Цікава, у які пасля гэтага пераплёт трапіў аўтар таго меркавання. Ён хацеў толькі крыху пазабавіцца за кошт свайго калегі. Мы самі, па сваёй ахвоце ці рэдка калі купляемся на сяброўскія розыгрышы і містыфікацыі. А тым часам пра добры, памысны секс марыць кожны. Ну, амаль кожны.

А дзяўчына, прыспаная адным калегам, мае права быць рэкамендаванай другому. З рук у рукі. Каб насыціцца, дапасці да ўсіх тых, у чые абдымкі кідае нас сіла апанталай нас фантазіі...

Ці не шызанулася, што яна вярзе!? Я крычу ў слухаўку. Не магу! Узровень нашай размовы выходзіць за межы чыстага сацыялагічнага ці літаратурнага дыскурсу. Яна дражніць мяне сваімі поглядамі. Гэта ўжо нават не блядзтва і нават не німфаманія. Не разумею яе. Можа правакацыя. Годзе. Хай чапляецца за гэтага свайго Дзіму, і хай ён будзе ёй сутэнёрам, хай совае ёй пад нос усё новыя і новыя чэлесы спраўных і юрлівых самцоў. Яе клопат, яе праблемы, яе жыццё.

XXVIII

Я рашыла зацягнуць Марка на дыскатэку. Пры гатэлі «Беларусь» ёсць вядомы клуб, які ўсе называюць «шайба». Гэта ад формы будынка і сцэны, нават некалькіх сцэн, на якіх позна ўначы пад гучную музыку разбіраюць танцорак. Часам, як я чула, разбіраюць і прыахвочаных малалетак.

З Маркам мы абгаварылі правілы гульні. Кожнае з нас ідзе асобна і толькі назіркам зазначаем сабе, ці другое ўжо што падчапіла. Маем пры сабе тэлефоны, дык жа ў разе чаго пазней установім хто, дзе і з кім ідзе далей. Калі толькі адно з нас вылавіць што, дык дзелімся, натуральна, са згоды злоўленага.

У машыне соваю ў кішэню некалькі прэзерватываў. Марку таксама соваю ў пінжак некалькі. Пакідаем машыну ў паркінгу каля гатэля. Каля касы тры пацанкі. Маладзенькія, дурненькія наццаткі. Марк паводзіць вачмі па напятых азадках і адкрытых дэкальтэ. Я купляю білет асобна, каб не псаваць яму гешэфту. Ён загаворвае з дзяўчатамі, думаючы, што ў іх няма грошай на ўваход. Ані, яны чакаюць сваіх кавалераў.

Заходзім усярэдзіну, скрупулёзна кантраляваныя ахоўцамі. Марк высока падымае рукі, як салдат, здаючыся ў палон. Мяне правярае дзяўчына, якая як звычайна знаходзіць звязку ключоў для дома.

Штэмпелююць нашыя далоні. Нарэшце ўваходзім.

Каля бара ўсё тыя самыя, што і заўсёды, тры прастытуткі. У зале пуставата. Можа, яшчэ зарана. Толькі адзінаццаць. Большасць столікаў ужо занятая, але за імі амаль толькі адны дзяўчаты. Разглядаюся. Марк па той бок залы. Падсеў да трох дзяўчат, якія хутчэй за ўсё святкуюць з шампанскім нечы дзень нараджэння. Бачу, заводзіць іх, дзяўчатам у ахвотку.

На паркеце некалькі хлопцаў топчуцца ў танцы, але па іх выглядзе відаць, што гэта курсанты з міліцэйскай школы альбо вайскоўцы з акадэміі. Маладыя, паголеныя, танцуюць правільна, шукаючы вачыма якой-небудзь шчыліны, куды ўшпіліцца на вечар. Нічога цікавага.

Праз гадзіну падыходжу да Марка, які каля буфета пацэджвае піва і паліць цыгарэту за цыгарэтай. Пачакаем яшчэ крыху танцорак і стрыптызу. Можа, зборня раскруціцца.

Па зале ходзіць платаядны пярэстарак, лапае ўсё, што рухаецца і на дрэва не ўцякае.

Нуда, нуда, нудота...

Нават танцоркі нас не разварушваюць. Нейкія мала

апетытныя і не сексуальныя. Рашаем уцякаць дамоў. Планы - кату пад хвост, але настрой гэтага вечара дае нам сілу, каб пазаймацца самімі сабою.

XXIX

Прыехаў да яе нейкі журналіст з Вільні. Беларус з летувіскім грамадзянствам. Яна патэлефанавала мне позна ўвечары, каб падскочыла як мага хутчэй.

Справа пільная, патрабуе, каб без адкладу. Калі я праз паўгадзіны пад'ехала, яна прадставіла мне Валеру. Я чула пра яго. Палітычна заангажаваны журналіст і перспектыўны беларускі пісьменнік малодшага пакалення. Выглядаў дужа змардаваным. Зарослы, у лахманах, з запалымі вачыма і шэрай скурай.

Гатуючы на скорую руку гарбату на кухні, яна расказвае мне, што яны знаёмыя ўжо каторы год, з выцечак у Вільню і Палангу. І заўсёды ў адной кампаніі падчас вакацыйных вандровак. Прыехаў на яе менскую кватэру без грошай у пазычанай вопратцы, з дзікім страхам у вачах, набытым, як экзатычную хваробу, недзе ўглыбіні Расеі.

Калі яна падавала гарбату з жаласцю ў вачах, ён папрасіў шклянку гарэлкі. Пачаў расказваць пра ўсе свае прыгоды, якія я нізавошта не акрэсліла б як прыгоду. Зрэшты ён яе зусім і не шукаў.

Ужо два гады ён меў добрага знаёмага ў Расеі, недзе далёка за Ўралам. У той мясцовасці, кіламетраў так з дзвесце далей, жыве яго дзядзька. Дамовіліся яны ў справах нейкага інтэрасу і зварганілі некалькі кантрактаў на зусім-такі неблагую суму, недзе так тысяч на сто даляраў. Гешэфт пайшоў на пагаршэнне пасля расейскага жнівеньскага дэфолту 1998 года, і адносіны паміж імі пайшлі на спад. Але пасля году маўчання калега азваўся-такі і папрасіў прыехаць, шчыра падкупіўшы тым, што ў іхніх справах можа распачацца новы этап. І ён рашыў прыняць запрашэнне калегі, спалучыўшы паездку з даўно адкладаным візітам да дзядзькі, у якога ў дзяцінстве некалькі разоў праводзіў вакацыі.

Пасля двухсутачнага падарожжа цягніком з Вільні, праз Маскву, даехаў. Калегі на вакзале не было, што не здалося яму падазроным, бо аж так дакладна яны і не дамаўляліся. Хоць той раней заўсёды яго сустракаў. Ну, але ж цяжка, падумаў, пэўна, моцна заняты. Узяў таксі і ад вакзала хутка даехаў да бетоннага блочнага дома, дзе і знайшоў знаёмы адрас. Пад дзвярыма доўга стаяў і званіў. Чуў нейкі пошум па той бок і адчуваў, што яго пільна разглядваюць у вочка. Даволі марудлівая пачаканка, але дзверы такі адчыніліся. Убачыў свайго калегу як падмененага, як прыбітага, змучанага, п'янага ці мо нават пад наркатою.

Павіталіся даволі холадна. Запрошаны на кухню, корпаўся там, дастаючы з вялікай сумкі ўсе свае віленскія запасы жыўнасці, з якімі і раней заўсёды прыязджаў, - высока цанёныя ў Расеі каўбасы, сыры, рыба ў бляшаначках і дзве бутэлькі добрых налівак.

І тым часам чуў, што ў пярэднім пакоі адбываецца нейкая драматычная размова па тэлефоне яго расейскага калегі з кімсьці незнаёмым. Але нічога не западозрыў. Увайшоў у ванную, праз хвіліну вярнуўся на кухню, замітусіўся між сталом і халадзільнікам.

Селі з калегам насупраць. Гаспадар наліў гарэлкі ў дзве брудныя шклянкі і, цяжка асунуўшыся на крэсла, падняў тост за сустрэчу. Нічога не паказвала на непрыемнае развіццё падзей, хоць ужо тады Валера адчуў нейкі невытлумачальны страх. Пасля другой шклянкі расейскі партнёр па інтэрасе ўадкрытую спытаўся, колькі грошай прывёз з сабою. Насамрэч па тэлефоне была гаворка пра абавязковыя дзесяць тысяч даляраў, але Валера не зразмеў, што іх трэба прывезці з сабою. Дык ён адказаў, што пакуль што прыехаў агледзецца і пабалакаць. Па твары кампаньёна раптам паплыла хваля прыкрасці і роспачы. Валера зразумеў, што тут да чаго, калі з суседняга пакоя ўварвалася шобла рослых дзецюкоў у скуранках і, заламаўшы яму рукі, паваліла на падлогу. Давай грошы! Праверылі яго партфель і ўсе патайнікі ў заплечніку. Валера думаў, што, забраўшы дзвесце даляраў у дробных банкнотах, якія ён меў пры сабе, яго пакінуць у спакоі. Бандыты, аднак, не спыніліся на вобыску. Надзелі яму мяшок на галаву і вывелі з пакоя, забараніўшы крычаць пад пагрозай лупцоўкі і нават забойства.

Доўга ехалі ў машыне, пасля правялі нейкім доўгім калідорам па прыступках уніз, пасля зноў калідорам. Папіханаму і штурханаму яму не было калі і як уважліва разглядаць праз дзіркі ў мяшку, дзе ён і куды яго вядуць. Зрэшты, і без таго ён не ведаў гэтага горада настолькі, каб адважыцца на ўцёкі. Страх нарастаў. Вядуць выканаць свой прысуд. Але за што. У яго ж не было ніякіх даўгоў, у інтэрасе з калегам год таму назад ён нават страціў на апошняй здзелцы больш за тысячу даляраў, але яны паабяцалі сабе, што пры нагодзе ўсё кампенсуюць.

Я падумала, што, можа, тут гаворка пра нейкі гандаль зброяй ці наркотыкамі. Калі я спыталася адкрыта, Валера раптам узвіўся на мяне, аблаяў і сказаў, што гаворка ішла пра матэрыялы для прамысловай вытворчасці машынных дэталяў.

Толькі па паху зарыентаваўся, што ён у сутарэнні. Праляжаў звязаны цэлую вечнасць. Можа, ноч ці суткі. Прасіў піць. Нарабіў пад сябе. Звязаны, з кляпам у роце, гатовы да ўсяго. Чакаў ужо

толькі хіба што хутчэйшай смерці.

Ён пазіраў на нас, перапыняючы свой расказ доўгімі хвілінамі маўчання. Мне здавалася, быццам ён хацеў падзяліцца словамі малітвы, якія вымаўляў у такі драматычны момант. Можа, прасіў лёгкай смерці, можа, збавення, можа, вады і хвіліны паслаблення здранцвелым рукам і нагам.

Прайшла цэлая вечнасць, з якой ён выхоплівaў гукі з вуліцы і гарадскога шуму, чыесь неразборлівыя галасы, дзіцячыя крыкі. Трымаў у памяці ўсе гэтыя шумы, спрабуючы скласці нейкі разумны вобраз атачэння. Але чым далей, тым больш усё цямнела, чужынела, жахліва набліжаючы да смерці.

Прайшла чарговая вечнасць, аж наблізіліся гукі і прыглушаныя галасы тых, якія яго звязалі. Уласна, гэта быў адзін голас, які ён запамятаў. Не расейскі акцэнт, а нейкі грузінскі, чачэнскі, хоць, можа, з такім жа поспехам з Узбекістана ці Арменіі.

У голасе вайсковая хрыпатасць, якая так добра помнілася з часоў службы ў савецкай арміі. Ахрыпласць чалавека, які пражыў няляда ўсяго ўсякага, скурыў цэлую краму пяпяросаў, выпіў бровар гарэлкі і начворыў такіх рэчаў, галоўная рыса якіх тое, што пра іх трэба як найхутчэй забыць.

Ляжаў тварам на вільготным бетоне. Калі да яго падышлі, ён умольна застагнаў і заенчыў. Развязалі ногі, знялі мяшок і спыталіся, якога ражна яму трэба. Папрасіў вады і таксама спытаўся, чаго ад яго хочуць. Пачуў смех. Гэта ж бо відавочна - чаго. Дзесяць тысяч баксаў. Дзе іх трымае, дзе іх схаваў. Ён зразумеў, як мала вартае яго жыццё. У галаве маланкава прамільгнуў каталог знаёмых, якія маглі б пазычыць на выкуп. Пасля некалькіх пытанняў зразумеў, што ягоны калега нарабіў даўгоў, павінен быў разлічыцца, але не было чым. І ён рашыў завабіць яго і «прадаць» як заклад пад неаддадзены доўг.

Зарыентаваўся ў вельмі простай сітуацыі і прапанаваў патэлефанаваць у Вільню і папрасіць жонку, каб паслала калегу з грашыма. Захопнікі пайшлі на такую замену. Забралі яго з сабою ўгору. Выходзілі з падвала, і яркае святло з калідора лесвічнай клеткі ледзь не паваліла яго на падлогу. На момант ён абаперся аб сцяну. Хрыпаты Голас за плячыма ўталкоўваў, што з ім будзе, калі паспрабуе збегчы. І задаў рух ягонаму ўяўленню, сказаўшы, што тут паўным-поўна яго калегаў. Не толькі ў гэтым горадзе, а ў цэлай Расеі і на свеце. Маса карашоў з арміі. Такія ж сама рашучыя, такія ж сама зацятыя, такія ж сама гатовыя каго хоч забіць. Са зброі ці голай рукою. Уночы і ўдзень, у натоўпе ў цэнтры горада і на вачах у міліцыі. З-за зацемненых шыбаў

мерседэса і з бруднага грузавіка. У цягніку, самалёце, на караблі. Шанцаў - ніякіх.

Можа, Хрыпаты Голас залішне хваліўся, але гэтага ставала, каб на некалькі дзён паралізаваць у ягонай галаве любыя праекты магчымых удалых уцёкаў.

Прайшлі па лесвіцы некалькі паверхаў. У канцы доўгага калідора дзверы, абабітыя з сярэдзіны карычневым дэрмацінам. Ідучы, не бачыў нікога з насельнікаў. Цішыня. Поўны корпус людзей, звычайны блочны дом, якіх у Расеі сотні тысяч. Адзін да аднаго падобных. Масква, Пецярбург, Яраслаў, Растоў, Смаленск, Казань? Выбірай любы, і нічога іншага не ўбачыш, апроч абабітых дэрмацінам дзвярэй, шэрых і смярдзючых лесвічных пралётаў, падрапаных сцен. Гэты характэрны савецкі пах гнілое цыбулі, як гаўно немаўляці. Пах, які выпаўзае з кожнай савецкай кватэры, з кожнай савецкай кухні, кожнай савецкай валізкі на вакзале. Будзь тое Вільня, Варшава, Амстэрдам, Гамбург, Парыж. Пазнаеш чалавека з постсавецкай прасторы па гэтым задушлівым паху.

Вялікім дасягненнем Летувы ён прызнаваў не факт незалежнасці, дэмакратыю, грамадзянскія свабоды, а тое, што праз некалькі гадоў гэты агідны пах знік. Зрэдзь-часу яшчэ сям-там прабіваецца, як ліхі ўспамін, кашмарны сон. Гэты пах варта трымаць у слоіках для будучых пакаленняў. Каб ведалі, што нават калі Саветы перасталі існаваць, дык іх жахлівы нячысцік паяўляецца ўсюды, пакідаючы па сабе смурод, войны, бяду, беспарадак і жорсткасць звычайных людзей да звычайных людзей.

Валера быў ужо яўна пад уплывам шклянкі гарэлкі. У ім загараўся агонь нянавісці да ўсяго, што яго звязвала з гэтымі днямі.

Расказваў далей.

Патэлефанаваў у Вільню і сухім тэкстам пераказаў жонцы, што яна павінна арганізаваць грошы на добры гешэфт, што ён тут чакае і хай прыедзе калега.

Захопнікі перавялі дух. Колькі дзён прыйдзецца чакаць. Можа, два, чатыры, пяць. Дамовіліся, што паслязаўтра перазвоніць, каб праверыць як ўсё ідзе там у жонкі. А яму тым часам дазволілі зайсці ў ванную. Ён вымыўся, памыў майткі і штаны. Ахінуўшыся ручніком, вярнуўся ў пакой. Сеў побач з Хрыпатым Голасам. Захопнікі гатавалі сабе абед. Цыбуля, гуркі, кавалкі смажанага мяса. Адзін з іх сюд-дуд дастаўляў з кухні на сквірчастай патэльні новую порцыю. Заядалі лустамі чорнага хлеба. У шклянках паявілася гарэлка. Пачаставалі і яго, завялі пустую гаворку. Хрыпаты Голас расказваў пра Чачэнію. Ён быў там наёмнікам. А

сам з Туркменістана. Вывучаў ў Маскве літаратуру, філасофію і псіхалогію.

Калі выпілі па дзве шклянкі, Валера рашыў праверыць узровень адукацыі Хрыпатага Голасу. Пачаў з Пушкіна. І тут у яго адвісла сківіца. Хрыпаты Голас ведаў не толькі творчасць Пушкіна, але і апошнія кнігі гісторыкаў літаратуры. Знехаця расказаў пра псеўдаадкрыцці Юрыя Дружыннікава, які фактычна размножыў веды пра расейскія міфы, вядомыя кожнаму студэнту-філолагу ў Маскве і Піцеры.

Пасля трэцяй шклянкі Хрыпаты Голас ужо чытаў напамяць Блока і Ясеніна. Трэба прызнаць, што ягоныя калегі з такім самым подзівам, як і Валера, слухалі таленавітага кораша.

Падвечар Валера ўжо хадзіў у прыяцелях. Хрыпаты Голас абяцаў яму нават запісаць у сшытак свае вайсковыя гісторыі.

Гісторыі - як матрошкі. Адчыняеш, а там чарговая. Валера паказаў сшытак. Два вечары засяроджанасці, і Хрыпаты Голас запоўніў некалькі дзесяткаў старонак дробнымі, падрабязнымі апісаннямі. Што ні сказ - то нейкая людская трагедыя, начныя баі, ваенныя оргіі, людскі плач і адчай.

Праз тры дні зноў патэлефанаваў жонцы ў Вільню. Хвіліна няўвагі бандытаў дала яму магчымасць кінуць некалькі фраз па-летувіску. Ведаў, што ніхто з прысутных не зразумее. Сказаў толькі, што ў небяспецы, пастараецца ўцячы, а калега з грашыма хай прыедзе, але не з'яўляецца па тым адрасе, пакуль не атрымае ад яе пацверджання, што можна. Пасля гэтага летувіскага прарыву Хрыпаты Голас падскочыў, выхапіў у яго слухаўку, шпурнуў на апарат і сваім магутным вайсковым кулаком уваліў у твар. Валера заліўся юхаю, кульнуўся на падлогу і ляжаў без руху. Хрыпаты Голас загадаў яму яшчэ раз патэлефанаваць жонцы, растлумачыць ёй, што нехта выпадкова перабіў іхнюю размову, але ўсё застаецца без зменаў, чакае грошай.

Прыехаў Марк. Мы ўсхапіліся, быццам хацелі даць яму больш месца вакол гісторыі, расказванай Валерам. Яна выйшла на кухню па гарбату, я коратка ўвяла Марка ў курс Валеравай гісторыі. Марк увесь ператварыўся ў слых. Валера расказваў далей.

Яму дазволілі жыць разам з імі, яны чакалі грошай, ушчыльняючы час гарэлкай, тэлевізарам, картамі. Адзін толькі Хрыпаты Голас час ад часу запісваў у сшытку выдуманыя, а можа, праўдзівыя баявыя гісторыі. Валера адпачыў пасля падвала, але ўважліва аглядаў памяшканне, выгляд з акна, натаваў у памяці цыкл дзяжурстваў сваіх вартавых. У чацвёртую ноч пасля добрай папойкі Валера ляжаў у ложку толькі ў майтках, побач на падлозе

і на канапе спалі тыя. Храплі як на вышках. Яму закарцела ў туалет, і ён ціхенька пакінуў пакой. На кухні спаў чацвёрты ахоўнік. Таксама ў сцельку. Тады маланкава мільганула думка пра ўцёкі.

Не доўга думаючы, схапіў першыя выпадковыя боты, штаны і світар. З-за камоды ў калідоры ўзяў сшытак з нататкамі і сваю малую сумку, у якой, як выявілася пазней, не аказалася ягоных дакументаў. І сам здзівіўся, як лёгка далося пакінуць памяшканне. Пот страху, напруга і адчуванне соннай нерэальнасці - усё гэта выштурхнула яго з дома, па лесвіцы якога ён босы збег некалькі паверхаў уніз, бадай, хутчэй чым самы сучасны ліфт.

У кустах апрануўся і рушыў наперад. Праз некалькі кіламетраў шалёнага бегу ў бок цэнтру горада натрапіў на міліцэйскі патруль. І тут успомніў словы бандытаў, якія папярэджвалі яго, што ўсюды маюць знаёмых і дастануць яго з самай цёмнай і глухой нары. Калі б яго цяпер затрымала міліцыя, ён не мог б растлумачыць, што і навошта ён тут робіць. Ён завярнуў у цёмную падваротню і перачакаў, калі святло аўтамабільных фараў аддаліцца. Потым зноў рушыў да цэнтра.

Непадалёк ад вакзала чарговы патруль міліцыі. Сеў на лаўку ў кустах. Развіднялася. Аслабелы ён абапёрся і на хвіліну заснуў. Разбудзіў яго смурод. Побач на лаўцы сядзеў бомж. Тыповы расейскі бяздомнік са смярдзючым дыханнем, дзікімі вачыма і зарослым, як у яго, тварам. Не была гэта прыемная сустрэча. Але Валера адразу знайшоў у чалавеку прыязную душу. Разгаварыліся. Бомж быў малдаванін. Але не жыў там з самага дзяцінства. Працаваў на будоўлях Сібіры цеслем. Потым спёкся на нейкім крадзяжы, адсідка, потым - без даху, без працы, дурная прывычка выпіваць з самай раніцы. А на гэта час-парою трэба быць пры валюце. Хоць пару рублёвак. Так вось і бадзяецца па ўсіх былых саветах. І ў Вільні быў, але яшчэ да таго, як шчыльна зачынілі граніцу. Падарожнічае ў таварняках. Дасканала ведае, як і калі знайсці адпаведны цягнік. Ведае, што рабіць, каб не трапіць у рукі чыгуначнай міліцыі. Я прапанаваў яму, што забяспечу яму жратву ў знаёмых у Кіеве, калі дапаможа мне дабрацца туды. Той падумаў. Згадзіўся, але на Кіеў цягнік будзе толькі заўтра ноччу альбо паслязаўтра. Бо пачалі вазіць збожжа. Гэта добрыя вагоны. Цяпло, суха і лёгка схавацца.

Бомж прапанаваў яму супу на сняданак у сталоўцы ў манашак каля царквы. Валера не памятае, каб калі еў смачнейшы булён. Цудоўныя праваслаўныя паслушніцы ў доўгіх шэрых спадніцах шчыруюць у садзе. Валера падрадзіўся дапамагчы ў працы ўзамен за начлег у сцёбцы. Яго новы прыяцель таксама прыстроіўся. Праз

два дні цяжкай працы і добрага пакормнага харчу яны зніклі ў пашчы ночы.

Падарожжа ў збожжавых вагонах сапраўды было не з самых горшых. Адна толькі бяда. Пропадзь насякомых, мышэй і нейкіх пачварных аваднёў, якіх і назваў не ведаў. Збожжа аднекуль з Казахстана. Бруднае, месцамі вільготнае. Багата будзе гарэлкі. Вядома, украінскай - гарнай.

У Кіеве знаёмыя як толькі ўбачылі яго ў кампаніі з бамжом - за галаву схапіліся, падумаўшы, што ўжо ці не канец з ім. Доўга і блытана тлумачыў ім, як трапіў ва ўсю гэтую авантуру. Не вельмі верылі. Але накармілі, далі апрануцца і грошай на білет. Тады толькі рашыўся рызыкнуць на паездку ў Менск. Натуральна, праз зялёную граніцу. У Менску ў летувіскім консульстве заявіў пра згублены пашпарт і да раніцы будзе чакаць якога-небудзь дубліката. Але баіцца вяртацца ў Вільню.

У яго цёмна-зялёных вачах праз хвіліну зноў праблiснуў страх. Быццам уся вывергнутая з сябе гісторыя яшчэ глыбей дала яму ўсвядоміць, што нават тут ён не можа адчуваць сябе ў бяспецы. Марк адчуў гэты настрой і адразу прапанаваў яму кватэру сваёй цёткі ў Рызе. Можа паехаць туды хоць заўтра і сядзець там хоць паўгода.

Мы выпілі яшчэ крыху і, заўважыўшы стомленаасць як самой гаспадыні, так і госця, рашылі развітацца. Паехалі да сябе ў сяло, г.зн. у цэнтр Менска. Было ўжо позна. Калі Марк павольна набліжаўся да яркага ліхтара каля нашага дома, я папрасіла, каб скінуў хуткасць. Мужчына ў зялёнай куфайцы, схіліўшыся да распраўленай на табурэце бляхі, разграбаў нейкія дробныя каменьчыкі. Што ён такое робіць. Марк усміхнуўся і паціснуў плячыма.

XXX

На другі дзень Марк забраў Валеру, каб везці ў Рыгу. Было далёка папалудні, пятніца, канец траўня. Цяпло і сонечна. У такі час я не люблю, а нават і не магу ўседзець дома. Рашыла ўзяць кніжку і пачытаць у скверы ў цэнтры горада. Тлум шэрых мяхоў, што вярталіся з працы, перакідваўся з аднаго боку вуліцы на другі. Я назірала за гэтым гармідарам вялікага горада з дзіўным пачуццём іроніі і пагарды да працы, іхніх высільванняў, іх клопатаў і хваравітай грымасы незадаволенасці на тварах.

Нарастала адчуванне нейкай сумесі бунту і эратычнага хвалявання. Піва ў бляшанцы, якое я прынесла з сабою ў сумцы, пачало знікаць у прорве цела. Узбуджанасць расла далей, а з ёю і адлегласць да канкрэтыкі гэтага свету.

Як на доказ гэтага настрою - перад маімі вачыма на суседняй пад'езнай да праваслаўнага кафедральнага сабора вулачцы тры тоўстыя кабеты ў апельсінавага колеру камізэлях шчыруюць над цыраваннем выбоінаў у асфальце. Стаяць з шуфлямі за апушчаным бартом грузавіка, з якога сплывае асфальт. Кабеты раскідаюць аблепленымі шуфлямі чорныя кавалкі гарачай масы ў дзіркі. Побач абаперты аб ліхтарны слуп мужчына таксама ў камізэлі. Рукі глыбока ў кішэнях штаноў з разношанымі каленямі. Прыглядваецца да кабет, кідае ім нейкія заўвагі і час ад часу паказвае далоняй месца, куды трэба падсыпаць, дзе падраўняць, паправіць. Калі гара скінутага з грузавіка асфальту знікае ў дзірках дарогі, мужчына з-пад ліхтара ўскоквае ў кабіну катка, які стаіць побач. Над дашкам машыны пыхкае хмара дыму. Каток ушчыльнае стынучы асфальт. Кабеты перамяшчаюцца метраў на дваццаць далей, куды пад'язджае чаговы грузавік з чарговай порцыяй гарачай чорнай масы.

Нешта мяне ўнутрана раздражняла. Усе карціны са струджанымі і «вызваленымі» жанчынамі, якіх удосыць нагледзелася ў Менску, я датуль прымала абыякава. Жанчыны - вадзіцелькі трамваяў і тралейбусаў. Магутныя матроны на шпацыры з мужчынамі-карантышамі.

Мужчыны - гэта худыя зарослыя здыхлякі з перапалоханымі вачыма, якія вечарамі ў пасцелі гінуць у фалдах тлушчу сваіх заможных матронаў. Яны здатныя на ўсё. Размашыста тынкуюць фасад камяніцы на вачах у людзей, ускоквaюць на дах тралейбуса, каб сцягнуць вяроўкай пантограф і ступаюць у шкарпэтах па гарачым бляшаным даху. Раззяўленыя вусны пасажыраў уцягваюць рэшткі паветра ў перапоўненай нутробе машыны.

Бязвольна чакаюць, як статак транспартаванага быдла. Думаюць толькі, каб дабрацца дадому, пралезці сярод гораў друзу і пяску, знікнуць у лесвічнай клетцы і захлопнуць за сабою абабітыя дэрмацінам дзверы прасмердлага гнілою капустаю памяшкання.

Нянавісць да бязволля і безруху гэтага свету, прыдуманага мужчынамі, якія даўно павыміралі ад сіфілісу, спіліся альбо загінулі на вайне, нарастала ўва мне і вырывалася з-пад кантролю. Раптам так я ўбачыла, што астатні свет - гэта дзеці мужчынскага полу, выпаўзні з голенымі галовамі, альбо квадратныя, разапселыя чыноўнікі без душы, без вачэй, без мазгоў. Часцей прапітыя наскрозь, чым свядомыя свайго глыбокага заняпаду.

Піва зрабіла сваё, але на шчасце я не страціла да канца памяркоўнай стрыманасці ў ацэнцы беларускага свету. Нейкі скураны байкер з грукатам праляцеў па плошчы, як анёл - вястун надзеі. З гэтага мне хапіла аптымізму, каб устаць з лаўкі і пакінуць плошчу. Наважылася пайсці ўбок Траецкага прадмесця міма праваслаўнага сабора, уніз. Перайшла вуліцу. Па той бок псеўдастарамесця. Мёртвая частка горада, адкрытая ў сямідзесятыя гады і пазней, якою мелася адшкадаваць сабе атмасферу разбуранага Менска. Бульвар над каналам. Іду да помніка, прысвечанага загінутым салдатам афганскай кампаніі. На канале выспа - называюць яе выспай слёз, і там нядаўна збудавана капліца-звон з жанчынамі ў чорных жалобных хустках, якія лямантуюць вакол яе.

Пад'язджаюць кавалькады машын, шлюбныя карагоды. Малодухі ў начосах, цокаючы высокімі абцасамі, у белых вэлюмах і сукенках нясуць кветкі, каб пакласці іх пад помнікам-маўзалеем. Помнік гэты - балючы след савецкага сіндрому «адказнасці» за грамадскую справядлівасць у свеце. Але найбольш уражвае прывязанасць да традыцыі ўскладвання кветак да помнікаў. У нас у Польшчы гэтага няма. Ну, хіба што маладыя едуць на могліцы аддаць пашану нябожчыку бацьку ці маці. А тут у карагодзе вайсковых учтаў жанчына робіцца падданай рытуалу ваенных завядзёнак. Дакляруе свой удзел у чыста мужчынскім вайсковым жыцці, беручы за яго адказнасць і на сябе.

Узгадалася ашмянская гісторыя, расказаная мне кімсьці ў Менску. Тамтэйшы ксёндз угаворваў маладых, каб замест да помніка «адзінага сапраўднага абаронцы айчыны» ездзілі на цвінтар. Калі ўжо ім мусова недзе пакласці тыя кветкі. Бо гэта ж не каталіцкая традыцыя. Праз некалькі тыдняў яго выклікалі ў гарадскую ўстанову і параілі не соваць носа ў дзяржаўнае проса. Відаць, уладам забалела, што можна ставіць пытальнік пад шмат

якімі фігурацыямі іх ідэалагічнай рыторыкі. У доўгай размове з чыноўнікам ксёндз патлумачыў, што хрысціянін не можа аддаваць пашаны помнікам. А гэты помнік у цэнтры Ашмянаў не звязаны з ніякай смерцю, ці месцам пахавання. Праз некалькі тыдняў яго зноў выклікалі, і той самы прадстаўнік улады ветлівенька пытаецца ў яго, а што айцец пробашч сказаў бы, калі б яны перанеслі людскія шчэнты з вайсковых могілак пад помнік. Ксёндз адрэагаваў толькі шакіраванай мінай і пакінуў справу без адназначнага адказу.

Якое ж было ягонае здзіўленне, калі ў першых днях верасня неспадзявана атрымаў запрашэнне на пасвячэнне адноўленага помніка савецкаму салдату. Улады пастараліся звыш меры пра новы ідэалагічны падмурак. Выкапалі нейкія парэшткі з вайсковых магілаў на цвінтары, арганізавалі ўрачысты мітынг пад помнікам, на які сагналі ўсе навакольныя школы і некалькі таксама амаль ужо мёртвых прамысловых прадпрыемстваў. На ўрачыстасці сказалі некалькі важных патрыятычных прамоваў, а запрошаны праваслаўны «бацюшка» пакрапіў усё свянцонай вадой. Ксёндз не прыйшоў на ўрачыстасць, бо, як казаў пазней, не меў пэўнасці, чые парэшткі былі перанесены пад помнік, і ці напэўна тыя мёртвыя хацелі б адыгрываць ролю ідэалагічнага экспаната пад савецкім помнікам. А раптам гэта пахаваны партызаны-АКоўцы?

У Траецкім прадмесці я рашыла зайсці ў рэстаран, але ён быў зачынены на абед. Тады пайшла далей да цэнтра ўздоўж Нямігі да бліжэйшага бара, каб неяк знейтралізаваць сілу выпітага піва. Зайшла ў невялікую італьянскую кавяраньку «Grip». Заказала ў бары каву з экспрэса і тады пачула за плячыма выбух рогату.

Яна з Дзімам у куце залы. На крэсле побач гітара. Дзіма, жэстыкулюючы ў паветры далонямі, нешта ёй тлумачыць. Яна згледзела мяне, але не хочучы перапыняць Дзімаў расказ, махае мне рукамі, каб я падсела. Я падышла з філіжанкай. Павесіла сумачку на крэсла, пацалавалася з ёю, падала руку Дзіму. Холад. Чаму ўсё гэта мяне аж так мітрэнжыць? Ува мне зноў падымалася хваля той незразумелай мне самой злосці.

Дзіма тлумачыць ёй, на чым грунтуюцца фінансавыя піраміды, - як набіваюцца людзі ў бутэльку. Прапанаваў, каб мы пайшлі на сустрэчу з «Energy Club». Я ўся ў маўчанні сачу за яго паэтычнай лекцыяй па эканоміцы.

Я згадзілася пайсці з імі толькі з прычыны яе позірку, якім яна мяне адарыла ў гэты момант.

XXXI

Дзіма павёў нас з кавярні па лесвіцы ўгору ў будынак нейкага політэхнічнага інстытута. Савецкую цудоту аб'екта мела падкрэсліць велізарная зашклёная вітрына каля ўваходу з экспазіцыяй вялікіх павыгінаных і пажоўклых фотаздымкаў выдатных і галоўных інжынераў, якія, мусіць, да нядаўняга, расчэрчвалі на сваіх пульманах будучыя мадэлі рухавікоў для грузавых аўтамабіляў, трактараў, танкаў а можа, і касмічных караблёў. Частка гэтых інжынераў у памятых пінжаках да сёння цягаюцца з партфелямі на працу. Дастаюць, нябось, загорнуты ў газету сняданак і, сёрбаючы з кубка гарбату, азіраюць шэрыя сціжмы маладых людзей, што сноўдаюцца па будынку, шмат памяшканняў у якім здадзена ў арэнду фірмам, натарыятам, крамам і пад аптовыя склады.

Да залы, дзе збіраюцца сябры «Energy Club», трэба прайсці некалькі ярусаў, два доўгія цёмныя калідоры і кароткі адрэзак праз закратаваную мадэльную майстэрню. Сярод вялізных мадэляў рухавікоў і прыстасаванняў з невядомым прызначэннем стаяць арганізатары сустрэчы ў «Energy Club». Акідаюць нас вачыма. Дзіма пачынае нешта блытана тлумачыць, што ён ад Сашы і прывёў дзвюх новых кандыдатак. Элегантна апранутыя маладыя людзі з разуменнем ківаюць галовамі. Добра, што прывёў кандыдатак, але сам ён апрануты неадпаведна. Умовай уваходу на сустрэчу клуба ёсць чыстая белая кашуля, гальштук і пінжак. Дзіма са злаславіа тузае свой выцягнуты світар і малапераканаўча даводзіць ім, што вяртаецца з падарожжа, што забыўся, што доўга нас умаўляў. Глядзіць на мой збянтэжаны твар, і яго надзея, што мужчыны прапусцяць, памяншаецца. Падыходзіць да нас і просіць дужа не пераймацца, бо як ацэнена, мы апрануты дастаткова элегантна і можам увайсці, а ён тым часам пачакае ў калідоры на Сашу і, магчыма, неяк уплішчыцца пасля адкрыцця сустрэчы. У залу за майстэрняй заходзяць яшчэ астатнія прыпозненыя сябры клуба. Адзін мужчына забірае на сябе маю ўвагу сваёй штучна напятай паставай. Адразу кідаецца ў вочы, што ён небагаты, пінжак пазычыў у падначаленага калегі ці ў брата, а ад чуйнага вока прапускнікоў прыкрывае вялікай пластыкавай рэкламнай сумкай прыбруджаныя старыя адзідасы.

У зале пануе настрой шаноўнай паважнасці, як перад набажэнствам альбо арганным канцэртам. Сцэна без дэкарацыяў. Стол, некалькі крэслаў, на стале зялёнае сукно. Мужчына ў гранатавым гарнітуры расстаўляе мікрафоны і праекцыйны

апарат для прагляду. Пракідае некалькі слайдаў з нейкімі тэкстамі, табліцамі і схемамі.

На сцэну бадзёра ўскоквае юнак з галівудскай, прыклеенай да твару ўсмешкай. Высільваючыся на энтузіязм, прадстаўляе кіраўніцтва клубу, вітае новых сяброў і кандыдытаў.

Умова сяброўства ў клубе - унёсак у форме трохсот даляраў з абавязацельствам прыцягнення на сустрэчы новых сяброў. За год трэба прывесці пяць кандыдытаў. Чым больш прыдбаеш новых сяброў, тым вышэйшы будзе твой статус у клубе.

Чарговы энтузіяст уключае праектар і паказвае табліцу і схемы. Тлумачыць, як проста і можна барджэй дапяць да багацця.

Мы пераглядваемся, усё больш і больш расчараваныя прымітыўнасцю такога круцельства. Але калі публіка выбухнула воплескамі і крыкамі запалу, перапыняючы евангелічныя «сведчанні» ўжо маёмасных сяброў, не вытрымалі і ўсталі выйсці.

Аж - у дзвярах дарогу заступае рослы юнак. Не дазваляе і махае рукою ўбок сцэны аднаму з кіраўнікоў клуба. Той развязна падыходзіць і просіць на хвілінку ўбок. Выпытвае, хто мы такія будзем, што тут рабілі, як прайшлі і хто нас прывёў. Дзіма, які чакаў у другім канцы мадэльнай залы, убачыўшы нас, падбягае. Густа тлумачыць, што ён ад Сашы. Кіраўнік незадаволена ківае галавой і катэгарычна заяўляе, што, калі мы не ўваходзім, як сябры, у клуб, дык абавязаныя абсалютна маўчаць пра тое, што тут бачылі і чулі ў зале. Інакш бо можам мець клопаты. У доказ гэтага з-за парт'еры высоўваецца гладкі фэйс аднаго з ахоўнікаў і мерае нас халодным зіркам.

Дзіма перапрашаецца за ўсю гэтую замешку і, беручы нас за руку, цягне да выхаду. Кіраўнік яшчэ раз пытаецца, ці не журналісты мы, і, прыклаўшы палец да вуснаў, жагнае нас апошнім наказам.

Дзіма на вуліцы распытваецца пра ўражанні.

Яна кажа, што пасля ўсяго гэтага ёй проста рупіць пайсці ў касцёл і памаліцца. Ідзём утраіх да сабора. Сутуняецца. У катэдры хор рэпетыруе перад урачыстасцямі Божага Цела. Слухаем лацінскія песні. Адразу неяк сэрцу адлегла і палегчала.

Калі выходзім з катэдры, Дзіма дае мне знак, што цяпер хоча застацца з Ёю адзін, што сам правядзе яе дамоў і гэтак далей. Гляджу на яе і яе недарэчны выбар прыпячатваю сваёй кіслай мінай.

Дзіва бярэ, адкуль столькі сімпатыі да Дзімы, які ў мяне больш асацыіруецца з бычком-асемяняльнікам, чым з адухоўленым бардам, які трынькае на гітары расейскія ці нейкія

там беларускія рамансы.

Пакідаю іх адных, холадна паціснуўшы ёй руку на развітанне.

XXXII

Вяртаюся на Маркаву кватэру, абмінаючы мужчыну ў куфайцы пад лятарняй. Зноў нешта перабірае на блясе. Каменьчыкі з попелу, кавалкі вугалю. Падыходжу і спрабую разгаварыць яго. З хвіліну стаю, перш чым ён падымае галаву. Мармыча нешта неўразумелае, але я ўжо здомыслу ведаю, - сартуе, выбірае тое, што яшчэ можна спаліць у печы, адкідаючы непрыдатнае. У печах увесь вугаль не згарае, бо надта ж благая іх канструкцыя, якая не ўпускае ўсярэдзіну дастаткова паветра. А таму пасля спалу застаецца шмат чаго, што можна ўжыць другі раз. Тлумачыць мне гэта даволі складана, штохвіліны вырыгаючы з сябе кленічы ці лаянку.

Марка яшчэ няма дома. Я раблю сабе гарбату і, заглыбляючыся ў свае думкі, стараюся думаць затаіўшы дух. Камень на паліцы дадае мне бадзёрай надзеі. Кніга Грэткоўскай падабаецца ўсё менш і менш. Адкладваю яе і бяруся за «Алхіміка» Паола Коэла.

Прачынаюся сярод ночы. Прыехаў Марк. Кладзецца каля мяне і накрывае коўдрай. Ад яго пахне алкаголем і папяросамі. Я пагладжваю бараду добрага латыша, і мы засынаем у абдымках.

XXXIII

Раніцай Марк расказаў мне незвычайнае здарэнне. Ён вяртаўся на сваім аўто з Рыгі. Каля Менска яго спынілі дзве маладзенькія дзяўчынкі. Дзве вясковыя красуні, што выправіліся ў вялікі горад на рэгулярнае паляванне. Было відаць, што гэта ахвотніцы да нейкай прыгоды. Марк без лішніх залётаў пачаставаў іх кавай і булачкамі ў кавярні «Салодкі фальварак». Пасядзелі, пажартавалі і рашылі схадзіць на піва. Дзяўчаты не ўтойвалі, што ў сваёй вёсцы пад Менскам не так лёгка знайсці адпаведных кавалераў. Зусім іншае ў вялікім горадзе. Марка павяло на жарты, прапанаваў правесці вечар разам. Дзяўчаты нясмела папрасілі знайсці калегу, каб было да пары. Тут спрыт альбо эратычны інтэлект Марка падказаў яму фартэль. Пры іх ён патэлефанаваў са свайго мабільніка фіктыўнаму прыяцелю і дамовіўся з ім спаткацца ў гатэлі пад Менскам. А сам паехаў туды з дзяўчатамі і там доўгія хвіліны чакання ў знятым нумары разнастаіў сабе папіваннем віна, каналамі TV і лёгкай гутаркай з дзяўчатамі. Ён ведаў, што павалютку распаліць у іх апетыт на секс і спакойна раскручваў бяседу. Абедзьве дзяўчыны, ужо добра знецярлівелыя і разгарачаныя, пачалі настойліва распытвацца, калі ж урэшце прыедзе той калега. Хіхікаючы, яны перашэптваліся, час ад часу кідаючы ўбок Марка апетытныя позіркі, як недвухсэнсоўныя намёкі. Пад канец Марк прапанаваў пайсці выкупацца і тады разам утраіх далей чакацьмуць калегу. Праз паўгадзіны пярэшаптаў і хіхікання, што даляталі з ваннай, выйшла першая. Маладзюткая брунетачка з ладненькім худзенькім тварыкам. Белая, як сцяна. Авінутая толькі ручніком, прысела каля Марка на ложак. Прызналася, што якраз сёння яны рашылі справіць свае семнаццацігодзе. Адной будзе праз некалькі дзён, другая два месяцы таму пераступіла парог сталасці. Але ж гэта няважна, гэта толькі сімвалічныя даты. Абедзве ўжо здавён хочуць пазбыцца свайго дзявоцтва з якімі-небудзь прыстойнымі хлопцамі, але каб не з іхняй роднай вёскі. Марк, увесь у жары, пачаў далікатныя пяшчоты. Ён не верыў, што яны нечапанкі. Калі праз некалькі хвілін разагрэў яе пацалункамі, яго пальцы павандравалі па сцягенцах. Там паміж далікатных завіткаў дзявочых валасоў натрапіў на гарачую крыніцу вільготы. Апусціў пальцы паміж саромнымі губамі і з гінекалагічным досведам праверыў вузкі праход. Сапраўды, аўтэнтычна непачатка, уся ў дрыжыках і войках, са страхам, бяссіла чакае развіцця падзей. Далей метадычна пачаў даводзіць яе цела да поўнай кандыцыі,

каб пры як мага меншым болю ўвайсці ў яе і разарваць сваім чубчыкам прастору раскошы і асалоды.

Я гляджу на яго палымяныя вочы. Расказвае з такім захапленнем, што гэта як адкрыццё новай краіны, новага ландшафту, смакаванне экзатычных страваў і ўпіванне моцным напоем невядомага паходжання з невераемным пахам. Ён яшчэ так праняты тым здарэннем, што я бачу яго ўзведзены чэлес у штанах і расчырванелыя шчокі. Кажа, што падобнае трапілася яму другі раз у жыцці. Першы раз пераспаў са сваёй аднакласніцай у васемнаццаць гадоў. Але тое было, як бура, нават не спрамогся насыціць сваёй разняволенай фантазіі, як ужо і закончылі, бо дзяўчына моцна закрывавіла. А тут зусім спакойна, без драмаў. Аматарка прыгодаў - вось яна: ляжала пад ім і ўздыхала, даючы выйсце ўсім сваім дзявочым летуценням.

Змешаная са страхам асалода спрычыніла тое, што яна амаль не адчула хвілі прабівання праз дзявочую плеўку. Марк даволі спорненька закончыў, бо такі дарунак лёсу быў і для яго таксама раскошнай неспадзяванкай. За сцяной у ваннай другая дзяўчына чакала сваёй чаргі. Аказалася, што яны прынялі рашэнне па чарзе аддацца Марку, метадычна трацячы свой найкаштоўнейшы скарб. Марк, відаць, зрабіў на іх уражанне годнага мужчыны. Рашылі не чакаць прыяцеля. Калі першая сышла з ложка і на хвіліну знікла ў ваннай, паявілася другая таксама авінутая купальным ручніком. Яна была яшчэ больш напалоханая, чым яе сяброўка. Але таксама поўная рашучасці. Халодным, амаль дакладна разлічаным голасам сказала яму прыступаць да справы. Легла на спіну, скінуўшы з сябе ручнік. Марк, ашаломлены першым актам, яшчэ не прыйшоў да памяці. Як і ў першым выпадку праверыў, ці сапраўды дзяўчына яшчэ нечапанка. Так, была. Пачаў змушаць сябе на пяшчоты. Але нічога з таго не выходзіла. Той, як на злосць, занаравіўся і пастанавіў не паддавацца. Гульня задоўжылася, трывала ўжо пяць, дзесяць, пятнаццаць мінут. І ані. Тады ён папрасіў дзяўчыну, каб яна ўзяла ў руку яго мужчынскасць. Тая абурылася. О не! Каб, дык не! Марк быў на краі роспачы. Меў пад сабою другую па чарзе цэлку і не спрамогся адным банкетам справіць два вяселлі.

А тым часам дзяўчына ўся аж перавялася. І гэта толькі пагаршала справу. Нарэшце ён рашыўся адысціся на хвілінку, што давала яму магчымасць уцячы і выблытацца з гэтага недарэчнага становішча. Сказаў, што хоча яшчэ раз патэлефанаваць прыяцелю, каб той прыехаў. Дзяўчына ўстала з ложка і пабегла ў ванную. Марк, не доўга думаючы, паціхеньку сабраў манаткі і - шмуль з

хаткі, стараючыся ўцячы без лішняга шуму. Калі ехаў машынай, у ім мяшалася пачуццё палёгкі, віны, са смакам перажытай асалоды і плягі адначасова.

XXXIV

Пане Божа,
я нібы скравак паперкі
з Тваім запісаным жаданнем
шкуматанай ветрам і раптоўнымі павевамі
ад людзей што міма праходзяць
ад праезджых машын
маю цела
што ты даў мне ў дарунак
у дзень пачатку майго
і пэўнага болей нічога
за што я табе ўдзячная
бо тым самым ты звольніў мяне
ад жахлівага рашэння
якое іншыя на сябе прымаюць
Пане Божа
мая самотнасць
маё цела
мой страх
і ўсе тыя дробныя радасці
складаю Табе
удзячная за магутнасць прысутнасці
якую дакладна бачу
уначы
па-над галовамі

XXXV

Тыдзень таму назад я атрымала запрашэнне ў Віцебск прачытаць некалькі лекцый па польскай мове ў мясцовым універсітэце. Наша амбасада ўжо два гады як спрабуе наладзіць там рэгулярныя заняткі па польскай. Мяне як лектарку папрасілі высветліць атмасферу і цікавасць. Увогуле, як мне расказаў адзін супрацоўнік амбасады, яны тут разумеюць, як улады баяцца польскай мовы і як афіцыйна цяжка прабіцца праз гэты адміністрацыйна задэкрэтаваны страх. Прасцей з сербалогіяй і балгарыстыкай. Хай беларускія студэнты вучаць хоць турэцкую, хоць арабскую, але, барані божа, каб толькі не польскую! Тым не меней ёсць некалькі зацікаўленых асобаў у тамтэйшым універсітэце, нейкія рэшткі інтэлігенцыі, якая «мысліць свежа», якая цягнецца да Польшчы, бачачы ў гэтым натуральнае развіццё сваіх памкненняў. Я думаю, нашыя пяць мінут і так прыйдуць, калі пачнецца масавы адплыў ад расейскай культуры. Гэта толькі пытанне часу. Так вось мне і далі паўтара дзесятка заняткаў на працягу трох дзён. За гэта добра плацяць, за гатэль таксама. І думаць няма чаго - трэба ехаць. Тым болей, што мне даўно хацелася пабачыць горад Шагала.

Я запрасіла яе ў паездку гэтай марознай студзеньскай раніцай. Прыйшла загадзя да яе на кватэру, калі яна, ужо ўстаўшы, свяшчэнадзейнічала над запарваннем кавы. Водар асвяжыў нашу сустрэчу і без таго поўную напружання пасля яе нясконча нага рамана з Дзімам. Нешта мне здаецца, што паміж імі як бы штось прабегла, папсавалася, але я не назалялася, каб яна мне ўсё выкладвала. Я сказала ёй толькі пра прапанову з'ездзіць на некалькі дзён у Віцебск, на што яна жвава зрэагавала расказам з газеты на тэму маладзёжнага бунту ў тамтэйшай турме. Адразу згадзілася пад'ехаць разам. Ужо каторы тыдзень яна хацела напісаць доўгі артыкул пра бесперспектыўнасць, у якой жыве моладзь і пра нарастаючае адчуванне бунту, які можа лёгка перарадзіцца ў нешта больш сур'ёзнае. Цэлае пакаленне, якое ўжо не ведае савецкай сістэмы, старэйшымі сілком ўпіхваецца ў стаптаныя боты і абноскі камуністычнай ідэалогіі. Сказала, што нават калі і няма заказу на тэкст, дык і так яго апублікуе, а апроч таго вельмі хоча паехаць са мною ў Віцебск. Прапанавала, каб мы разам спалі ў гатэлі, што дадало б нашай паездцы яшчэ большага румянцу. Даўно мы не спалі разам, і я паглядала на яе з усё большым апетытам.

Развіталіся на тры гадзіны. Я паехала пакаваць свае рэчы,

залатвіць сякія-такія справы ў горадзе. На кухні пакінула Марку запіску, што некалькі дзён мяне не будзе, што цалую ў самы кончык яго цудоўнага красунчыка і тут жа нарысавала яго на паперцы. Вельмі востры.

І ўжо неўзабаве, паполудні мы сядзелі ў віцебскім аўтобусе. Адразу за Раўбічамі яна паказала мне краявід, якога такога я ў Беларусі яшчэ не бачыла і ўбачыць не разлічвала. Гэтыя мясціны называюць беларускай Швейцарыяй. Несустраканы яшчэ кантраст паміж плоскай і балоцістай панарамай, якую бачыш у дарозе да Берасця, альбо багністымі, лясістымі нетрамі каля Магілева і гэтым узгорыстым краявідам, падобным на Бяскіды ці Бяшчады. Адразу за Лагойскам мясцовасць выроўніваецца, а ўжо ў ваколіцах Лепеля - звыклы лясны ландшафт з невялікімі ўпадзінамі і пабітай асфальтавай дарогай, на якой аўтобус падскоквае, вытрасаючы з пасажыраў усякую ахвоту прыкархнуць.

Згадалася апавяданне Ўладзіміра Арлова, як ён падарожнічаў гэтай трасай і, праязджаючы кожнае мястэчка-прыпынак, успамінаў людзей, найчасцей дзяўчат, з якімі звёў яго лёс на розных прыпынках жыцця.

Дабіраемся да Віцебска. Сузіраем з-над Дзвіны шагалаўскія краявіды. Горад такі смутны і шэры. Яна расказвае мне пра фестывалі, якія летам на некалькі дзён у год ажыўляюць горад і яго наваколле. Прыязджаюць вялікія зоркі расейскай эстрады. Аднаго разу такі малады талент Васіль Баканаў - гэты Паваройцці Садружнасці Незалежных Дзяржаў (ім заўсёды мусова мець нейкі эрзац - у вытворчасці лядоўняў, самалётаў і зорак эстрады) прывітаў публіку воклічам, што, бачыце, шчаслівы, што сёння можа спяваць на Ўкраіне. Нічога сабе. Што значыць нейкаму артысту-маскалю прабздзецца ў Астрахань, Адэсу, Менск, Кіеў ці Віцебск. Раз плюнуць. А тутэйшыя людзі нават ніяк не зрэагавалі. Савецкае атупленне, залітае морам гарэлкі і нічым не абгрунтаванага кайфу.

Ідзём у гатэль. Шэры высокі будынак у цэнтры горада. Пануры і негасцінны. У холе сноўдаецца пільнае вока, якое адразу, як толькі мы ўвайшлі, падскоквае і пытаецца, чаго нам трэба. Паказваем на акенца адміністратара і падыходзім зарэзерваваць нумар. У адміністратарскай пуста. За перагародкай чуюцца, аднак, вясёлыя галасы. Мужчынскія і жаночыя. Нейкая ў іх там бяседа. Хвіліну чакаем, але ніхто не падыходзіць. Нарэшце яна не вытрымлівае і ідзе за перагародку. Я на паўкроку за ёю. З цікаўнасці. Сапраўды некалькі асобаў сядзяць за невялікім столікам. Падымаюць кілішкі з чарговым тостам. Убачыўшы нас, адміністратарка нервова падымаецца і незадаволена пытаецца,

чаго мы хочам. Чаго ж можна хацець у адміністратара гатэля паполудні? Гасцей відаць няшмат. Сонная атмасфера і мала жыцця. Я запаўняю складаны фармуляр, у якім апытваюць, бадай, ці не пра ўсё на свеце. Яна стаіць збоку і іранічнай усмешкай квітуе кожнае маё ўголас сказанае слова з картачкі. Што ўпісаць, а што не? Адміністратарка пасля пытання не вытрымлівае маёй упартасці і злосна адварочваецца. На хвіліну зноў знікае за перагародкай, дзе яе чакае новы тост. Я пакорліва запаўняю фармуляр, падрыхтоўваю грошы і не маю ніякай ахвоты да закалотаў. Чакаю хвіліну, адміністратарка выходзіць гуллівая пасля чаркі і забірае ў мяне дакументы. Яшчэ раз пытаецца, колькі ночаў я буду ў гатэлі, падлічвае суму, аддае картку і кажа заплаціць у суседнім касавым акенцы. Там касіркі таксама няма. Убачыўшы на маім твары пытанне, крычыць убок застолля за перагародкай. «Вольга! Прымі грошы!» Тоўстая і расчырванелая ад алкаголю Вольга ўточваецца на сваё службовае месца, і адразу яе радасны твар мяняе выраз. Яна робіцца засяроджанай, важнай і сюд-туд з падазрэннем зіркае ў мой бок. Лічыць грошы, выпісвае квіток. Вяртаюся з ім да адміністратаркі і, аддаўшы пашпарт, атрымліваю невялікі металічны ключ з вялікай алавянай ці, можа, сталёвай біруляй. Яго немагчыма насіць у кішэні.

Ідзём да ліфта, на якім залатымі літарамі ўвекавечаны прозвішчы найбольш знакамітых гасцей гатэля. Лукашэнка, Алексій II - патрыярх, Ала Пугачова, Міхаіл Гарбачоў, Піліп Кіркораў. Астатнія прозвішчы нічога мне не гавораць. Мабыць, маскоўскія ўладцы альбо эстрадныя артысты.

Парт'е ўважліва прыглядваецца да нас і інфармуе, што сяброўка можа тут быць толькі да вечара, у іншым разе павінна прапісацца. Я ківаю галавою, і мы ўваходзім у ліфт.

У пакоі звыклы савецкі смурод, прыліплы да ўсяго - ад мэблі да сцен, да пасцелі на шырокім ложку. Адчыняю акно і гляджу ўбок віцбескага амфітэатра. Марозна, змяркаецца. Рашаем пайсці прагуляцца. Хачу агледзець горад, акунуцца ў атмасферу Шагала, Малевіча, Кандзінскага. Ці засталося што-небудзь з гэтага?

Хуценька гатую каву, гэтак жа хуценька выпіваем, а яна мне крыху расказвае пра музей Шагала - маленькі дамок жыдоўскага купца ў прамысловым раёне, дзе зладзілі экспазіцыю, імітуючы аўтэнтычную ўнутраную планіроўку дома і лаўку канца дзвятнаццатага стагоддзя. Не ведаю, ці будзе яшчэ сёння адчынена, бо ўсе ўжо пачынаюць святкаваць стары Новы год, г.зн. «сільвестра», паводле грыгарыянскага календара. Сіла традыцыі і кансерватызм - уражлівы вынік у гэтай матэрыі.

Цэлы вечар шпацыруем па Віцебску. Вяртаючыся ў гатэль, перасякаем сквер у цэнтры горада. Ужо, бадай, некалькі градусаў

ніжэй нуля. Але прыемна і свежа. Вакол нас на лаўках, падмурках, камлях паваленых дрэў грамадзяцца купкі людзей. На сурвэтах, газетах, лістах парасклада на ежыва, а пасярэдзіне царуе - бутэлька гарэлкі. Народнае гулянне. Святкуюць з транзістарамі, салонымі гуркамі, у цяжкай для зразумення і вытлумачэння атмасферы весялосці. Расейскі поп, у сваёй бяздумнасці падобны да нашага дыска пола, разліваецца, перакідаючыся ад групкі да групкі. Бліжэй да вуліцы некаторыя ладзяць папойку вельмі своеасабліва і вынаходліва - на капоце ці на даху прыпаркаванай машыны. Усярэдзіне можна пагрэцца, а акумулятар сілкуе мініятурны тэлевізар.

Мы няспешна пасоўваемся ўздоўж гэтага тэатра жыцця. Людзі калышуцца то ў рытм музыкі, то ў такт абвяшчаных тостаў. Стары Новы год.

Бачым, як два п'яныя разахвочаныя юнакі забапалу лапаюць дзяўчыну. Дзяўчына ўжо залітая ў тры дупы і крочыць шырокім размашыстым вальсам. Можа, яе цягнуць у корчыкі, каб даць выйсце свайму юру.

Над амфітэатрам штораз выстрэльвае нейкая вайсковая марціра. Агонь перакідаецца то на адзін, то на другі бок і знясілена падае ў снег. Мы замерзлі. Час вяртацца ў гатэль. Але атмасфера толькі яшчэ раскручваецца. З падваротняў і завулкаў паяўляюцца падхмеленыя групкі хлопцаў. Большасць іх - гэта амаль налыса паголеныя васемнаццаці-дваццацігодкі. Бледныя ў тварах, але ад выпіўкі на пашчэнках і насах праступаюць чырвоныя плямы, якія яны расціраюць скарчанелымі далонямі. Плююць, смачна сморкаюцца ў заціснутыя на носе пальцы. Апранутыя ў цёмныя кароткія куртачкі, худыя, цыбатыя, як патыкі, ногі. Кіпіць у іх маладое жыццё, гэта, бадай што, адзіная крыніца энергіі. Лезе з іх гэта як прэсная, сялянская прага жыцця. Усё, што вакол іх, - убогае, нэндзнае, панурае і жалю вартае ў сваёй бяссэнсавасці.

Яна дзеліцца са мною набытым досведам, што большасць з гэтых хлопцаў - гэта альбо былыя выхаванцы папраўчай калоніі, альбо будучыя зэкі, якія яшчэ пагараць на чарговым крадзяжы, узброеным нападзе, альбо пазней, калі пойдуць на адсідку пасля некалькіх гадоў буянай і загульнай жытухі і службы ў якой-небудзь мясцовай мафіі. Гэта ў лепшым выпадку, бо то ж яшчэ кожнае мае шанцы рыгнуць душою ў перастрэлцы.

Пакуль што Віцебск яшчэ здаецца спакойным, сонным мястэчкам, умаляваным у зімовы пейзаж, і моладзь, якая швэндаецца па вуліцах, нягледзячы на нашыя страхотлівыя ўяўленні, - гэта толькі крыху няветлівыя хлопчыкі. А іх многа і шмат. Напэўна зашмат, каб на ўсіх хапіла месца ў папраўчых

калоніях і турмах.

Наскрозь прамерзлыя ўскокваем у наш гатэль. Направа ад галоўнага хола дзверы ў бар. Праз дым бачым буфет з напоямі. Толькі гэта можа нас цяпер ураторваць.

Некалькі столікаў, і дрымучая нуда. Купляем чырвонага віна - аж цэлую бутэльку, і просім буфетчыцу, каб падагрэла віно на куханьцы, што ў яе за плячыма. Тоўстая жанчына свеціцца шчырай залатой усмешкай. Знікае на кухні і праз хвіліну з подзіву вартым палітэсам прапануе нам, што ўкіне ў віно пару гваздзічкоў, а цукар вось ён перад намі. Гэта сапраўды выраз нязвыклай сімпатыі. Можа таму, што ўсе тут разумеюць, што ўжо раз гуляць дык гуляй, душа, - пекла ж няма! Некалькі дзяўчат са знуджанымі тварыкамі і задзёртымі спадніцамі прыглядваюцца да нашага свяшчэнадзейства. Праз хвіліну буфетчыца выносіць падагрэтае віно, наліваем у тоўстыя шклянкі, салодзім і азіраемся, выбіраючы зручнае месца, каб можна было азіраць усю залу і бачыць усіх, хто ўваходзіць. Прытыкаемся ў куточку тут жа каля дзяўчат. Тыя, зацягваючыся цыгарэтамі, недаверліва касавурацца на нас. Хлопцаў мала. Я спрабую ўсміхнуцца ім і загаварыць. Нічога не выходзіць. Праходзіць некалькі хвілін. Перакідаемся словамі, грэючы далоні шклянкамі цёплага віна. Яна залётна дакранаецца да мяне, я адразу адказваю, пагладжваючы нагой пад сталом яе змерзлую лытку. Віно пачынае разаграваць. Гамонім, усё больш засяроджваючыся на думках пра блізкую ноч. Да дзяўчат падыходзіць нейкі фраер у скуранцы. Адна з іх, худзенькая брунетка, падхопліваецца і ідзе за ім. Яна зграбная, прыгожа ходзіць, доўгія дагледжаныя валасы пакалыхваюцца на плячах. Мы абедзве сходу пазнаём, што дзяўчаты платныя. За столікам застаюцца яшчэ дзве. Віно дае нам у галаву, і мне раптам прыходзіць думка запрасіць каторую з іх у ложак на ноч. Прашу Яе, каб падышла і спыталася пра іх тутэйшыя стаўкі. Яна падымаецца з шклянкаю віна і смела падсаджваецца за суседні столік. Завязваецца дзіўная і вельмі складаная гутарка. Дзяўчаты не разумеюць, пра што тут заходзіцца. Я далучаюся да размовы. Так, адразу відаць, што зарабляюць акурат гэтым спосабам, а цана - па дамоўленасці. Залежна ад кліента. Часам, калі пад настрой, можна і проста так пайсці, як што мужык у спадобу дасца. Дзяўчаты ўсё яшчэ не ўрубаюцца. Мы па чарзе тлумачым, што хацелі б даведацца, якія тут у Віцебску стаўкі. Нам кажуць, што можа адваліцца і дваццаць баксаў, і пяцьдзсят, і сто. Гэта - як калі выпадзе. Ну добра, тады - за трыццаць. Што значыць за трыццаць? Ну, значыць, што мы маем ахвоту на адну з вас. Возьмем з сабою ў нумар. Дзяўчаты пруцянеюць. Як гэта, лесбіянствам займацца?! О не! Што не, дык

не. Яны ўстаюць і перасядаюць за два столікі далей, уцякаюць ад нас.

Глядзім адна на адну, скарыўшыся лёсу. Дапівам віно, але тонка сканструяваны гумор так і пырскае з нас. Якія дурныя няхлюі гэтыя зачуханкі.

Праз хвіліну ў бар зноў заходзіць той фраер у скуранцы. Дзяўчаты паказваюць на нас пальцам і кідаюць пагардлівыя зіркі. Хлопец ківае галавой і аблівае нас халодным, разлічаным вокам.

Мы ўстаём, дзякуем залатой буфетчыцы за хвіліну цяпла і радасці. Ідзём да ліфта. За намі выходзіць хлопец. Калі мы заходзім у ліфт, бачу, як ён гутарыць з парт'е, ківаючы на нас галавою.

Яна папярэджвае мяне, што перад намі яшчэ адна перашкода - дзяжурная на паверсе, у якое ёсць ключ да пакоя, і яна правярае, хто, калі і да каго прыйшоў у госці. Я супакойваю, што няма чаго пераймацца. Бо такі двух дзяўчат правяраць не будзе. Бяру ключ. Дзяжурная толькі прыглядваецца да нас, на хвіліну павярнуўшы галаву ад расшумелага чуллівымі бразільскімі прызнаннямі тэлевізара. Яшчэ не позна. Знікаем за дзвярыма выстуджанага нумара. Хуценька туалет і - у ложак. Засынаем у абдымках і ў пяшчотах, такіх патрэбных, каб сагрэцца і заснуць.

Ноччу - нейкі вэрхал на калідоры, расхваляваныя галасы. Два мужчынскія і дзяжурнай. Стукаюцца ў нашыя дзверы. Падыходжу і пытаюся, што там такое. Міліцыя. Правяраем, ці ўсе прапісаныя. Кашмар, а каторай гадзіне? Гляджу на гадзіннік - амаль другая ночы. Я нікуды не пайду, я польская грамадзянка, прапісалася, заплаціла і цяпер хачу спаць. Дзяжурная верашчыць, пытаецца, ці тая дзяўчына, што ўваходзіла са мною, яшчэ ў нумары, ці ўжо выйшла. Ясна, што даўно выйшла. Калі вы спалі ў крэсле перад тэлевізарам. Міліцыянт яшчэ раз спрабуе бразгатам клямкі змусіць мяне адчыніць, але я палохаю яго, што паведамлю ў консульства, што гэта хамства, парушэнне правоў чалавека і нештачкі там яшчэ. Вяртаюся да ложка ўся ў дрыжыках - не ведаю, ці ад страху і нерваў, ці ад халадэчы. Яна таксама ляжыць халодная, скурчыўшыся пад коўдрай. Тулюся да яе, моцна абняўшы, і так ляжым, чакаючы атакі і высаджвання дзвярэй. Але абышлося - галасы дзяжурнай і міліцыянтаў аддаляюцца і нікнуць углыбіні калідора. Доўга не можам заснуць і ляжым нерухома. Нарэшце засынаем, змучаныя начной калатнёй.

XXXVI

Ужо каторы дзень не магу знайсці яе. Тэлефон на кватэры маўчыць. Ці не здарылася чаго? Тэлефаную па знаёмых. Аня абяцае сяго-таго даведацца. Праз некалькі гадзін падымаю трубку. Ёсць. Знайшлася. Ляжыць у раддоме, пасля аборту. Была-такі цяжарная.

Еду да яе, узяўшы самыя патрэбныя рэчы і крыху прадуктаў. У менскіх бальніцах не раз'ясіся, і я не пэўная, ці адведае яе хто-небудзь. Бо ж яна-такі старалася ўтоіць гэта ад знаёмых.

Ужо вечар. Пануры вечар у поўнай болю, бяды і змрочнага святла неонавых лямпаў бальніцы. У доўгім калідоры шукаю палату, называю нянечцы імя і прозвішча пацыенткі. Яна праводзіць мяне да дзвярэй. Адчыняю і бачу яе недаўмёную ўсмешку. Сапраўдныя сябры пазнаюцца ў бядзе.

Яна хоча патлумачыць, што марна спрабавала ўтоіць ад мяне факт сваёй непажаданай цяжарнасці і рашэнне пра аборт. А я ж бы ёй нейкае рады дала. Не ведаю яшчэ чым, але, прынамсі, была б з ёю. Так проста, як сябар у бядзе, у добрым і благім.

Яна была на другім месяцы. Рашылася, бо не хацела дзіцяці. Яно ўзаконіла б страту яе свабоды на карысць нейкага расейскага валацугі. Яна ўжо раней парахавалася з ім, бо залішне моцна кпіў з яе і яе памкненняў. Дзіма. Гэты расееец упісаўся ў беларускі краявід. Як гісторыя акупанта, салдата, што прыйшоў пакарыць народ, развеяць яго туманныя летуценні пра свабоду і неакрэсленую тоесамасць. Прыйшоў, ды так і прысмактаўся.

Рашэнне яна прыняла сама, хутка і без лішніх сумненняў маральнай прыроды. Калісьці ў нас была дыскусія, і мы ледзь не пацапаліся. Я прыхільніца кантрацэпцыі, але жыццё дзіцяці, калі б яно паявілася ўва мне, лічыла б самым каштоўным. А ў ёй выбухнула нянавісць да такога ўпарадкаванага мыслення. Яна поўная супярэчлівасці. З аднаго боку сумуе па мяшчанскай Празе і спакоі пад бокам у багатага мужыка дзеля таго, каб тут жа паказаць усяму гэтаму язык і ўцячы. Як я люблю яе за гэтую непаслядоўнасць... Але што гэта за каталіцызм, дзе тут тая заходняя цывілізацыя?

Хапаю яе за руку. Бледная, потная, маленькая далонька. Адгортваю з твару валасы і далікатна цалую. Яна заплакала. Ад бяссілля, тугі і самотнасці. Не ведаю. Плач нарастае, ціхі, з усхліпамі. Цалую яе слёзы, што як гарох, коцяцца па шчоках, на хвілінку прылягаю да яе, дзелячы ўсю яе бязраднасць і пачуццё

бяссілай роспачы.

Крыху супакоіўшыся, яна пачала расказваць пра апошнюю ноч. Пра панурыя святільні і цені дрэў за акном. Раскалыханыя клёны як бы літасціва падтаквалі галечы такога існавання. Не спала цэлую ноч. Як згрызота сумлення адгукнуліся ўсе размовы з ксяндзом у катэдры. Яе каталіцкасць пацярпела катастрофу. І, можа, яна і не пераймалася б гэтым так моцна, калі б не факт, што калісьці ж яна сама зрабіла свой выбар.

XXXVII

Калі наступнага дня раніцай я прыйшла ў бальніцу, яна ўжо была ў лепшым настроі. Гуляла па калідоры, весела размаўляючы з нянечкай. Я прынесла добрай гарбаты, булачкі. У куце каля акна мы рашылі зладзіць сабе невялічкую кавяраньку. Саграваючы рукі гарачым кубкам з гарбатай, яна выпрастала пальцы і далікатна дакранулася да локця. Сядзелі мы адна каля адной. Яна расказала пра той драматычны для яе тыдзень, калі рашылася на аборт.

Дзіма ўсё часцей і часцей даваўся ёй у знакі, пазбягаючы спатканняў і апекі, якое, як ёй здавалася, ён павінен быў ёй даваць. Апрача таго такая няпэўная перспектыва. Што рабіць каля такога чалавеа? Слухаць балады і чакаць на кухні з абедам, калі вернецца дадому чортведама адкуль? Апрача таго - да якога дому? Яны ж абое без граша і без надзеі на якую-небудзь разумную перспектыву. Так што пакуль што можна неяк жыць, аднаму, без адказнасці за іншых. Сёння ёсць чым перакусіць, заўтра няма - гэта не мае значэння, бо ж не хлебам адным жыве чалавек. Даволі складана яна пачала расказваць гісторыі сваіх сябровак, якія мурзаюцца ў смуродзе кухонных клопатаў. Бліны, смажаныя на алеі, цыбуля і часнык. Усё гэта разам праз нейкі час стварае такія букеты, што ў аўтобусе ці ў метро на адлегласці пазнаеш па паху, чым занятыя мазгі такой дамы і як моцна спустошылася яе душа. Крыху зазнала ўжо ў сваім жыцці гэтага дабра. Годзе.

Некалькі дзён таму назад яна папрасіла Дзіму, каб з ёю пайшоў да бацькі на дзень народзінаў. Узялі бутэльку армянскага каньяку, яна купіла нейкую касметыку і паехалі на кватэру да бацькоў, дзе яна правяла колькінаццаць гадоў. Бацька прыняў іх ветла, цёпла, пацалаваў Дзіму, яе таксама сардэчна абняў. Пасля двух-трох кілішкаў развязаліся языкі. Бацька, якому стукнула шэсцьдзесят, пачаў успамінаць маладыя гады. І тут пайшлі праблемы. Выявілся, што нарадзіўся ён пад Беластокам, чаго Дзіму хапіла, каб пасля пятай чарчыны дацца ў іронію наконт псеўдапольскага радаводу. Яе гэта да таго раззлавала, што яна нагадала яму пра яго расейска-савецкае паходжанне. Усё, можа, закончылася б кароткай звягай. Але Дзіма зацяўся, палез на тычкі. Бацька, не заўважаючы напружання паміж імі, расхадзіўся яшчэ больш і пачаў успамінаць пра дзяцінства сярод лясоў і нетраў Калымы. Пейзажы, апісаныя Салжаніцыным. Дзіма, вельмі добра абазнаны ў гэтай літаратуры, ахвотна падбрэхваў бацьку, і абодва

амаль дзве гадзіны перасыпалі гутарку цытатамі з «Архіпелага Гулага». З жывой памяццю здарэнняў, асобаў і краявідаў. Чакай, чакай... падумала яна, ужо добра навастрыўшыся, - а як гэта бацька дзіцём быў пры ўсім гэтым. Як гэта не ведаеш, здзівіўся ён. Але ж ён ніколі не гаварыў ёй да канца, што дзед служыў у НКВД і пасля вайны, відаць, за неабыякія заслугі ў камісарскай працы ў заходняй Беларусі быў «узнагароджаны» паездкай з сям'ёю на Калыму ў патрульныя батальёны. Гэта былі некалькі страшных гадоў. Месяцамі бацька не бачыў сям'і. Жылі разам з іншымі дзецьмі ахоўнікаў ў дзіцячым доме. На Калыму ён наязджаў позняй вясною і сядзеў з бацькамі да верасня ў бараках, дзе сем'і астатніх ахоўнікаў таксама душыліся ў асобных пакойчыках з агульным доўгім калідорам. Тыя дні, праведзеныя з бацькамі, былі падшытыя страхам, суровасцю і непрыязнасцю ўсіх да ўсіх. Памятае бледныя і халодныя бацькавы далоні. Ужо хлапцом на свае вочы бачыў зэкаўскія бунты. Іх папярэджвалі, каб не адыходзіліся далёка, бо ў лесе ўцекачы хапаюць дзяцей на ежу падчас працяглых уцёкаў. Ніхто з іх не хацеў стацца мясам, ежаю вязням. А можа іх толькі так палохалі. На свае вочы бачыў трупы, якія валяліся па ваколіцах, іх страшэнна вырачаныя вочы, па якіх поўзалі вялікія зялёныя мухі.

Дзіма слухаў, рот раззявіўшы, яна са злосцю. У Дзіме нарастала пачуццё палёгкі, і яна гэта заўважыла. Ён мог нарэшце паглядзець спакойна і сказаць ёй - сама бачыш, усе былі замазаныя. Мае бацькі - гэта савецкія салдаты, расейскія акупанты, а Ты, куды якая мне патрыётка, паглядзі на гісторыю сваіх найбліжэйшых.

Яе шалёная ятра раптам як бы зацвярдзела. Яна глядзела на бацьку з усё большай нянавісцю. Чаму не разлічыліся з той мінуўшчынай, чаму не сказалі ёй, чаму маўчалі? Чаму ўсім гэтым быў замазаны яе дзед, які так пяшчотна гугулькаў з ёю ў дзяцінстве і чукаў на каленях? Яна памятае ягоныя вочы, якія ледзь не да самай яго смерці былі поўныя волі да жыцця, хоць спаралізаванае цела яго на ложку адмаўлялася слухацца і не выконвала ўжо многіх функцый. Палкія вочы замоўклага і знерухомелага ў пасцелі былога спраўнага ката. А можа, ён і не быў катам? Можа, толькі працаваў у нейкім тэхнічным аддзеле, выпісваў накладныя на машыны, рыхтаваў дакументы. Слабое суцяшэнне. Шалёная і са слязьмі на вачах выскачыла яна з памяшкання. Плакала па дарозе да аўтобуса і ў аўтобусе, у трамваі, у метро, а яшчэ больш на лесвіцы да сваёй кватэры, калі мерны стукат ботаў і водгалас гранітных прыступак давялі яе да поўнай знямогі.

У бальнічным калідоры п'ем гарбату. Яе вочы ў слязах. Цёплы дотык далоні. Не магу зразумець яе гневу на Дзіму і нянавісці да гэтага дзіцяці, якое магло нарадзіцца. Нешта ў гэтым цёмнае, змрочнае. Поўнае пытанняў і прыхаваных эмоцый. Насычэнне агрэсіяй і страхам. Страх. Адвага. Подласць. Вольная воля.

Сама не ведаю, як бы я зрабіла на яе месцы.

З Дзімам яна рассталася на другі дзень, бразнуўшы дзвярыма ў яго перад носам, калі ён хацеў увайсці да яе і спрабаваў зачапіцца размовай. Гэтая іранічная ўсмешачка ў куточках ягоных вуснаў. Ён усё высвятляў, быў як злы праваднік на доўгую дарогу ў няпэўную будучыню.

Вось табе й маеш той выбар. Цяпер альбо цэлы наступны раздзел жыцця расклеіць цябе і размажа. І больш не вылезеш з гаўна. Ляснула дзвярыма і не ўпусціла яго. Два дні не выходзіла з пакоя, не адказвала на званкі. На трэці дзень паехала да знаёмай у раддом, ды так у бальніцы і засталася.

XXXVIII

Ты - нібы свечка ў царкве
Са сваім узрушэннем
І вераю ў моц святла
Палаеш і жывеш гэтым полымем
Гэта сіла Твая
Таксама жыццедайная як і знішчальная
Смерць Гэтага святла - ілюзія
Бо варта вочы адвесці
і знойдзеш яго
у шмат якіх іншых месцах
Гэтаксама ілюзія вера Твая
што ў іншых месцах сярод іншых людзей

XXXIX

Прайшлі вакацыі. Я не бачыла яе цэлых тры месяцы. Прабыванне ў краіне і ўсё большая сувязь з Маркам адсунулі маё захапленне яе асобай. У ліпені я два месяцы была ў гарах. Лежачы на траве каля Мураванца, я пасылала ёй гарачыя сонечныя думкі. Я выграбала з сябе тугу па ёй цёплай усмешкай, парывістымі рухамі і голасам, які страсна даносіў мне самыя новыя перажыванні. І бадай што, многае з гэтага засталося, бо я так моцна хацела, каб ты была каля мяне. Але ж гэта трывала толькі імгненне, адзін з многіх промняў. І агарнула мяне думка, што такія пачуцці праходзяць, як дзіцячая хвароба. Хоць я і не ведаю, ці ўсё тое ўва мне ўжо астыла. Бо найважнейшае ў такім трыванні - гэта прысутнасць. А яна замоўкла. Замкнулася. Як бы хацела забяспечыць сабе вакацыі без маёй, магчыма, занадта назойлівай прысутнасці. Напісала ёй дзве паштоўкі і ліст. Нічога. Ціша. Я патэлефанавала толькі ў Менск, каб праверыць, ці нічога ёй не трэба. Сядзіць, чытае кніжкі, слухае музыку і амаль не паказваецца на белы свет.

У кастрычніку я толькі вярнулася, каб завяршыць у Менску свае справы, і з пачаткам лістапада мушу быць у Кракаве, дзе мяне чакае стаўка ў вучэбнай установе і праца ў адной рэдакцыі літаратурнага часопіса.

Калі я наведала яе - традыцыйна з бутэлькай чырвонага віна, - яна прыняла мяне сардэчна, але гутарка не клеілася. У яе былі білеты ў філармонію. Мы рашылі ісці пеша праз азалочаны восеньскі парк над каналам. Усю дарогу маўчалі. Яна час ад часу падбірала з-пад дрэваў лепшае лісце. Склала каляровы букет і дала мне яго паглядзець, сунуўшы ледзь не ў вочы, але ў самую сярэдзіну майго жыцця, маіх думак. Мы абняліся.

У зале філармоніі холад. Музыканты, сумныя і без энергіі, якая, увогуле, проста неабходная, каб пераканаўча расказаць нешта сваімі інструментамі. Усе, пэўна, толькі мараць пра нейкія кантракты і заробкі заграніцай. А тут толькі смутак і прыгнечанасць, падмацаваныя пасля вяртання з паспяховых гастроляў, дзесь далёка ў Амерыцы, Францыі ці Аўстрыі.

Ад усяго аркестра я адчула павеў жальбы па прадаваным таленце і жыцці ў танных канцэртах перад рэстараннымі гасцямі на багатых раўтах. Вакол у зале выцертыя і смярдзючыя абіўкі цвёрдых і нязручных фатэляў, тынк, які асыпаецца са сценаў і

столі. Восеньскі холад, які паралізуе волю. Аж дзіўна, як музыкантам не дранцвеюць пальцы.

Граюць канцэрт Рахманінава. Павольна, як бы сілай вібрацыі выконваемых рухаў аркестр раскручваецца. Уся зала ўпадае ў настальгічнае задуменне. Музыканты выцягваюць з сябе рэшту сілы, і пачынае рабіцца нешта незвычайнае. Як плач, як лямант і скарга. Яны дзеляцца расказам пра вялікія нязведаныя прасторы, пра збалелыя душы, скруху, палярушны смутак. Ілюстрацыя да «Нячысцікаў» Дастаеўскага - такія асацыяцыі выклікае гэта ўва мне, калі я гляджу на твары людзей вакол сябе.

У нейкі момант бачу, як па яе шчоках пабеглі слёзы. Бяру яе халодную руку. Яна праз сілу ўсміхаецца і апускае галаву. Калі канцэрт закончыўся, мы выходзім і бачу - не перастае плакаць. Я стаю поруч, але я не бязрадная. Разумею і адчуваю, як іграе ў ёй усё тое, што расказалі музыканты, якія іграліе аповесць больш пра свой уласны лёс, чым самую музыку Рахманінава.

Вяртаемся дамоў. Яна просіць, каб я зрабіла гарбату і, можа, што-небудзь перакусіць. Кручуся на кухні і чую, як стукае плыта. Паставіла гучна «Нактурн» Шапэна. Наш любімы.

П'ем гарбату, пад канапкі. Не ведаю, ці павінна я пра нешта пытацца. І тады яна сама пачынае расказваць, што выклёўваецца ёй кантракт у Празе. Ужо атрымала першае паведамленне і, магчыма, гэта будзе гадавое прабыванне і праца на радыё «Свабода». Калі добра павядзецца, яна паедзе ўжо на тым тыдні.

XL

Гэтую мясціну называюць урочышчам. Курапаты. Мабыць, назва нейкай вёскі. Невялікі лес каля абвадной дарогі. Адразу за дарогай панельныя камяніцы. Немы і да ўсяго абыякавы бетонны квартал.

Аня патэлефанавала ўчора і сказала, што ідзе на маніфестацыю. Шэсце з цэнтра горада ў Курапаты, у Дзень задушных. Мой перадапошні дзень у Беларусі. Можа, ён будзе найлепшым развітаннем з гэтым краем, яго людзьмі. Тымі, што жывуць і што памерлі.

Курапаты адкрыў Пазьняк у канцы сямідзесятых, і для многіх беларусаў гэта знак адраджэння. З магілаў, дзе бальшавікі замардавалі ў трыццатыя гады тысячы людзей, беларусы, узяліся адраджаць сваю самасць.

Мінула два дзесяткі гадоў, і вось пашыраюць дарогу. Гэта, бадай што, толькі зачэпка, каб паспяхова заасфальтаваць памяць. Людзі пратэстуюць, але іх няшмат. Улады ведаюць пра гэта і тым смялей спрабуюць ужо цяпер запабегчы будучым дыскусіям і расплатным разборкам.

Я іду на шэсце, каб паглядзець, ці ёсць яшчэ гарт, каб супрацівіцца караедам і збэшчанай імі памяці пакаленняў. А можа, іду толькі таму, што Аня патэлефанавала мне і я не магла ёй адмовіць.

Паход на Курапаты пачынаецца ад Акадэміі Навук. Надвор'е лістападаўскае. Слотнае і шэрае. Толькі цяпер я ўсведамляю, што ў Менску цэлы год сапраўды мала сонца. Большасць месяцаў у годзе - пахмурныя і шэрыя дні. Найгоршыя смуткі агортваюць тут чалавека ўвосень. Балоцістая краіна, поўная дэпрэсіі і алавянай аўры.

Нехта дае мне палаючы зніч. Іду з ім, саграваючыся задушным святлом. Штохвіліны паветра разрывае гук звона, які нясуць наперадзе калоны. Memento mori.

Шэсце ў маўчанні даходзіць да дарогі на Віцебск. Паварочваем на абвадную дарогу, за якою відаць навалы згорнутай бульдозерамі зямлі. Рабочыя, што круцяцца вакол машын, абыякава пазіраюць на нас. Шэсце закончыцца, аціхне звон, і рабочыя напэўна ж прыступяць да пашырэння дарогі. Заасфальтуюць лес крыжоў, які вырас тут за апошнія тыдні на знак пратэсту. Усё як панарама смутку і непапраўнасці. Праз хвіліну мільгае думка, як ратунак, як апошняя дошка ратунку. Я ж

адгэтуль паслязаўтра выеду і страсу з сябе гэты самнамбулічны бяскрай. Але гэта зноў жа толькі абвадная думка, як пакуса. Бо такіх сітуацый і людзей не бракуе і ў нас.

Мае боты члапаюць, гразь, балота... У раскапанай зямлі пад нагамі касцей, аднак, не відаць, не відаць у ёй і мартыралагічных плямаў. Звычайная зямля. Шэрая, брудна-рудая, не выклікае эмоцыяў. Выклікае адзіна жаданне выйсці на які-небудзь ходнік і ступаць па чыстым, вымытым тратуары.

Падыходзім да лесу. Ускрай яго група маладых людзей паставіла палатку. У брудным лагеры відаць параскіданыя бутэлькі. Як праваслаўны звычай выпівання за памерлых на іх магілах. Няўжо і ў такім месцы гэта ўсё яшчэ звычай.

Узгадваецца адзін выпадак з пахаваннем паўгода таму назад. Быў канец лютага альбо пачатак сакавіка. Памерла Аніна бабуля, і я пайшла з ёю на пахаванне. Бадай што нават не толькі з прычыны спачування сімпатычнай каляжанцы і яе бацькам, але, мусіць, таксама і з цікавасці, як выглядае тут пахаванне. Гэта ж частка культуры штодзённага жыцця, гэта люстра ўсіх іншых абрадаў, свецкіх і рэлігійных - гэтых сямейных, гэтых грамадскіх. Я купіла прыстойны букет яркіх хрызантэмаў з чорнай стужкай і ў цэлафане з густоўнай чорнай аблямоўкай. Пад'ехала на таксі да дома, куды часта забягала адведаць Аню. У адным пакоіку іх цеснай кватэры жыла яе бабця, якая ўжо амаль не падымалася з ложка. Было ёй за восемдзесят. Аднаго разу я кінула вокам у прачыненыя дзверы ў той пакоік і ўбачыла, як старэнькая падымалася з пасцелі і сядала на край ложка. Яе позірк на хвіліну затрымаўся на мне. У яе запалых вачах я ўбачыла, як яшчэ тлеюць іскрынкі жыцця. Так, як бы я ўбачыла ўсе моманты, якія давялося ёй правесці на зямлі - дзяцінства над нейкай ракою, смех у лесе, пацалунак хлопца, потым нейкі агонь, дым, багнішча і панурыя нетрышчы, крык, плач, шэрая будная праца і апушчаныя ў мыльны шум далоні, што палошчуць ці мыюць нейкае ашмоцце. Як фільм, секундная імпрэсія без канкрэтнага сцэнару. Нават не вобразы, а толькі ўражанні ад вобразаў. Я была вельмі ўзрушаная ўбачаным у тую хвіліну. Дзверы зачыніліся, і Аніна маці зноў укладвала старэнькую ў пасцель, папраўляючы ёй падушкі.

Аня сказала, што бабуля калісьці была даволі важным чалавекам у партыі. Шмат гадоў працавала ў кантрольнай камісіі і ведала цэлыя пакаленні розных дзеячаў. Нават Машэрава ведала асабіста.

Цяпер я стаю каля дома з букетам хрызантэмаў, назіраючы праз зашклёную лесвічную клетку, як зносяць адчыненую труну з целам з чацвертага паверха. Перад дзвярыма некалькі старых -

мусіць, суседкі, сямейнікі. Труна выйшла з цесных дзвярэй на паветра. Труну ставяць на лавачку, каб крыху адпачыць. Аніна бабуля на гэтай лавачцы, пэўна, калісьці сядзела вечарамі, гаманіла з суседкамі.

Труна абабіта чырвоным палатном. Гэта так для камуністаў? Насільшчыкі зачыняюць века. Перад гэтым яшчэ адна суседка папраўляе край матэрыі і накрывае ёю складзеныя далоні нябожчыцы. Труну падымаюць з лавачкі і ўсоўваюць на падлогу жалобнага аўтобуса, выгляд і тэхнічны стан якога выклікаў яшчэ большую жаласць, чым само пахаванне. Мы з Аняй упакаваліся ў машыну аднаго з кузінаў і паехалі за аўтобусам да могілак.

Могілкі непадалёк ад Курапатаў. Вялікі абшар высечанага лесу, у цэнтры сучасны будынак з чырвонай цэглы - крэматорый, а можа, трупарня.

Аўтобус спрытна ўязджае прысадамі цвінтара і кіруе ўбок свежа выкапаных магілаў. Спыняемся, выходзім з машыны. Кідаецца ў вочы адсутнасць цырымоніі, правілаў, нейкіх звычаяў. Мабыць, немагчыма да гэтага прывыкнуць. Замест крыжа нехта з сямейных трымае слупок, авінуты бардовай матэрыяй. На слупку невялікая чорная таблічка з нядбала напісанымі словамі і прозвішчам памерлай, ніжэй даты нараджэння і смерці. Насільшчыкі выцягваюць труну з аўтобуса і пераносяць бліжэй да выкапанай магілы. Каля магілы стаіць, абапершыся на рыдлёўку, мужчына ў куфайцы, у барэце, з папяросаю ў зубах. Выплюнуўшы недапалак, ён выдае рашучую каманду сваякам, каб развіталіся з нябожчыцай. Насільшчыкі падымаюць века з труны. Да нябожчыцы падыходзяць сямейнікі і цалуюць цела. У лоб, у вусны, у складзеныя далоні. Нехта з фотаапаратам кажа ім стаць групкаю каля труны, у якой пацямнелы твар пазіруе для апошняга фотаздымка. Магільшчык з лапатай нервова пакручваецца збоку. Холадна і папырсквае лёгкі дождж. Пара канчаць. Чырвонае века труны замыкаецца як футарал з інструментам. Падыходзяць далакопы, каб падхапіць труну на доўгія грубыя шлейкі і ўціснуць яе ў дапасаваны дол. Спешна ссыпаюць рыдлёўкамі жоўты лясны пясок. Сямейныя нясмела падыходзяць і, прапіхваючыся між струджаных копшаў, скідаюць на труну па некалькі жменяў змерзлай зямлі. Але ўжо не чуваць такога характэрнага стуку грудак па труне. Копшы спорна ўвіхаюцца, штохвілі паплёўваючы ўбок. Іхні хто там у іх за галоўнага пачынае фармаваць магілу. Прыпляскваe пясок. Расхіліўшы полы куфайкі, падцягвае штаны, падымае руку і папраўляе на галаве барэт. Камандуе класці вянкі і кветкі. Спачатку сямейнікі, потым знаёмыя. Пасля кажа, каб нехта са знаёмых расправіў стужкі. Нельга - асцерагае -

папраўляць стужкі членам сям'і. Бязладны збой жалобнікаў раптам ператвараецца ў маіх вачах у рассыпаны пададдзел разгубленых і нехлямяжых жаўнераў, якія, азіраючыся па баках, намышляюць, як бы гэта тут неўпрыкмет дэзерціраваць. Адзін далакоп выхоплівае з рук кагосьці з родных слупок і ўбівае яго ва ўзгалоўе магілы. Той, што за галоўнага, дае далейшыя распарады. Цяпер кветкі могуць класці знаёмыя. Гляжу вакол сябе і ўжо ці не астатняя засталася я, хто яшчэ трымае букет хрызантэмаў. Падыходжу і акуратна ўкладваю кветкі ўнізе магілы. Падыходзіць магільшчык, спрытным рухам хапае мой букет, зрывае з яго цэлафан і вышморгвае стужку. Што ты робіш, крычу я на яго і забіраю букет. Ён вырывае ў мяне кветкі з рук, здзіўлены маёй істэрычнай рэакцыяй. Так трэба. Зноў зрывае фольгу і стужку, спраўным рухам вялізнымі лапамі бярэ ўвесь букет, ламае яго напалам і ўжо толькі ў такім выглядзе кладзе на магілу. Я з жалем і роспаччу гляджу на Аню. Аня паглядае на мяне, як бы перапрашаючыся. Падыходзіць і тлумачыць, што ўсё гэта толькі дзеля таго, каб ніхто не ўкраў тых кветак. Ува мне закіпае злосць. Адыходжу ад магілы тым ахвотней, што пачынаецца дождж. Адчуваю на твары рэзкія буйныя кроплі. Кіруюся да машыны. Гляджу на суседнюю дарожку, дзе адбываецца такая самая дзікая цырымонія - без ксяндза, без папа, без літургіі. З нейкім люмпэнам у куфайцы, з рыдлёўкай падпахай, які вырывае ў родзічаў памерлага труну, каб як найхучэй закапаць яе.

Цяпер я стаю на апошнім астраўку асфальту ў Курапатах і паглядаю на невялікую групу дэманстрантаў, якія разыходзяцца па кустах, убіваючы ў зямлю паміж дрэвамі прынесеныя крыжы. Лес крыжоў у натуральным лесе. Параскіданыя знакі прысутнасці памерлых. Як бы я была на прадстаўленні дзядоў.

Далей па другі бок дарогі, група міліцыянтаў глядзіць на ўдзельнікаў дэманстрацыі і адну за адной кураць цыгарэты. Яшчэ далей група рабочых каля бульдозераў. Праз дзень-два яны ўедуць сюды і засыплюць зямлёю тое, што павінна быць засыпана. Асфальтаваная дарога павінна быць шырэйшая і выгоднейшая.

Эпілог

Дарагая мая,

прабач, што так доўга не пісала. Прыехаўшы ў Прагу, я першыя тыдні старалася забыцца на ўсе пільныя справы - усе прыемныя і непыемныя, якія засталіся ў Менску. Працую на радыё «Свабода», у беларускай секцыі. Гэта была мая мара, памятаеш... Сама не ведаю, як гэта мне ўдалося, але, відаць, яшчэ маю ў жыцці трохі талані. Зарабляю неблагія грошы і, калі можаш, дык уключы пры нагодзе радыё на нашай частаце, тады пачуеш і мой голас.

Недалёка Кракаў ад Прагі. Можа, пад'ехала б калі. Сумую, хоць была б няшчырая, калі б не сказала, што патроху ў мяне ўсё неяк утрасаецца. Нарэшце! Пазнаёмілася з цудоўным хлопцам. Ён з Горадні, завуць яго Аляксандар. Відаць, мы абое былі створаны адно для аднаго. Я закахалася ў яго і думаю, што як мы спаткаемся, дык я раскажу Табе, які гэта фантастычны чалавек. Ты абавязкова павінна пазнаёміцца з ім. Праз паўгода і ў яго і ў мяне заканчваецца кантракт, і мы рашылі, што вернемся ў Беларусь, купім кватэру і будзем неяк мардавацца далей з гэтай рэчаіснасцю. Там не так, як у Польшчы ці Чэхіі, але Аляксандар умее пераконваць, ды і сама я даспела да таго, што толькі ў сябе ў Менску я магу быць сабою.

Ведаеш, я ўспамінаю адзін спектакль у менскім купалаўскім тэатры. П'еса ізраільскага драматурга Альмагора. Памятаеш, мы былі на ім летась вясною з прычыны нейкага дня жыдоўскай культуры. Была там такая гісторыйка, як адзін бедны жыд з Магілева, пекар, не меў чаго есці і чым карміць сям'ю. У сне да яго некалькі разоў прыходзіў старац і падказваў, што той павінен выехаць у Прагу, дзе пад Карлавым мастом ёсць у склепе скарб. Паехаў туды той жыд і быў схоплены ахоўнікамі каля Градчанаў. Быў дапытаны ў падвалах гарадской вязьніцы. А адзін ахоўнік як пачуў, адкуль той жыд, расказаў яму свой сон. А прысніўся яму старац, які падказаў, што ў Магілеве, у доме аднаго беднага жыда, пекара, ёсць печ, а пад прыпечкам склад і багацце. Жыд як пачуў тое, зразумеў, чаго прыехаў у Прагу, і вярнуўся дамоў у Магілеў.

Не ведаю, чаго я вярнуся ў Менск. Няма яшчэ ў мяне планаў, але Саша хоча і адчувае, што так будзе лепш. Я хачу быць з ім.

Сумую па Табе і па нашых спатканнях, па Тваіх расказах пра Польшчу і Кракаў. Запрасі ж мяне нарэшце!

Цалую моцна, моцна.
Твая Беларуска.